


Кс. Ян Гурскі

СУСТРЭЧА З РЭЛІГІЯМІ

Ксёндз Ян Гурскі


СУСТРЭЧА З РЭЛІГІЯМІ



Ксёндз прэлат доктар Ян Гурскі — святар Катавіцкай архідыяцэзіі, прафесар Сілезскага універсітэта ў Катавіцах, загадчык кафедры місіялогіі і тэалогіі рэлігіі, кансультар Кангрэгацыі евангелізацыі народаў у Рыме і Місійнай камісіі епіскапата Польшчы, член International Association for Mission Studies (IAMS) і International Association of Catholic Missiologists (IACM), прэзідэнт Таварыства польскіх місіёлагаў, галоўны рэдактар «Місіялагічных даследаванняў», аўтар шматлікіх публікацый у галіне місіялогіі і лекцый, прачытаных ва універсітэтах Германіі, Літвы, Беларусі, Казахстана, Балівіі.

Ксёндз Ян Гурскі

СУСТРЭЧА З РЭЛІГІЯМІ



Мінск
Выдавецтва «ПРО ХРЫСТО»
2009

УДК 2 (100)
ББК 86.3 (0)
Г 95

Пераклад з польскай *К. Лялько*
паводле выдання:

ks. Jan Górski
SPOTKANIE Z RELIGIAMI
Wydawnictwo «Księgarnia św. Jacka», Katowice, 2007.

NIHIL OBSTAT
Цэнзар кс. д-р Ян Крэміс
Мінск, 13 лістапада 2008 г.

IMPRIMATUR
Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі
Мінск, № 428/к/08 ад 13 лістапада 2008 г.

На вокладцы афорт «Сейбіт» *Ул. Вішнеўскага*

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі *кс. Яна Гурскага,*
а таксама з інтэрнэт-сайтаў:
www.schoyencollection.com/religions.htm;
www.wikipedia.org

© Wydawnictwo «Księgarnia św. Jacka», Katowice, 2007
© Лялько К., пераклад на беларускую мову, 2009
© Афармленне. УП «Выдавецтва „ПРО ХРЫСТО“», 2009

ISBN 978-985-6825-20-3

Каб весці дыялог

Паважаныя чытачы!

Вы трымаеце ў руках кнігу, у якой распавядаецца пра розныя рэлігіі свету з гістарычнага і душпастырскага пункту гледжання, а таксама ў рэчышчы рэальнай сустрэчы з імі.

Яшчэ нядаўна можна было пачуць, што хрысціянам не патрэбныя іншыя рэлігіі, бо яны вераць, што ў Езусе Хрысце Бог аб'явіўся ва ўсёй паўнаце і канчаткова і што Ён адзіны Збаўца. Аднак гэта не што іншае, як вельмі вузкае разуменне аксіёмы *extra Ecclesiasm nulla salus* — «паза Касцёлам няма збаўлення». Прынцыповая змена такога мыслення адбылася на Другім Ватыканскім Саборы. У Дэкларацыі пра нехрысціянскія рэлігіі *Nostra aetate* Айцы Сабору гавораць пра пазітыўныя асновы іншых рэлігій, што таксама маюць збаўчую вартасць для іх вызнаўцаў, дыялог з якімі можа ўзбагаціць нас.

Абвяшчэнне Евангелля і дыялог рэлігій з'яўляюцца неабходнымі элементамі і формамі евангелізацыйнай місіі Касцёла, таму Касцёлу патрэбныя іншыя рэлігіі. Праз дыялог з вызнаўцамі іншых рэлігій мы можам лепш пазнаваць таямніцу дзеяння Бога ў свеце,

можам лепш зразумець, што спецыфіку хрысціянскай веры ўвасабляе праўда пра Езуса Хрыста як Уцелаўлёнага Бога і адзінага Збаўцу свету. Дыялог розных рэлігій абуджае працэс самаачышчэння Касцёла ад таго, што ў ім пярэчыла духу Евангелля і вяло да канфліктаў. Нарэшце, праз дыялог усе вернікі могуць браць удзел у перамене нашага свету паводле Божага плану.

Сучасны чалавек жыве ў свеце, падпарадкаваным працэсам глабалізацыі. Нягледзячы на немалыя цяжкасці, еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы няўхільна развіваюцца далей. Паўсюль відочныя працэсы міграцыі насельніцтва па зямлі. На нашых вачах заўважна змяняецца нацыянальна-канфесійнае аблічча свету, і асабліва Еўропы, дзе побач жывуць людзі розных нацыянальнасцяў, культураў і веравызнанняў.

Гэта новыя выклікі нашага часу, на якія трэба адказваць, але для таго, каб адказваць на іх, неабходна вучыцца новай культуры жыцця з новымі суседзямі, якія прыбылі з іншых краінаў і кантынентаў, належаць да іншых культураў і рэлігій. Яшчэ Папа Павел VI у энцыкліцы пра Касцёл *Ecclesiam Suam* заклікаў да дыялогу са светам, называючы яго дыялогам збаўлення.

Каб весці такі дыялог, найперш трэба любіць кожнага чалавека такою любоўю, да якой заклікае нас Хрыстус, і праз прызму Ягонага навучання выпрацоўваць у сабе новы хрысціянскі погляд на чалавека іншай культуры ці рэлігіі, каб бачыць у ім свайго брата ці сястру. Трэба разумець тых, з кім мы хочам весці дыялог, разумець іх менталітэт, культуру і веру. У нашым выпадку

гаворка ідзе пра дыялог паміж хрысціянамі і прадстаўнікамі іншых рэлігій, і для таго, каб ён быў плённы, неабходна вывучаць у святле хрысціянства іншыя рэлігіі.

У гэтым сэнсе кніга вядомага тэолага, знаўцы ў галіне міжрэлігійнага дыялогу і місіялогіі ксяндза прафесара Яна Гурскага з'яўляецца унікальнай, таму што ў ёй пададзена і сучасная дактрына Каталіцкага Касцёла адносна іншых рэлігій, і асновы іх вучэнняў. Такім чынам, гэтая кніга выдатна кампенсуе недахоп беларускамоўнай літаратуры пра нехрысціянскія рэлігіі і прапануе сустрэчу з імі.

Кніга будзе вельмі карыснай усім, хто цікавіцца нехрысціянскімі рэлігіямі, а таксама стане добрым дапаможнікам у міжрэлігійных адносінах і наладжванні дыялогу паміж прадстаўнікамі розных рэлігій.

Дзякую ксяндзу прафесару Яну Гурскаму, выдавецтву «Pro Christo» і ўсім, хто прычыніўся да выдання гэтай кнігі на беларускай мове. Іх і яе чытачоў ад усяго сэрца благаслаўляю.

+ Tadeusz Kondrusiewicz

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі

Мінск, 28 кастрычніка 2008 года.
У свята апосталаў Сымона і Юды Тадэвуша
і ў 43-ю гадавіну прыняцця Дэкларацыі Другога
Ватыканскага Сабору пра адносіны Касцёла
да нехрысціянскіх рэлігій *Nostra aetate*

Ад аўтара

Пытанні рэлігіі выклікаюць вялікую зацікаўленасць, асабліва ў моладзі. Шмат хто хоча даведацца, якімі прынцыпамі кіруюцца іншыя людзі. Ёсць шмат публікацый на тэму рэлігіі. Я сам падрыхтаваў адну невялікую кнігу пад назваю «Рэлігіі» (Кракаў, 1997). Яна выклікала зацікаўленасць чытачоў, асабліва студэнтаў. Мяне часта прасілі яе перавыдаць, таму ўзнікла задума яшчэ раз наблізіцца да гэтай важнай тэмы.

Мая чарговая публікацыя можа быць дапаможнікам у далейшых даследаваннях. Яна ўзнікла галоўным чынам на аснове лекцый і практычных заняткаў па рэлігіялогіі, якія я вяду з 1989 года ў Катавіцах, найперш у Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Сілезіі, а таксама ў філіяле Люблінскага каталіцкага універсітэта, а цяпер і на тэалагічным факультэце Сілезскага універсітэта. Таксама мае значэнне мой асабісты досвед, набыты ў сферы міжрэлігійнага дыялогу, і магчымасць непасрэднага кантакту з вызнаўцамі розных рэлігій у свеце.

З іншымі рэлігіямі, што праўда, можна сустрэцца ўжо не толькі ў часе замежных вандровак. Вызнаўцы гэтых рэлігій усё часцей сустракаюцца таксама ў нашай

краіне як імігранты. Яшчэ больш важнаю прычынаю зацікаўленасці гэтаю тэматыкаю з'яўляецца дыялог, які вёў і вядзе Касцёл, асабліва Папы: Ян Павел II і Бэнэдыкт XVI. Мне хацелася б, каб гэтая кніга служыла не толькі студэнтам, але і ўсім тым, хто хоча пазнаёміцца з іншымі рэлігіямі і з прынцыпамі, якімі кіруецца большая частка чалавецтва; хто хоча свядома ўдзельнічаць у карпатлівым і разам з тым неабходным працэсе дыялогу. Няхай уводзінамі да гэтай працы паслужаць словы св. Аўгустына: «Найперш заахвочваем вас, браты, да любові не толькі адных да другіх, але таксама да тых, хто застаецца не з намі, ці то да паганаў, якія не прызнаюць яшчэ Хрыста, ці то да адлучаных ад нас <...>. Хочуць яны таго, ці не, яны з'яўляюцца нашымі братамі»*.

Катавіцы, 2 лютага 2007 года.
У свята Ахвяравання Пана

* Пар. *Komentarz do Psalmów. Liturgia godzin*, t. III, s. 380 – 381.

Выкарыстаныя скарачэнні

ККК — Катэхізіс Каталіцкага Касцёла

AA — II Ватыканскі Сабор, Дэкрэт пра апостальства свецкіх *Apostolicam actuositatem* (1965 г.)

AG — II Ватыканскі Сабор, Дэкрэт пра місійную дзейнасць Касцёла *Ad gentes* (1965 г.)

DH — II Ватыканскі Сабор, Дэкларацыя пра рэлігійную свабоду *Dignitatis humanae* (1965 г.)

DI — Дэкларацыя Кангрэгацыі веравучэння *Dominus Iesus* (2000 г.)

DV — II Ватыканскі Сабор, Дагматычная канстытуцыя пра Божае Аб'яўленне *Dei Verbum* (1965 г.)

EA — Пасінадальная апостальская адгартацыя Яна Паўла II *Ecclesia in Africa* (1995 г.)

EN — Павел VI, Апостальская адгартацыя *Evangelii nuntiandi* (1975 г.)

GS — II Ватыканскі Сабор, Пастырская канстытуцыя пра Касцёл у сучасным свеце *Gaudium et spes* (1965 г.)

IM — II Ватыканскі Сабор, Дэкрэт пра сродкі масавай камунікацыі *Inter mirifica* (1963 г.)

LG — II Ватыканскі Сабор, Дагматычная канстытуцыя пра Касцёл *Lumen gentium* (1964 г.)

NA — II Ватыканскі Сабор, Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій *Nostra aetate* (1965 г.)

OT — II Ватыканскі Сабор, Дэкрэт пра фармацыю святароў *Optatam totius* (1965 г.)

RH — Ян Павел II, Энцыкліка *Redemptor hominis* (1979 г.)

RMs — Ян Павел II, Энцыкліка *Redemptoris missio* (1990 г.)

SNR — Секты альбо новыя рэлігійныя рухі. Пастырскія выклікі (1986 г.)

TMA — Ян Павел II, Апостальская адгартацыя *Tertio Millennio adveniente* (1994 г.)

UR — II Ватыканскі Сабор, Дэкрэт пра экуменізм *Unitatis redintegratio* (1964 г.)

Паняцце рэлігіі

Не толькі ў наш час, але ўжо ад самага пачатку гісторыі чалавек звяртаўся да Найвышэйшай Істоты, выяўляў свае пачуцці ў кульце, а ў жыцці кіраваўся этычнымі прынцыпамі. Гэтыя элементы ўтвараюць пэўную цэласнасць, якая і складае праблематыку рэлігіі. На самым пачатку трэба адказаць, чым, уласна кажучы, з'яўляецца рэлігія?

Само слова «рэлігія» паходзіць ад лацінскага тэрміна «religio, -ere», які азначае сумленнасць, дбайнасць, дасканаласць у адносінах да маральных абавязкаў і ў гэтым сэнсе можа азначаць веру, пабожнасць. Ёсць шмат вызначэнняў рэлігіі. У самай простай тэалагічнай дэфініцыі рэлігія падаецца як сувязь чалавека з Богам.

Рэлігія ёсць у кожнай культуры і цывілізацыі, яна непарыўна звязана з лёсам чалавека. Рэлігія — гэта цудоўны Божы дар, які можна адкрыць чалавечым намаганнем. Пра гэта нагадвае св. Павел: «Бо тое, што можна ведаць пра Бога, відавочнае сярод іх, таму што Бог адкрыў ім. Ад стварэння свету Яго нябачныя рысы, ад-

вечная моц і Боскасць бачныя праз спасціжэнне Яго-ных чынаў, таму няма ім апраўдання» (Рым 1, 19 – 20).

Катэхізіс Каталіцкага Касцёла таксама падае гэтую думку наступным чынам: «Прага Бога ўпісана ў сэрца чалавека, бо ён быў створаны Богам і для Бога» (ККК 27). Яшчэ больш выразна гэта акрэсліваюць першыя словы катэхізіса: «Чалавек „адкрыты на Бога" (*capax Dei*)»*.

Апрача таго, што рэлігія ёсць дарам Бога, яна з'яўляецца таксама намаганнем чалавека. Рэлігія — гэта тое, што вызначае сувязь чалавека з Богам; гэта не толькі прызнанне Бога сваім Творцам, але прызнанне сваёй залежнасці ад Бога, а калі браць глыбей, то рэлігія — гэта вера ў Бога. Таму чалавек моліцца Богу, складае ахвяры і падпарадкоўваецца Яго волі. Гэта праяўленне веры чалавека і разам з тым — знешняе праяўленне рэлігійнасці. Трэба заўважыць, што ў адносінах чалавека з Богам існуюць як бы два кірункі: ад Бога да чалавека і ад чалавека да Бога. Першы кірунак мы вызначаем як аб'яўленыя рэлігіі, а другі — як рэлігіі прыродныя. Аднак праблема дакладнага падзелу ўскладняецца, калі паўстае пытанне пра тое, ці з'яўляюцца рэлігіі толькі вынікам людскіх намаганняў. Ці ёсць у іншых рэлігіях таксама натхненне, ці ёсць след адзінага Бога? Гэтае пытанне Касцёл узнімаў не раз, у тым ліку і на II Ватыканскім Саборы. Дэкларацыя пра адносіны Кас-

* ККК, назва першага раздзела.

цёла да нехрысціянскіх рэлігій сцвярджае, што Касцёл з павагаю ставіцца да іншых рэлігій, якія «хоць і значна адрозніваюцца ад таго, што развівае і чаму навучае Касцёл, усё ж часам адлюстроўваюць промень той Праўды, якая асвячае ўсіх людзей» (NA 2).

Узнікае яшчэ пытанне пра колькасць рэлігій у свеце. Іх вельмі шмат. Некаторыя з іх, такія як старажытныя ці рэлігіі плямёнаў (напрыклад, славянаў) зніклі альбо паглынуліся іншымі. Апрача вялікіх, традыцыйных рэлігій, існуе цэлы шэраг так званых новых рэлігій, альбо новых рэлігійных рухаў. Іх налічваецца больш за 10 000.

Чаму існуе так шмат рэлігій? Гэтае пытанне было зададзена таксама Папу*. Гэта таямніца, якую можна патлумачыць тугою па Богу. Усе рэлігіі часта бываюць пэўнаю драматычнаю спробаю пошукаў сэнсу жыцця, адказу на найбольш важныя пытанні, якія датычаць людскога існавання. Гэта тлумачыць аўтар Паслання да Габрэяў: «Шмат разоў і па-рознаму прамаўляў калісьці Бог да айцоў нашых праз прарокаў, у гэтыя апошнія дні прамовіў да нас праз Сына, якога ўстанавіў спадкаемцам усяго, праз якога і стварыў сусвет. Ён, будучы адлюстраваннем Ягонай славы і вобразам Ягонай сутнасці і падтрымліваючы ўсё словам моцы сваёй, здзейсніў ачышчэнне ад грахоў, сеў праваруч Ве-

* Пар. Ян Павел II, *Перастуліць парог надзеі*. Рым – Люблін – Мінск, 1997. С. 67.

Быў такі час, калі людзі
няспынна вандравалі.
Акружаныя статкамі, ішлі туды, куды ўраджай іх клікаў:
там, дзе зямля, як плодная маці,
была здольная пракарміць жывёлу,
там і чалавек ставіў шатры
і пачынаў жыць.

Чаму мы сёння шукаем
тое месца ў зямлі халдэйскай,
адкуль выйшаў Абрам, сын Тэраха,
з грамадою качэўнікаў, такіх жа, як ён?
Можа, думаў: навошта адсюль сыходзіць?
Навошта пакідаць Ур у зямлі халдэйскай?
Ці так ён думаў? Ці адчуваў смутак расстання?
Ці азіраўся назад?
Таго не ведаем. Толькі ведаем, што чуў Голас,
які казаў яму: Выйдзі!
Абрам вырашыў ісці за Голасам.

А Голас казаў: Будзеш бацькам многіх народаў,
патомства твайго будзе так шмат, як пяску на беразе мора.
Але як споўніцца гэтае абяцанне? — думаў Абрам,
*калі прырода не дала мне дару бацькоўства?**

Ян Павел II,
*Рымскі трыпціх***

---

* Тэксты малітваў, выкарыстаныя ў кнізе, узяты з матэрыялаў Сусветнага дня малітваў аб супакоі, які адбыўся 27.10.1986 г. / „L'Osservatore Romano" (wyd. polskie) 1986, nr 10.

** Пераклад з польскай мовы Дануты Бічэль.

лічы на вышынях і стаў настолькі вышэйшым за анёлаў, наколькі больш слаўнае, чым яны, атрымаў у спадчыну імя» (Гбр 1, 1 – 4).

Літаратура

Dupre L., *Inny wymiar*, Kraków 1991.

Rusecki M. *Istota i geneza religii*, Warszawa 1989.

Waardenburg J., *Religie i religia*, Warszawa 1991.

Werbiści a badania religiologiczne, red A. Wąs, Warszawa 2005.

Якія ёсць рэлігіі?

Як вызнаўца каталіцкай рэлігіі, я заўважаю разнастайнасць рэлігій. І хоць усе яны ўказваюць на Найвышэйшую Істоту, аднак вядуць чалавека рознымі шляхамі. Адсюль часта ўзнікае пытанне пра тое, што нас яднае і што дзеліць з вызнаўцамі іншых рэлігій.

Разважаючы над пытаннем рэлігіі, трэба зрабіць пэўную сістэматызацыю. Гэта, між іншым, задача рэлігіялогіі і тэалогіі рэлігіі. Спроба такой сістэматызацыі — справа нялёгкая. Думаецца, што найперш трэба выдзеліць хрысціянства і іншыя рэлігіі. У межах самога хрысціянства існуе падзел на каталіцкую і іншыя рэлігіі, а таксама хрысціянскія вызнанні. Гэтыя апошнія ў сваю чаргу дзеляцца на рэлігіі, якія выйшлі з традыцыі Усходу (пар. усходняя схізма — 1054 г.), і на рэлігіі і вызнанні, якія выйшлі з рэфармацыі (1517 г.). Падзел хрысціянства асабліва балючы, бо ён пярэчыць волі самога Пана Езуса, які перад мукаю горача маліўся аб еднасці сваіх вучняў (пар. Ян 17, 1 — 23), «з'яўляецца спакусаю для свету, і пры тым перашкаджае святой справе абвяшчэння Евангелля кожнаму стварэнню» (DI 1). Пасля II Ватыканскага Сабору адбылося збліжэнне хрысціянаў роз-

ных веравызнанняў. Пачалі больш дынамічна развівацца экуменічны, а таксама міжрэлігійны дыялогі.

Дэкларацыя *Dominus Iesus* (2000 г.) нагадвае пра вучэнне Сабору: «Таму існуе адзін Хрыстовы Касцёл, які трывае ў Каталіцкім Касцёле, кіруемым Наступнікам Пятра і біскупамі ў лучнасці з ім. Касцёлы, якія, не будучы ў поўнай супольнасці з Каталіцкім Касцёлам, застаюцца, аднак, паяднаныя з ім вельмі цеснымі сувязямі, такімі, як апостальская сукцэсія і сапраўдная Эўхарыстыя, з'яўляюцца сапраўднымі мясцовымі Касцёламі. Таму таксама ў гэтых Касцёлах прысутнічае і дзейнічае Хрыстовы Касцёл, хоць ім не хапае поўнай еднасці з Каталіцкім Касцёлам, бо яны не прызнаюць каталіцкага вучэння аб Прымаце, якім аб'ектыўна валодае Біскуп Рыма па Божым устанаўленні і ажыццяўляе яго над усім Касцёлам.

Тым часам касцёльныя Супольнасці, якія не захавалі паўнамоцнага Епіскапату, а таксама сапраўднай і цэласнай сутнасці эўхарыстычнай таямніцы, не з'яўляюцца Касцёламі ў дакладным сэнсе; аднак ахрышчаныя ў гэтых Супольнасцях праз хрост далучаныя да Хрыста і таму знаходзяцца ў пэўных зносінах, хоць і недасканалых, з Касцёлам. Бо хрост сам па сабе імкнецца да дасягнення паўнаты жыцця ў Хрысце праз паўнату вызнавання веры, Эўхарыстыю і поўную еднасць у Касцёле.

„Такім чынам, вернікам нельга лічыць, што Хрыстовы Касцёл з'яўляецца зборам — хоць і дыферэнцыраваным, але разам з тым якімсьці чынам паяднаным — Касцёлаў і касцёльных Супольнасцяў. Яны не павінны

Гурскі, Я.
Г95 Сустрэча з рэлігіямі / Ян Гурскі ; пер. з пол. К. Лялько. — Мінск: ПРО ХРЫСТО, 2009. — 168 с.

ISBN 978-985-6825-20-3.

У кнізе ксяндза прафесара Яна Гурскага, аўтара шматлікіх кніг і публікацый, прадстаўлена апісанне найбуйнейшых рэлігій свету, а таксама новых рэлігійных рухаў. Праследжваецца гісторыя іх узнікнення і развіцця, робіцца агляд важнейшых рэлігійных практыкаў і святых кніг, асаблівая ўвага надаецца характарыстыцы міжрэлігійнага дыялогу. Пры гэтым аўтар абапіраецца на тэксты II Ватыканскага Сабору, змяшчаючы ў якасці дадатку ўрыўкі тых дакументаў, якія датычацца рэлігій свету.

Кніга адрасавана вернікам, рэлігіязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца сусветнымі рэлігіямі.

УДК 2(100)
ББК 86.3(0)

Духоўна-асветніцкае выданне

Ян Гурскі

СУСТРЭЧА З РЭЛІГІЯМІ

Адказная за выпуск А. Рунёва
Рэдактар І. Бурак
Тэхнічны рэдактар А. Глекаў
Камп'ютэрная вёрстка А. Глекава
Карэктар Л. Камінская

Падпісана да друку 10.01.2009.
Фармат 84x108 1/32. Папера афсетная. Гарнітура BalticaC.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 8,82. Ул.-выд. арк. 5,54.
Наклад 1000 асобнікаў. Заказ № 11.

УП «Выдавецтва „ПРО ХРЫСТО“».
ЛИ № 02330/0150210 ад 13.02.2008.
Пл. Свабоды, 9, п. 2, 220030 г. Мінск.
e-mail: pro-christo@catholic.by; **http:**//pro-christo.catholic.by

Надрукавана ў ПУП «Джі энд Ді»
ЛП 02330/0150065 ад 05.06.2008.
Вул. Бурдзейнага, 37-191, 220136, г. Мінск.

Змест

Каб весці дыялог 5
Ад аўтара 8
Выкарыстаныя скарачэнні 10
Паняцце рэлігіі 12
Якія ёсць рэлігіі? 17
Касцёл і іншыя рэлігіі 25
Юдаізм 33
Іслам 45
Індуізм 57
Будызм 69
Шынтаізм 81
Рэлігіі Кітая 89
Канфуцыянства 90
Даасізм 96
Плямённа-родавыя рэлігіі 101
Новыя рэлігіі 107
Нью-эйдж 115
Збаўленне па-за Касцёлам
у дакументах II Ватыканскага Сабору 123
Дыялог і місіі 137
Хрысціянска-ісламскі дыялог 143
Выбар тэкстаў II Ватыканскага Сабору
пра рэлігіі 153
Выбраная літаратура па рэлігіязнаўстве 158

Zimoń H., *Koncepcja kultu i jego przejawy u ludów pierwotnych*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 468, s. 278–290.

Zimoń H., *Wilhelma Schmidta teoria monoteizmu pierwotnego i jej krytyka w wiedeńskiej szkole etnologicznej*, Warszawa 1984.

Życiński J., *W poszukiwaniu nowej mitologii*, „Tygodnik Powszechny" 1985, nr 47.

Theyssen H., *Dialog z Nieskończonym*, Warszawa 1985.

Theyssen H., *I nagle spotkałem Boga*, Warszawa 1984.

Urban J., *Dialog międzyreligijny w posoborowych dokumentach Kościoła*, Opole 1999.

Urban J., *Doświadczenie Boga u ludów Bantu*, Warszawa 1987.

Waldenfels H., *Chrystus a religie*, Kraków 2004.

Waldenfels H., *Medytacje na Wschodzie i Zachodzie*, Warszawa 1984.

Waldenfels H., *Religie odpowiedzią na pytanie o sens istnienia człowieka*, Warszawa 1986.

Waldenfels H., *Ukrzyżowany i religie świata*, Warszawa 1985.

Werbiści a badania religiologiczne, red. A. Wąs, Warszawa 2005.

Węcławski T., *Wspólny świat religii*, Kraków 1995.

Wider D., *Mistyka niechrześcijańska*, [w:] *Mistyka chrześcijańska. Materiały z sympozjum*, red. J. Machniak, Kraków 1995, s. 54–64.

Wita G., *Istoty nadnaturalne ludu Aszanti w Ghanie*, Katowice 2007.

Witek S., Buddyzm a chrześcijaństwo, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 469, s. 393–406.

Wu J. Ching-hsiung, *O radości*, Warszawa 1986.

Wolanin A., *Dialog chrześcijaństwa z innymi religiami*, Kraków 1993.

Z zagadnień etnologii i religioznawstwa, red. H. Zimoń, Warszawa 1986.

Zaborski A., *Islam i chrześcijaństwo. Materiały z sympozjum*, Kraków 1995.

Zdybicka Z. J., *Człowiek a religia. Zarys filozofii religii*, Lublin 1977.

Zdybicka Z. J., *Czym jest religia i dlaczego istnieje religia — religia w ujęciu filozofii religii*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 468, s. 198–213.


„Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej", Warszawa 1974–1986, t. 1–7.

„Zeszyty Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego" 1975, 18, nr 3; 1980, 23, nr 2.

таксама думаць, што ўжо сёння Хрыстовага Касцёла нідзе няма і таму ён павінен быць толькі аб'ектам пошукаў, якія вядуцца ўсімі Касцёламі і Супольнасцямі". На самай справе „элементы гэтага Касцёла, ужо нам дадзенага, існуюць ‚уключна і ва ўсёй паўнаце' ў Каталіцкім Касцёле, а таксама ‚без такой паўнаты' — у іншых Супольнасцях". „Самі гэтыя Касцёлы і адлучаныя Супольнасці, хоць, па нашым перакананні, маюць некаторыя недахопы, тым не менш не пазбаўлены значэння ў таямніцы збаўлення. Бо Дух Хрыстовы не ўхіляецца ад паслугоўвання імі як сродкамі збаўлення, сіла якіх сыходзіць з тае паўнаты ласкі і праўды, што даверана Каталіцкаму Касцёлу".

Недахоп еднасці сярод хрысціянаў — гэта, несумненна, рана для Касцёла: не ў тым сэнсе, што Касцёл пазбаўлены еднасці, але ў тым, што падзел „перашкаджае поўнаму ажыццяўленню яго паўсюднасці ў гісторыі"» (DI 17).

ХРЫСЦІЯНСКІЯ РЭЛІГІІ



Зірнем цяпер на нехрысціянскія рэлігіі. Іх тыпалогія дыферэнцыраваная ў залежнасці ад прынятага метаду. Існуюць розныя падзелы. Рэлігіязнаўства (Р. Цэнэр) умоўна адрознівае рэлігіі Усходу і рэлігіі Захаду. Рэлігіямі Усходу, якія інакш называюцца космацэнтрычнымі, альбо містычнымі, з'яўляюцца індуізм, будызм, даасізм, канфуцыянства, рэлігіі плямёнаў і часткова рэлігіі старажытнасці. Рэлігіямі Захаду, якія інакш называюцца тэацэнтрычнымі, альбо прарочымі, з'яўляюцца юдаізм і іслам. Разам з тым гэта монатэістычныя рэлігіі.

Такім чынам, паспрабуем у самых агульных рысах паказаць розніцу паміж дзвюма групамі рэлігій, прымаючы за крытэрый пэўныя істотныя пытанні. Першы аспект — гэта **кропка адліку**. Для рэлігій Усходу гэтаю кропкаю адліку з'яўляецца чалавек. Гэта «я» шукаю Бога, гэта «я» прыкладаю намаганне, каб паяднацца з Богам. Акцэнт робіцца на чалавека, на «я».

У рэлігіях Захаду Бог першы выходзіць да чалавека, ініцыятыва належыць Богу. У сувязі з гэтым узнікае другі аспект, а менавіта **ідэя Бога**. У рэлігіях Усходу Бог з'яўляецца толькі нейкаю ідэяй, і нават калі ёсць персаніфікацыя, то няма ясна акрэсленага вучэння пра Бога. У рэлігіях Захаду Бог выступае асобаю (Ягвэ, Алах), разам з тым Ён трансцэндэнтны і блізкі чалавеку.

Наступны аспект — **адносіны да праўды**. У рэлігіях Усходу — гэта сінкрэтычныя, індывідуальныя адносіны. Там дамінуе рэлятывізм, бо існуе адна праўда, недаступная чалавеку. Усе праўды, а таксама рэлігія —

гэта слабое адлюстраванне такой праўды. У рэлігіях Захаду вельмі важным з'яўляецца фармуляванне асноваў веры. Тут можна гаварыць пра артадоксію альбо пра вучэнне, згоднае з аб'яўленымі асновамі веры.

Яшчэ адзін з аспектаў — **канцэпцыя чалавека**. Адрозніваецца сам вобраз чалавека. Рэлігіі Усходу ўслед за безасабовым бачаннем Бога ўспрымаюць чалавека як дух. Цела з'яўляецца толькі «покрывам», якое ён скідае, як убранне, але ў такім успрыняцці не хапае адзінства паміж душою і целам.

Існуе таксама адрозненне ў **канцэпцыі свету**. У космацэнтрычных рэлігіях свет эманаваў ад Бога, ён цыклічна нараджаецца, сталее і памірае, знаходзячыся ў стане пастаяннага пагаршэння. Адсюль сыходзіць частае адмаўленне свету. У тэацэнтрычных рэлігіях свет выйшаў з небыцця, быў створаны Богам, мае канец, але дасягае дасканаласці. У вызнаўцаў гэтых рэлігій існуе вера ў пабудову лепшага свету.

Урэшце ёсць вельмі важная праблема **пасрэдніка**. У рэлігіях Усходу кожны заснавальнік рэлігіі з'яўляецца «мудрацом»: Буда, Канфуцый. Яны самі перажылі тое, што абвяшчаюць. Улічваецца найперш асабісты досвед настаўніка. У рэлігіях Захаду існуе інстытут прарока. Прарокі (старазапаветныя, Магамет) перадаюць не ўласнае пасланне, а Божае.

Як бачна з гэтага кароткага аналізу, ёсць вялікая розніца паміж тэацэнтрычнымі і космацэнтрычнымі рэлігіямі. Такая розніца існуе паміж абедзвюма групамі рэлігій і хрысціянствам.

Хрысціянства — гэта зусім новая рэлігія. Яе нельга аднесці ні да першай, ні да другой групы рэлігій. Хрысціянства трансцэндуе абедзве групы.

Езус Хрыстус з'яўляецца найвялікшаю «навіною» хрысціянства (св. Ірэнэй). У нашай рэлігіі існуе раўнавага паміж радыкальнаю трансцэндэнцыяй Бога і радыкальнаю іманентнасцю менавіта праз таямніцу Уцелаўлення. Ян Павел II пісаў так: «Хрыстус прыйшоў на свет дзеля ўсіх гэтых народаў, усіх іх адкупіў і, несумненна, мае свае шляхі, каб дайсці да кожнага з іх на цяперашнім эсхаталагічным этапе гісторыі збаўлення»*.

Хрысціянства абапіраецца на гістарычнае аб'яўленне. Таямніца аб'яўлення атаясамліваецца з тым, хто аб'яўляецца. Той, хто аб'яўляецца, з'яўляецца тым, якога аб'яўляюць. Асоба Езуса Хрыста з'яўляецца зместам нашай веры. Гэта найвялікшы дар Бога для нас, людзей. Пра гэта нагадвае св. Ян: «Бо так палюбіў Бог свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае» (Ян 3, 16). Хрысціянскае аб'яўленне — гэта не толькі адкрыццё праўды, яно мае стваральны характар. Чалавек, які яго прымае, становіцца кімсьці новым (пар. Рым, 14 — 17). Ні ў якой іншай рэлігіі няма такога Касцёла, які быў бы адначасова супольнасцю і ўстановаю, які быў бы Божым і разам з тым людскім. Касцёл не толькі перадае веру, але й асвячае. Ён з'яўляецца «сакрамэнтам збаў-

---

* *Пераступіць парог надзеі*, с. 70.

лення» для свету (пар. LG 1). «Касцёл — гэта цела Хрыстова — цела жывое і жыццядайнае»*.

Гэта Езус Хрыстус прынёс новы погляд на чалавека. Мы павінны любіць кожнага чалавека любоўю Хрыста. Новы погляд на чалавека найбольш відавочны ў вызначэнні адносінаў да жанчыны, якая ва ўсіх культурах і рэлігіях фактычна была дыскрымінаваная. Сапраўднае вызваленне ёй прынёс Хрыстус.


Вывучэнне рэлігіі сёння неабходнае, асабліва ў святле хрысціянства. Гэта дазваляе нам не толькі зразумець іншых людзей, але таксама больш палюбіць нашу каталіцкую рэлігію.

ПАДЗЕЛ РЭЛІГІЙ

Пытанне	Рэлігіі Усходу	Рэлігіі Захаду
Кропка адліку	«я»	«Бог»
Ідэя Бога	безасабовы	асабовы
Адносіны да праўды	сінкрэтычныя	выразна акрэсленыя
Канцэпцыя чалавека	дух, а цела толькі «покрыва»	адзінства душы і цела
Канцэпцыя свету	свет эманаваў ад Бога і становіцца ўсё горшым, кіруецца ў небыццё	наступіць аднова свету
Пасрэднік	часта з'яўляецца заснавальнікам рэлігіі	інстытут прарока, які прамаўляе ад імя Бога

* *Тамсама*, с. 66.

РЭЛІГІІ СВЕТУ



Літаратура

Malherbe M., *Religie ludzkości*, Kraków 1997.

Sakowicz E., *Religioznawstwo. Przewodnik tematyczny*, Lublin 2005.

Seweryniak H., *Misyjne wyznanie wiary, a nie dyskredytacja innych religii*, „Światło Narodów" 2000, 4, s. 5–16.

Węcławski T., *Wspólny świat religii*, Kraków 1995.

Касцёл і іншыя рэлігіі

Хрысціяне здаўна задавалі сабе пытанне, ці можа быць збаўлены чалавек, які не вызнае Езуса Хрыста і не ведае Евангелля. Што будзе з тымі, хто памёр неахрышчаным? Цяпер гэтае пытанне яшчэ ў большай ступені датычыць адносінаў Касцёла да іншых рэлігій: як Касцёл ацэньвае іншыя рэлігіі? Як Касцёл ставіцца да тых, хто не верыць у Бога?

Яшчэ айцы Касцёла заўважалі пэўныя пазітыўныя элементы ў іншых рэлігіях, а пішучы пра гэта, мелі на ўвазе найперш іх уключэнне ў хрысціянства. З часоў Тэртуліяна існавала перакананне, што Евангелле ўжо вядомае на ўсёй зямлі. Калі яшчэ й жывуць дзесьці язычнікі, то яны самі вінаватыя ў тым, што не ведаюць навукі Хрыста.

Апрача гэтага кірунку, які можна вызначыць як пазітыўны, на жаль, усё больш набываў уплыў негатыўны кірунак, які ў іншых рэлігіях бачыць толькі зло. У адносінах да габрэяў гэта было абвінавачванне ўсяе супольнасці за смерць Езуса на крыжы. У выніку, выкарыстоўваліся тыя метады евангелізацыі, якія супя-

рэчылі прынцыпам навукі Пана Езуса і за якія Папа Ян Павел II неаднаразова прасіў прабачэння.

Вялікі паварот у дыялогу Касцёла з іншымі рэлігіямі настаў у выніку пастановаў II Ватыканскага Сабору. Заўважныя пазітыўныя кірункі былі афіцыйна прадстаўленыя ў навучанні Касцёла ў наступных дакументах: Дагматычная канстытуцыя пра Касцёл *Lumen gentium*, Пастырская канстытуцыя пра Касцёл у сучасным свеце *Gaudium et spes*, Дэкрэт пра місійную дзейнасць Касцёла *Ad gentes*, Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій *Nostra aetate*, а таксама ў Дэкларацыі пра рэлігійную свабоду *Dignitatis humanae*.

Сабор паставіўся з вялікаю павагаю да іншых рэлігій (пар. LG 16), такіх як юдаізм, іслам (пар. LG 16), індуізм, будызм (пар. NA 2), а таксама да «веруючых у Бога» і «людзей добрай волі» (пар. LG 16). У гэтых рэлігіях пасеяна зерне Божага слова, у іх часта «адлюстроўваецца промень той Праўды, якая асвячае ўсіх людзей» (пар. NA 2) і таму яны могуць служыць падрыхтоўкаю да евангелізацыі. Вызнаўцаў гэтых рэлігій Сабор называе веруючымі і прапануе ім братні дыялог. Вучэнне Касцёла ідзе яшчэ далей: не адкідвае нічога з таго, што ў гэтых рэлігіях «сапраўднае і святое», а таксама з захапленнем глядзіць на пэўныя формы жыцця і навуку. Многія тэолагі (напрыклад, К. Ранэр, Ж. Дзюпуа) лічаць гэтыя рэлігіі падрыхтоўкаю да прыняцця Евангелля, а веруючых розных рэлігій — «ананімнымі хрысціянамі».

Асабліва выразна была падкрэслена абсалютна новая пазіцыя Касцёла адносна габрэяў (NA 4).

Паслясаборавае вучэнне было значна пашырана і паглыблена Янам Паўлам II. Цяпер можна казаць пра вельмі пазітыўныя адносіны Касцёла да іншых рэлігій. Папа Бэнэдыкт XVI працягвае дыялог з рэлігіямі як важны аспект свае праграмы. Ён выразна падкрэсліў гэта ў часе сваіх пілігрымак у Германію, Польшчу і Турцыю. Але нават найлепш наладжаны дыялог не можа замяніць абавязку Касцёла весці місійную дзейнасць.

Тут мы сутыкаемся з чарговаю праблемаю адносінаў дыялогу і місіі. Сабор прызнае, што Бог можа збавіць тых, хто «яшчэ» не ведае Хрыста і не належыць да Касцёла, на іншай, надзвычайнай дарозе (пар. LG 16; пар. EN 80). Аднак гэта не вызваляе Касцёл ад абавязку місіі *ad gentes*. Сцвярджэнне Кіпрыяна: *Extra Ecclesiam nulla salus**, падтрыманае IV Латэранскім (1215 г.) і Фларэнцкім Саборамі (1438 – 1445 гг.), паўторанае таксама II Ватыканскім Саборам (1962 – 1965 гг.), з'яўляецца перасцярогаю для ўсіх, хто губляе лучнасць з Касцёлам, як і напамінам пра тое, што калі хтосьці можа быць збаўлены па-за Касцёлам, то дзякуючы менавіта існаванню яго як сакрамэнту збаўлення для свету (пар. LG 1).

Нагадвае пра гэта і Ян Павел II: «Гэтая аксіёма азначае, што людзі, якія ведаюць, што Касцёл быў заснаваны Богам праз пасрэдніцтва Хрыста як неабходны,

* Па-за Касцёлам няма збаўлення (лац.). *(Заўвага перакл.)*

павінны да яго далучыцца і вытрываць у ім, каб атрымаць збаўленне. <...> Тыя ж, хто не атрымаў паслання Евангелля, як было адзначана ў энцыкліцы *Redemptoris missio*, могуць дасягнуць збаўлення дзякуючы таемным шляхам, паколькі Божая ласка ўдзяляецца праз моц адкупленчай ахвяры Хрыста, без знешняй прыналежнасці да Касцёла, аднак заўсёды ў суадносінах з ім»*.

У канстытуцыі *Lumen gentium* сцвярджаецца: «Божы Провід не адмаўляе ў неабходнай для збаўлення дапамозе і тым, хто не па сваёй віне наогул яшчэ не дайшоў да выразнага пазнання Бога» (LG 16). Можна аналізаваць ужыты тут выраз «не па сваёй віне», але ацэнка сапраўдных магчымасцяў пазнання ўрэшце сапраўды належыць толькі Пану Богу. Усіх гэтых людзей «Бог вядомымі толькі Яму шляхамі можа давесці да веры» (AG 7).

Такім чынам, дыялог уваходзіць у вялікую місійную справу Касцёла і з'яўляецца ўмоваю і метадам місіі. Евангелле сапраўды можа вызваліць чалавека, асабліва ў духоўным, маральным і культуралагічным вымярэнні. У сваю чаргу місіі не могуць не заўважаць патрэбы сапраўднага дыялогу. Сама місійная справа таксама з'яўляецца ўводзінамі чалавека ў адзіны і непаўторны дыялог Найсвяцейшай Тройцы. Пазіцыя сапраўднага дыялогу засцеражэ, з аднаго боку, перад замкнутасцю на іншага чалавека, з другога ж боку, дазволіць па-

* Ян Павел II. Генеральная аўдыенцыя, 31.05.1995 г.



Экуменічная сустрэча ў Асізі. 27 кастрычніка 1986 г.

збегнуць такой небяспечнай сёння тэндэнцыі рэлігійнага сінкрэтызму, гэта значыць змяшання элементаў розных рэлігій, увядзення ў хрысціянства чужародных элементаў, якія паходзяць з іншых рэлігій. Перад выкарыстаннем асабліва некаторых медытацыйных прыёмаў перасцерагае Ян Павел II, цытуючы, зрэшты, ранейшы ліст Кангрэгацыі Веравучэння «Пра некаторыя

аспекты хрысціянскай медытацыі»*. Для сапраўднага дыялогу неабходна перамена сэрца, каб у праўдзе і любові імкнуцца да адзінага і сапраўднага Бога.

Па-за Хрыстом няма збаўлення! Гэта абвяшчаў св. Пётр перад Сінэдрыёнам (пар. Дз 4, 12). Ва ўсіх хрысціянаў ёсць ганаровы абавязак рабіць усё, каб Езус Хрыстус быў вядомы і шанаваны ўсімі людзьмі.

Нават вельмі неабходнае сёння веданне гісторыі ці найважнейшых дактрынальных прынцыпаў іншых рэлігій будзе мала прыдатнае, калі не хопіць пакоры і адкрытасці на іншага чалавека. Такой пазіцыі дыялогу вучыць Ян Павел II. Нельга забываць, што, ведучы дыялог, трэба найперш быць шчырым вызнаўцам нашай хрысціянскай рэлігіі. У лекцыі Бэнэдыкта XVI ва універсітэце ў Рэгенсбургу (2006 г.) яшчэ раз была закранута праблема хрысціянскай ідэнтычнасці ў працэсе дыялогу. Найбольш шкоды гэтаму працэсу наносілі рэлігійныя фанатыкі, якія часта на сваю карысць злоўжывалі толькі выбранымі фрагментамі вучэння Езуса Хрыста. Пра гэта нагадаў Экуменічны Патрыярх Канстанцінопаля Барталамей I у часе гістарычнага візіту ў Рым (1995 г.): «Таму ўсе цяжкасці Касцёла, якія з'яўляюцца час ад часу ў яго гісторыі і прыходзяць альбо збоку альбо знутры па віне нашых грахоў, заўсёды звязаны, непасрэдна ці ўскосна, з вызнаннем веры і з паслухмянасцю веры. Адсюль сыходзяць разнастайныя

* *Пераступіць парог надзеі*, с. 74.

перасьледы веруючых на свеце; тут крыніца ерасі і нязгоды сярод вернікаў».

Працэс укаранення хрысціянства, пры якім можна пазбегнуць памылак, магчымы праз інкультурацыю, якая выяўляецца ў розных сферах хрысціянскага жыцця: евангелізацыі, кульце, тэалогіі, служэнні міласэрнасці. Гэта вельмі важная форма дыялогу, дзякуючы якой Касцёл не толькі адорвае, але і сам таксама атрымлівае дары.

З дыялогу, мэтаю якога з'яўляецца пазнанне найвышэйшай Праўды і досвед найвялікшай Любові, Касцёл не выключае нікога, нават няверуючых. Нават і ў выпадку атэізму існуе вялікая надзея, пра якую нагадвае св. Павел: «Ад стварэння свету Яго нябачныя рысы, адвечная моц і Боскасць, бачныя праз спасціжэнне Яго ных чынаў» (Рым 1, 20).

Такая пазіцыя Касцёла — гэта сапраўднае служэнне ў адносінах да свету. Урэшце Пан Езус збавіў усіх людзей і напрыканцы часоў будзе «ўсім для ўсіх». Таму трэба пазбягаць асуджэння іншых і не адмаўляць ім у праве спазнання Божай ласкі на іншым, надзвычайным шляху. З мэтаю такога разумення нашай сустрэчы з іншымі рэлігіямі Ян Павел II прапаноўвае і рэлігіям, і асобным людзям шлях малітвы. Досвед сустрэчаў у Асізі — гэта найлепшы кірунак пошукаў.

Яшчэ св. Ігнацый Антыёхскі навучаў: «А за іншых людзей маліцеся нястомна, бо ёсць у іх надзея навяртання, калі знойдуць Бога. Таму дазвольце ім, каб прынамсі дзякуючы вашым паводзінам сталі вашымі вуч-

нямі. Перад іх гневам будзьце пакорныя, на іх блюзнерствы адказвайце малітвамі, на іх памылкі — устойлівасцю веры, на іх жорсткасць — лагодаю, не спрабуючы ні ў чым іх наследаваць. Станьма іх братамі праз нашу дабрыню і стараймася быць паслядоўнікамі Пана»*.

На заканчэнне яшчэ раз варта ўсвядоміць, што найлепшая форма дыялогу і місіі — гэта любоў. Нельга ісці на якісьці кампраміс, каб прымаць тое, што супярэчыць навуцы Хрыста. Любоў і пошукі дыялогу зусім не азначаюць страты свае ідэнтычнасці. Аднак заўсёды трэба з любоўю адносіцца да іншага чалавека — вызнаўцы іншай рэлігіі.

Літаратура

Benedykt XVI, *Encyklika „Deus caritas est"* (2006).
Waldenfels H., *Chrystus a religie*, Kraków 2004.


* *Ліст да Касцёла ў Эфесе*, X, 1 н.

Юдаізм



Тытул Ленінградскага кодэкса — самага старажытнага ацалелага спісу масарэцкага тэксту Танаха (1008 г.).

Пры спробе апісаць юдаізм даводзіцца сутыкацца са значна большымі цяжкасцямі, чым пры апісанні іншых рэлігій, у залежнасці ад таго, пра які юдаізм будзе ісці гаворка. Юдаізм — гэта доўгая гісторыя Ізраэля, якая налічвае больш за тры тысячы гадоў, бо нельга аддзяліць гісторыю Ізраэля ад яго рэлігіі. Зрэшты, пра гэта сведчыць Стары Запавет: у гісторыі збаўлення, альбо Божай эканоміі, ёсць гісторыя выбранага народу. Таксама юдаізм, адна з вялікіх рэлігій, ніколі не перайшоў межаў уласнай нацыянальнай культуры і не стаў універсальнаю рэлігіяй. З гэтай і яшчэ з іншых прычынаў у шматлікіх даследаваннях у галіне гісторыі рэлігій, асабліва ў хрысціянскім кантэксце, юдаізм не разглядаецца. Уласна кажучы, вывучэнне Біблії ў пэўнай ступені з'яўляецца найлепшым пазнаннем юдаізму, які можна акрэсліць як рэлігію чакання, падрыхтоўкі да прыйсця Месіі.



Фрагмент макета-рэканструкцыі Ерузалемскай святыні (час Ірада Вялікага).

Гісторыя

Хоць пачатак юдаізму звязаны з выхадам габрэйскага народу з Егіпта і з запаветам на Сінаі, яго карані даходзяць да гісторыі Абрагама. Ад слыннай падзеі — паклікання Абрагама, адбываецца пералом, да якога звяртаюцца ўсе монатэістычныя рэлігіі. Упершыню можна казаць пра іншыя, новыя адносіны чалавека да Бога, пра давер. Абяцанне, дадзенае Богам, выходзіла ў будучыню, а сустрэча чалавека з Богам з гэтага часу павінна была быць сустрэчаю ў веры (пар. Быц 12, 1 — 5).

Нашчадкі Абрагама — гэта выбранае племя; хто з яго нарадзіўся, з'яўляецца ізраэлітам. Ізраэліты сталі народам з моманту заключэння запавету на Сінаі, а асноўным законам для іх сталі Божыя запаведзі, перададзеныя Майсеем. Без Запавету Ізраэль губляе сэнс.

Хоць, як ужо згадвалася, юдаізм не быў універсальнаю рэлігіяй, але, аднак, не быў і закрытаю. Пра гэта



Франчэско Хайес. «Разбурэнне Ерузалемскай святыні».

сведчыць інстытут «празелітызму». Празеліт становіцца як бы новым членам племя. Юдаізм як нацыянальная рэлігія акрэсліўся ўпершыню ў перыяд бабілёнскай няволі (587 – 538 гг. да Н. Х.), калі дэпартаваныя габрэі хацелі не толькі захаваць свае традыцыі, але і ўмацаваць свае рэлігійныя перакананні. Там, у няволі, з'яўляецца вялікая частка Бібліі і «вучоныя ў Пісанні». Таксама ўмацавалася ўся рэлігійная абрадавасць: святкаванне шабату, абразанне, правілы, якія датычылі рытуальнай чысціні. Таксама з таго часу вельмі значна ўмацавалася вера і чаканне Месіі.

Пасля разбурэння персамі Новавабілёнскага Каралеўства (539 г.) Палестына стала правінцыяй. Кароль персаў Цырус II (559 – 529 гг.) дазволіў габрэям вярнуцца ў Ерузалем і адбудаваць знішчаную святыню (538 г.). Правадыр, які вывеў усіх з няволі, Зарабабель быў надзелены каралём спецыяльнымі паўнамоцтвамі як на-



Фрагмент Сцяны плачу.

глядчык адбудовы і арганізатар грамадскага жыцця. Пад яго кіраўніцтвам адбудова была шчасліва завершана. Кнігі Ездры і Нээміі распавядаюць пра адбудову габрэйскай супольнасці ў Ерузалеме і ў Юдэі пасля прыбыцця рэпатрыянтаў з няволі. Аповед засяроджваецца вакол трох найважнейшых момантаў: адбудовы ерузалемскай святыні, вяртання Ерузалему характару абарончага горада і ўстанаўлення юрыдычных асноваў жыцця рэпатрыянтаў.

На грамадскасць Ізраэля вялікі ўплыў мелі некалькі асяроддзяў. Першае з іх складалі садукеі. Яны не мелі асобнай арганізацыі, былі групаю святарскай арыстакратыі, якая не магла ўявіць сабе юдаізму без святыні і святарства. Яны з усіх сілаў імкнуліся захаваць чыстую традыцыю.

Іншую групу складалі асідэі — пабожныя, арганізаваныя габрэі, якія выступалі супраць язычніцкіх уплываў (пар. 1 Мак 2, 42). Яны адыгралі вялікую ролю ў

барацьбе са спробамі элінізацыі жыцця. Пазней асідэі падзяліліся на фарысеяў і эсэяў.

У II стагоддзі да Н. Х. эсэі заснавалі супольнасць, якая жыла на ўзбярэжжы Мёртвага мора (пар. археалагічныя раскопкі ў Кумране). Яны практыкавалі жыццё ў супольнасці замест культу святыні. Супольнасць мела свайго кіраўніка. Іх пасланне звяртала ся да надыходзячых апошніх часоў.



Шэкель Бар-Кохбы (Юдэя, 133 г.). На манеце — фасад храма Саламона з каўчэгам Запавету.

У сваю чаргу фарысеі былі своеасаблівай партыяй, у якую перарадзіўся рэлігійны рух. Пачаткі гэтага руху сягалі макабэйскіх часоў. Члены гэтай партыі адрозніваліся ад іншых гіпертрафіраваным уяўленнем пра рытуальную чысціню, дэталёвым захаваннем не толькі літары Закону, але і наказаў вуснай «традыцыі старэйшых».

Юдаізм пасля Хрыста

Пералом у юдаізме наступіў пасля зруйнавання рымлянамі ерузалемскай святыні ў 70 годзе пасля Н. Х., калі ізраэліты не прынялі Месіі Езуса і адважыліся адкінуць гістарычную універсалізацыю свайго рэлігійнага досведу, распачатую вызнаўцамі Езуса. Садукеі беззваротна страцілі сваю ролю, гэтаксама, як і іншыя гру-

пы. Сярод тых, хто шукаў ацалення юдаізму, трэба назваць рабіна Ёханана бэн Саккаі. Падчас аблогі Ерузалема ён пакінуў горад і заснаваў школу ў Яўне. Сустрэчу, якая там адбылася, часта называюць «Яўнскім Сінодам». Ацалелыя вучоныя паспрабавалі правесці рэформу рэлігіі. У той сітуацыі, калі немагчыма стала складаць ахвяру ў святыні, яе месца павінна было заняць слова. З тым перыядам звязана паняцце «рабінізму», якое азначае традыцыйны падыход і форму навучання рабінамі. Наступнікам згаданага рабіна стаў Гамаліэль II, заслугаю якога з'яўляецца ўстанаўленне парадку і тэкстаў малітваў у сінагозе. Таксама ў тых жа колах узнікла *Мішна*, альбо вучэнне, збор законаў.

З пазнейшых школаў можна назваць найперш кабалістычную школу (габр. «прыняцце» традыцыяй). Гэтая назва ахоплівае розныя містычныя кірункі, асабліва развітыя з XIII стагоддзя.

Пасля няўдалага паўстання супраць рымлянаў (II ст.) асяродкамі юдаізму пачаргова былі Тыберыя, Бабілён, а пасля — Іспанія. Там, у рабіністычных школах, канцэнтравалася рэлігійнае жыццё. Пасля выгнання габрэяў з гэтай краіны ў XV ст. выгнаннікі аселі галоўным чынам у Германіі і ў Польшчы. Другая сусветная вайна разбіла гэтыя супольнасці, знішчыла культурныя здабыткі. Габрэі перажылі асаблівы пераслед з-за рэлігійнай прыналежнасці — халакост.

Хасідызм (габр. «пабожны») — гэта самы малады рэлігійна-містычны рух, заснаваны ў 1705 годзе ў Меджыбожы на Украіне рабінам Ізраэлем бэн Эліезэрам




Старонкі кнігі Амоса (Ірак, каля 1800 г.).

(1698 – 1760 гг.). Характэрнаю рысаю хасідызму была радасць, якая часта дэманстравалася праз спецыфічную гармонію з атачэннем. Да знакамітых асобаў гэтага кірунку належаць Марцін Бубер (1878 – 1965 гг.) і Марк Шагал (1887 – 1985 гг.). Усходнія тэрыторыі Рэчы Паспалітай былі месцам развіцця гэтага руху.

Ягвэ і Тора

Адзіны Бог, Ягвэ, для вызнаўцаў юдаізму з'яўляецца найвялікшаю каштоўнасцю. Адносіны ж веруючага з Богам адлюстроўвае *Тора*, якая ўспрымаецца не толькі як «літара закону», але найбольш як шлях збаўлення і сустрэчы чалавека з Ягвэ.

Для юдаізму рэлігія Ізраэля — гэта аснова веры ў адзінага Бога, Стварыцеля неба і зямлі. Веру ў адзінага Бога адлюстроўваюць словы: «Слухай, Ізраэль: Пан, Бог наш, Пан адзіны» (Дрг 6, 4). Гэтыя словы паўтараюцца кожны дзень. Вера ў адзінага Бога была пазней сфар-




Скрутак Торы, разгорнуты для чытання ў сінагозе.

муляваная ў трынаццаці артыкулах Майманідаса. Аднак Бог, караючы Суддзя, пакінуў чалавеку свабоду. Адносіны да Бога грунтуюцца на даверы. М. Бубер піша пра адносіны «я — Ты»: «Ты сустрэнецца са мною з ласкі». Вобразамі гэтай сустрэчы з'яўляюцца вера Абрагама і вера Ёва, які вызнае: «Хоць бы мяне забіў, я буду Яму давяраць!» (пар. Ёв 13, 15).

Адносіны да Бога былі ў пэўным сэнсе сфармалізаваныя вялікаю колькасцю «вуснай навукі»: 613 запаведзяў, якія ахопліваюць правілы рытуальных абмыванняў, пасілкаў, сужэнскага і грамадскага жыцця. Гэтыя правілы, якія з'яўляюцца тлумачэннем Торы, маюць свае вытокі ў сустрэчы з Богам, жывым і адзіным.

У апісаннях юдаізму, яго непаўторнай ролі ў гісторыі дыялогу чалавека з Богам, сустракаюцца пэўныя характэрныя кампаненты. Х. Вальдэнфэльс акрэслівае гэта так: «чужына», «зямля і свабода» і «дыялог з Богам». Здаецца, што гэтыя тэалагічныя паняцці найлепш характарызуюць юдаізм.



Сінагагальны каўчэг — сховішча для світкаў Торы.

Дыялог Касцёла з юдаізмам

Юдаізм і хрысціянства ствараюць супольную гісторыю не толькі з увагі на супольныя «карані», але і таму, што абедзве супольнасці звяртаюцца ў будучыню — да эсхаталагічных часоў. Гісторыя юдаізму не закончылася пасля зруйнавання Ерузалема і святыні, але працягваецца далей у веры, у чаканні прыйсця Месіі (пар. ККК 839 – 840). З габрэйскім народам нас яднае ідэя Божага сыноўства (пар. Эф 2, 11 – 19).

Пасля многіх стагоддзяў узаемнай варожасці, пасля балючага досведу халакосту Касцёл заклікаў усіх вызнаўцаў Хрыста да сапраўднага дыялогу з вызнаўцамі юдаізму. У Дэкларацыі пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій *Nostra aetate* Сабор прысвяціў

Фрагмент малітвы ў Біркенау з удзелам Бэнэдыкта XVI

Буду абвяшчаць сваім братам Тваё імя і буду хваліць Цябе ў супольнасці верных.

«Хваліце Пана вы, што Яго славіце, няхай славяць Яго ўсе нашчадкі Якуба, няхай баяцца Яго ўсе нашчадкі Ізраэля. Бо Ён не пагарджаў ані не грэбаваў бядою ўбогага, ані не схаваў перад ім свайго аблічча і выслухаў яго, калі той Яго клікаў».

Будуць хваліць Пана тыя, хто Яго шукае:
«Сэрцы вашыя хай жывуць на вякі!»
Успомняць і навернуцца да Пана
ўсе межы зямлі,
і паклоняцца перад Табою
ўсе плямёны язычнікаў,
бо ўлада каралеўская належыць Пану,
і Ён пануе над народамі.
Толькі Яму будуць пакланяцца ўсе,
хто спіць у зямлі,
перад Яго аблічам упадуць усе,
хто ператвараецца ў пыл.
Але мая душа будзе жыць для Яго.
Патомства маё будзе служыць Яму.
Наступнаму пакаленню
будуць расказваць пра Пана.

юдаізму, сярод іншых рэлігій, найбольш увагі — увесь 4-ы раздзел. Там можна знайсці ўсё, што нас яднае, як бы нашу супольную з «нашымі старэйшымі братамі ў веры» гісторыю (Ян XXIII). Мы — дзеці аднаго і таго ж Бога: «Таму Хрыстовы Касцёл прызнае, што асновы яго веры і абрання існавалі, паводле збаўчай таямніцы Бога, ужо ў патрыярхаў, Майсея і прарокаў» (NA 4). Касцёл памятае, што праз пасрэдніцтва гэтага народу Бог заключыў з чалавецтвам Запавет. Дэкларацыя нагадвае, што з габрэйскага народу паходзіў Хрыстус «паводле цела» (Рым 9, 5), Яго Маці, Апосталы і «большасць першых вучняў, якія абвяшчалі Евангелле Хрыста» (NA 4). Дагматычная канстытуцыя пра Касцёл *Lumen gentium* паказвае вызнаўцаў юдаізму як «падпарадкаваных» Божаму народу Новага Запавету: «народ, умілаваны дзеля айцоў з прычыны выбрання, таму што Бог не шкадуе аб дарах і пакліканні» (LG 16).

Далей у Дэкларацыі разглядаецца справа адказнасці габрэяў за смерць Езуса і праблема антысемітызму. Нельга віну за смерць Езуса ўскладаць на ўсіх габрэяў, якія жылі тады і цяпер. Катэхізіс Каталіцкага Касцёла выразна падкрэслівае: «Габрэі не нясуць агульнай адказнасці за смерць Езуса» (ККК 597). Не трэба паказваць габрэяў як адрынутых. Такім чынам усялякія праявы недахопу талерантнасці былі асуджаныя.

Трэба адзначыць, што з часу II Ватыканскага Сабору адносіны да юдаізму істотна змяніліся. Таксама стаў іншым, больш пазітыўным, погляд на габрэяў. Вялікаю падзеяй быў першы ў гісторыі візіт Папы Яна

Паўла II у сінагогу ў Рыме (1985 г.), а пасля яго — малітва каля Сцяны плачу ў Ерузалеме (2000 г.). Падчас папскіх пілігрымак сустрэчы з габрэйскімі супольнасцямі сталі ўжо звыклымі пунктамі праграмы. Папа просіць, каб суіснаванне католікаў і габрэяў не было існаваннем «побач», але супольным жыццём ва ўзаемнай любові. У сваёй кнізе «Пераступіць парог надзеі» Ян Павел II выказвае вельмі асабістыя адносіны да габрэяў і іх рэлігіі. Гэты кірунак працягвае Бэнэдыкт XVI. Тут неабходна прыгадаць яго наведванне лагера смерці Аўшвіц-Біркенау (2005 г.).

Літаратура

Auschwitz. Konflikty i dialog, red. M. Głownia, S. Wilkanowicz, Kraków 1998.

Іслам



Іслам разам з хрысціянствам і юдаізмам складаюць групу монатэістычных рэлігій, гэта значыць, рэлігій, якія прызнаюць адзінага Бога. Вызнаўцы ісламу, мусульмане — другая па колькасці група на свеце пасля вызнаўцаў каталіцкай рэлігіі. Само слова «іслам» азначае «адданасць».

Гісторыя

Заснавальнікам рэлігіі з'яўляецца Мухамад Ібн Абдулах (Магамет), які нарадзіўся каля 570 года ў Мецы, на тэрыторыі сённяшняй Саудаўскай Аравіі. Пасля смерці бацькоў выхаваннем хлопца заняўся дзядзька, бацькаў брат, прыцягваючы яго да службы ў караванах. Караван, які праходзіў штогод з поўначы, з Сірыі, для пустэльнай Аравіі быў вялікаю падзеяй у гаспадарчым, культурным і інфармацыйным сэнсах. Пасля хлопец наняўся на службу да багатай удавы Хадзіджы, якая займалася гандлем. У хуткім часе яны пажаніліся. Каля 610 года пачаліся першыя аб'яўленні, якія адбываліся ў часе сну: Магамет даведаўся, што ён прарок, пасланы Богам (Алахам), каб засцерагчы людзей ад ідалапаклонніцтва



Мекка — святое месца ўсіх мусульманаў.

і ўстанавіць грамадскую справядлівасць. Такая пазіцыя выклікала супраціўленне жыхароў Меккі. У 622 годзе Магамет разам з сямюдзесяццю паслядоўнікамі пераехаў у Медыну. Гэта была так званая *Хіджра*, або «адыход», які паклаў пачатак мусульманскай эры. Там Магамет заснаваў першую мусульманскую супольнасць і стаў яе кіраўніком. Адтуль ён імкнуўся аслабіць прэстыжную і гаспадарлівую Мекку. У 624 годзе ён перамог горад, але вярнуўся ў яго толькі ў 630 годзе, з энтузіязмам вітаны жыхарамі. На ўспамін вяртання мусульмане штогод пілігрымуюць да *Каабы*, чорнага каменя. Згодна са старажытнай традыцыяй, гэты невялікі астэроід з'яўляецца дарам арханёла Габрыэля Абрагаму. Мяркуюць, што спачатку ён быў белы, аднак з прычы-

ны людскіх грахоў стаў чорны. У 632 годзе Магамет правёў апошнюю пілігрымку, якую пазней назвалі развітальнаю, бо прарок памёр 8 чэрвеня 632 года ў Медыне, дзе і быў пахаваны. Яго наступнікамі былі халіфы, так званыя «справядлівыя»: Абу Бакр, Амар, Асман, Алі і Муавія.

Узнікае вельмі істотнае пытанне: у якой ступені Магамет з'яўляецца творцам ісламскай рэлігіі?

У дамусульманскі перыяд, які называецца перыядам няведання (*джабілія*), у Аравію вырушвалі рыцарскія паходы, часта, на жаль, спалучаныя з рабункамі. У мірныя часы месцам сустрэчаў былі кірмашы, дзе наладжваліся паэтычныя турніры. Менавіта ў гэтых месцах, асабліва падчас вядомых караванаў, Магамет мог

Блакітная мячэць у Стамбуле.






Вялікая мячэць Амайадаў у Дамаску.


сутыкнуцца з габрэйскаю і хрысціянскаю рэлігіямі і культурамі. Сярод жыхароў пустыні, качэўнікаў, якімі з'яўляліся арабы, рэлігійнасць была развіта слаба. Месцам культу была Мекка, дзе здаўна ўшаноўваўся Кааба, а ў пантэоне бостваў найвышэйшым быў Алах. Такім чынам, Магамет узаконіў ужо існуючы культ: рытуалы і пілігрымкі, а з качэўнікаў яму ўдалося стварыць добра арганізаваны народ. Таму ён з'яўляецца заснавальнікам новай рэлігіі, але ўгрунтаванай на ўжо існуючых культах.

З самага пачатку можна заўважыць незвычайную экспансію ісламу: захоп Сірыі і Палестыны (634 – 640 гг.), узяцце Каіра (638 г.), атака Кабула (700 г.), заваёва Гібралтара і ўваход у Еўропу (711 г.), уваход у паўднё-



Паломнікі ў часе малітвы перад Кааба.

вую Францыю (714 г.). Толькі пераможная бітва пры Пуацье (732 г.) і перамога Карла Молата перагарадзілі ісламу шлях у Еўропу. Аднак у 1453 годзе была зававана Візантыя і чарговая атака на Еўропу распачалася з поўдня, праз Балканы. Гэтая атака была спынена Янам III Сабескім пад Венаю ў 1683 годзе. У нашым стагоддзі вызнаўцы ісламу адносна лёгка ўвайшлі на наш кантынент у выніку міграцыі — пошукаў месцаў працы і з палітычных прычынаў. У многіх краінах Заход-



Багата аздоблены экзэмпляр Карану (Кашмір, каля 1800 г.).

няй Еўропы ісламскія супольнасці даволі вялікія і ўплываюць на змены ў культуры (напрыклад, у Францыі, Германіі, краінах Бенілюкса).

Каран

Святая кніга ісламу — *Каран* (азначае «чытанне, дэкламаванне»). Для вызнаўцаў ісламу гэта слова самога Бога Алаха, прадыктаванае Магамету праз пасрэдніцтва арханёла Габрыэля. Змест Карану спачатку перадаваўся вусна, а пасля смерці Магамета ён быў кадыфікаваны халіфам Асманам. Каран напісаны на арабскай мове, складаецца са 114 раздзелаў, якія называюцца *сурамі*. Яго змест можна раздзяліць на чатыры тэмы:

— **Вераванні** — вучэнне, якое датычыць станоўчых якасцяў Бога, жыцця прарока, адказнасці чалавека за свае ўчынкі, апісання Апошняга суда, а таксама пекла і раю.

— **Культавыя інструкцыі** складаюцца з абавязкаў мусульманаў, так званых «пяці стаўпоў ісламскай рэлігіі»:

1) вера ў Алаха;

2) культавыя малітвы, якія прамаўляюцца пяць разоў на працягу дня з тварам, звернутым у напрамку Меккі, і ўдзел у набажэнстве ў мячэці;



Ерузалем. Мячэць Амара на Храмавай гары.

3) законная міласціна, заснаваная на прызначэнні часткі сваіх даходаў на карысць мусульманскай абшчыны;

4) пост у *Рамадане* ад усходу да захаду сонца, заснаваны на поўным адмаўленні ад ежы і напояў; вызваляюцца ад посту маці, якія чакаюць дзіця, старыя людзі, малыя дзеці, хворыя і падарожнікі;

5) пілігрымка ў Мекку.

— **Асабістая мараль** — збор правілаў, якія датычаць правоў і абавязкаў мужчынаў і жанчынаў, сямейных абавязкаў; у гэтым зборы падкрэсліваюцца цноты ветлівасці, гасціннасці, сціпласці, а таксама падаюцца наказы адмаўлення ад спажывання свініны і алкагольных напояў.

— **Юрыдычныя інструкцыі** — інструкцыі крымінальнага, грамадзянскага і міжнароднага права, а паколькі закон, альбо *шарыят*, боскага паходжання, то ён дасканалы для ўсіх людзей і народаў у кожным часе.

Іслам і хрысціянства

Стары Запавет і хрысціянства натхнілі Магамета. Відавочна, прарок пазнаёміўся з гэтымі рэлігіямі з вусных паданняў — пра гэта сведчаць шматлікія фрагменты Карану. Аднак трэба заўважыць, што часта біблійныя факты і асобы інтэрпрэтуюцца адвольна. Зразумела, што гэтыя прыклады выкарыстання Бібліі даюць надзею і магчымасці для дыялогу. Аднак існуюць істотныя адрозненні паміж хрысціянскаю рэлігіяй і ісламам. Іслам не ведае навукі пра адкупленне, бо Езус

У імя Бога, добрага і міласэрнага. Хвала няхай будзе Богу, Пану Сусвету, добраму і міласэрнаму — Таму, які ёсць Панам Дня Адплаты! Ушаноўваем Цябе і да Цябе звяртаемся, просячы Тваёй дапамогі. Вядзі нас добраю дарогаю, дарогаю тых, каго асабліва палюбіў, на каго не падае Твой гнеў, хто пазбег знішчэння.

Кажыце: «Верым у Бога, верым у аб'яўленне, якое было дадзена Абрагаму, Ізмаілу, Ісааку, Якубу і плямёнам, у аб'яўленне, якое было дадзена Майсею і Езусу, у аб'яўленне, якое Пан даў усім прарокам. Не лічым ніякага з іх лепшым за іншых і пакланяемся Пану» (пар. Сура II, в. 136).

О, людзі! Бойцеся вашага Успамажыцеля і Пана, які стварыў вас з аднаго чалавека, які стварыў яго спадарожніцу, што мае тую самую прыроду, і з іх дваіх, як з зерня, выйшлі незлічоныя людзі, мужчыны і жанчыны. Бойцеся Бога, праз якога дамагаецеся сваіх правоў, майце пашану да ўлоння, якое вас спарадзіла. Бо Бог спазірае на вас заўсёды (пар. Сура IV, в. 1).

Вы, тыя, што верыце! Калі праходзіце дарогамі свету, каб даваць сведчанне Богу, глядзіце, не кажыце нікому, хто вас вітае: «Ты не належыш да мноства веруючых». Не змагайцеся за прывідныя дарогі гэтага жыцця: толькі ў Бога прыбыткі і страты будуць звышшчодрыя. І вы таксама былі, як яны, пакуль Бог не даў вам ласкі, а таму будзьце чуйныя, бо Бог бачыць усё, што робіце (пар. Сура IV, в. 94).

Калі непрыяцель ваш шукае спакою, чыніце і вы гэтаксама ў адносінах да яго і давярайце Богу, бо ён ёсць Той, хто ўсё чуе і бачыць (пар. Сура VIII, в. 61).

Слугі міласэрнага Бога тыя, хто ідзе па зямлі ў пакоры. Калі той, хто нічога не ведае, звернецца да іх, яны адкажуць яму: «Супакой» (пар. Сура XXV, в. 63).

О людзі! Стварылі Мы вас з аднае пары, мужчыны і жанчыны, учынілі Мы, што сталі вы народамі і плямёнамі, каб вы зналіся паміж сабою, а не для таго, каб пагарджалі адны другімі. Сапраўды, большую пашану спазнае ў вачах Бога той з вас, хто больш справядлівы. Бог мае паўнату ведаў і ўсё ведае (пар. Сура XLIX, в. 13).

для мусульманаў з'яўляецца толькі чалавекам, прарокам і нават меншым за Магамета. На практыцы вызнаўцы гэтай рэлігіі ставяцца да хрысціянаў з вялікаю пагардаю.

II Ватыканскі Сабор, які інспіруе дыялог Касцёла са светам і ўсімі рэлігіямі, шукае таго, што нас яднае і збліжае. Таму падкрэлівае пазітыўныя моманты, адсоўваючы на другі план адрозненні. Ісламу адводзіцца месца ў Дагматычнай канстытуцыі пра Касцёл *Lumen gentium* (LG 16) і ў Дэкларацыі пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій *Nostra aetate* (NA 3). Прывядзём тут вельмі важны, другі фрагмент: «Касцёл з павагай ставіцца да мусульманаў, якія пакланяюцца адзінаму Богу, жывому і самаіснаму, міласэрнаму і ўсемагутнаму, Стварыцелю неба і зямлі, які размаўляў з людзьмі. Яны імкнуцца ўсёй душой падпарадкоўвацца Яго пастановам, нават патаемным, як падпарадкоўваўся Богу Абрагам, да якога ахвотна звяртаецца ісламская вера. Хоць яны не прызнаюць Езуса Богам, аднак ушаноўваюць Яго як прарока, ушаноўваюць таксама Яго Маці, Дзеву Марыю, а часам нават з пабожнасцю Яе заклікаюць. Акрамя гэтага, яны чакаюць Суднага дня, калі Бог будзе справядліва ўзнагароджваць усіх уваскрослых людзей. Таму яны цэняць маральнае жыццё і пакланяюцца Богу асабліва праз малітву, міласціну і пост» (NA 3).

Саборавы тэкст звяртаецца да асноваў ісламскай рэлігіі і смела апярэджвае фактычны стан дыялогу. На жаль, трэба адзначыць, што ён не толькі не быў належ-

ным чынам падхоплены ісламам, але Касцёл у ісламскіх краінах пераследуецца і церпіць. Гэтая сітуацыя яшчэ больш абвастрылася пасля падзеяў 2001 года, пасля замаху ў Нью-Ёрку.

Папа Ян Павел II нястомна заклікаў да дыялогу, асабліва ў перспектыве трэцяга тысячагоддзя. У *Tertio Millennio adveniente* (1994 г.) ён пісаў: «У гэтым дыялогу асабліва месца належыць габрэям і мусульманам. Няхай Бог дазволіць, каб для падтрымкі гэтых задумаў сталася магчымым арганізаваць *супольныя сустрэчы* ў тых месцах, якія маюць сімвалічнае значэнне для вялікіх монатэістычных рэлігій» (TMA 53). Праграма Папы — гэта разам з тым малітва аб тым, каб вера ў Адзінага Бога ўсё больш збліжала вызнаўцаў нашых вялікіх рэлігій. Тут неабходна прыгадаць пілігрымку Яна Паўла II у Палестынскую Аўтаномію і Сірыю (2000 г.), калі ён наведаў мячэць Амайадаў у Дамаску, а таксама візіт Бэнэдыкта XVI у Стамбул (2006 г.) і сустрэчу з прадстаўнікамі ісламу ў Блакітнай мячэці.

Літаратура

Bogucka E., *Islam*, „Misyjne drogi" 1985, 3, z. 1, s. 14–19.

Bukowski K., *Współczesne religie a chrześcijaństwo*, Kraków 1986.

Dajczer T., *Mistyka Al-Halladża w perspektywie dialogu Kościoła z islamem*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1982, 4, s. 228–247.

Henninger J., *Dialog chrześcijańsko-islamski po Soborze Watykańskim II*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1982, 4, s. 200–215.

Henninger J., *Maryja w islame*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1982, 4, s. 216–227.

Kapuścik F. Z., *Drogi ekspansji islamu w Afryce*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1979, 2, cz. 2, s. 178–188.

Kościelniak K., *XX wieków chrześcijaństwa w kulturze arabskiej*, Kraków 2000.

Kurek A., *Dialog z islamem*, „Misyjne drogi" 1985, 1, s. 24–29.

Pawłowicz Z., *Człowiek a religia*, Gdańsk 1986.

Pięć wielkich religii świata, red. E. Brunner-Traut, Warszawa 1986.

Sakowicz E., *Religioznawstwo. Przewodnik tematyczny*, Lublin 2005.

Siwek P., *Wieczory paryskie*, Londyn 1965.

Skowronek A., *Muzułmanie i chrześcijanie — partnerzy dialogu*, „Studia Theologica Varsaviensia" 1987, 25, nr. 2, s. 47–64.

Werbiści a badania religiologiczne, red. A. Wąs, Warszawa 2005.

Індуізм




Выява гука «Ом» — самага святога гука ў індуізме.

Вялікаю рэлігіяй індыйскага субкантынента з'яўляецца індуізм. Гэту рэлігію складае комплекс вераванняў, супольнаю асновою якіх з'яўляецца прызнанне святымі кнігамі *Ведаў*, і сістэма кастаў, якая ў мінулым вельмі моцна падкрэслівалася. Практычна індуізм пры ўмове існавання кастаў магчымы толькі ў Індыі.

Гісторыя

Індуізм зарадзіўся на індыйскім паўвостраве, і там жыве большасць яго вызнаўцаў. Такім чынам, гэта нацыянальная рэлігія. Пачаткі індуізму сягаюць у трэцяе тысячагоддзе да Н. Х., калі на гэтых тэрыторыях існавала рэлігія з політэістычнымі рысамі. У гісторыі індуізму можна вылучыць наступныя этапы.

Веданта (каля 1500 — 1000 гг. да Н. Х.) — менавіта гэты перыяд пазначаны політэізмам, а ахвяры з раслінаў складаліся бацькам сям'і. Арыйскія плямёны заваявалі сабе тэрыторыю, насаджаючы сваю мову, якая захавалася як сакральная: санскрыт. На гэтай мове былі запі-



Старонка манускрыпта старажытнай «Рыгведы».

саны гімны *«Рыгведы»*, скіраваныя да бостваў Агні, Індра, Варні. Пісанні, якія ўзніклі ў той час, складалі найстаражытнейшы збор святых кніг індуізму: Веды.

Другі этап развіцця індуізму — гэта **брахманізм** (каля 1000 – 800 гг. да Н. Х.). Паступова рытуал усё больш пашыраўся і ў сувязі з гэтым спакваля ўтвараўся падзел на касты, найвышэйшая з якіх — каста святароў, *бра́хманаў*. Назва перыяду, як і святарскай касты, паходзіць ад найвышэйшага Бога *Брахма́на*, які лічыўся асновай свету і спрадвечнага права — *санатана дхарма*.


У 10-й кнізе «Рыгведы» мы знаходзім апісанне стварэння свету: ён узнік з ахвяры, якою стала самаспаленне першага чалавека *Пурушы*. Пазнейшыя ахвяры з'яўляюцца паўторам гэтага акту і падтрымліваюць існаванне свету. Бра́хман, складаючы ахвяру, падтрымлівае існаванне свету і можа выпрасіць розныя ласкі — здароўе ці дабрабыт.



Ілюстрацыя, на якой паказана бітва на Курукшэтры, апісаная ў «Махабхараце».

Чарговы перыяд (каля 800 — 500 да Н.Х.) — гэта **фармаванне індуізму**. У гэты перыяд канчаткова сфармавалася класічная мова — санскрыт. Асноўныя творы гэтага часу — *«Упанішады»*. У гэтых кнігах разглядаецца філасофская і містычная праблематыка, а таксама падаюцца медытатыўныя прыёмы. У гэты час узніклі дзве значныя філасофскія сістэмы: *санх'я* і *ёга*. Новую якасць набывае паняцце *Брахма́на*, які з гэтага часу лічыцца ўсёпранікальнаю касмічнаю сілаю і становіцца мэтаю філасофскага пазнання.


Вельмі цікавы чарговы этап развіцця індуізму, а метавіта **бхактызм**. Гэты этап супадае з часам прыходу на свет Езуса Хрыста і фармаваннем новай рэлігіі — хрысціянства. У тых зменах, якія наступілі ў індуізме, многія тэолагі бачаць след аб'яўлення Бога, які ў Езусе Хрысце збавіць кожнага чалавека. Менавіта бхактызм з'яўляецца народнаю формаю гэтай рэлігіі, даступнай для ўсіх, а характэрная яе рыса — любоў. Узнікаюць



Рытуальныя пляцоўкі для амавення на рацэ Ганг.

таксама цудоўныя творы, паэма *«Махабхарата»* з легендамі, павучаннямі, разважаннямі, каралеўскімі радаводамі і апісаннямі барацьбы паміж родамі, а таксама *«Рамаяна»*, дзе апісваецца гісторыя Рамы, які з'яўляецца так званым *аватáрам*, гэта значыць, як бы ўцелаўлёным боствам на падабенства ўцелаўлення Вішну. Боствы Рама і Шыва з'яўляюцца прыкладамі вернасці і любові.


Калі вярнуцца яшчэ да першай паэмы, да «Махабхараты», то найбольш шанаванаю і разам з тым вядомаю яе часткаю з'яўляецца *«Бхагавад-гіта»*, альбо «Спеў на хвалу Пана» ці «Гімн на ўшанаванне Найвышэйшага». У гэтым творы Вішну аб'яўляецца як боства, якое любіць чалавека, таму адказам павінна быць поўнае адданне сябе боству. Таксама вельмі цікавая ідэя



Святая гара Кайлаш у Тыбеце,
якая лічыцца духоўным прыстанкам Шывы.

гэтага перыяду — так званая «індуская тройца» («трымурці»): Брахма — увасабленне сілаў, якія ствараюць свет; Вішну — той, які трымае свет; Шыва — увасабленне знішчальных сілаў.

Чарговы этап у гісторыі індуізму на пераломе XVIII і XIX стагоддзяў — **сучасны індуізм**. У гэты перыяд Індыя адкрылася для еўрапейскай культуры і адначасова ў краіне ўзрасла зацікаўленасць хрысціянствам. З'явіліся мысляры, якія прагнулі адраджэння індуізму пасля даволі доўгага перыяду рэлігійнага застою. Часта індусы павышалі сваю адукацыю ў Еўропе. Гэты перыяд характарызуецца як вяртаннем да артадаксальнасці, так і зацікаўленасцю іншымі рэлігіямі, у тым ліку і хрысціянствам. Заснавальнікам новага кірунку лічыцца Рам Мохан Рой (1774—1833 гг.). Асаблівым аўтарытэтам



Індуісцкі абрад амавення кветкавымі пялёсткамі.

надалей карыстаецца вялікі мысляр, рэлігійны і грамадскі рэфарматар, палітык, творца незалежнай Індыі Махандас Карамчанд Гандзі (1869 – 1948 гг.).

Іншым вялікім мысляром быў Рабіндранат Тагор (1861 – 1941 гг.), філосаф, музыкант, паэт, педагог. Тагор быў пантэістам, які вучыў, што паміж Богам і чалавекам няма ніякай мяжы.

Названыя тут асноўныя прадстаўнікі індуізму, таксама і многія іншыя, часта падарожнічалі па Еўропе і знаёміліся з хрысціянствам. Менавіта дзякуючы гэтаму іх вучэнне спрыяе і сёння дыялогу паміж рэлігіямі.

Святыя кнігі

Святымі кнігамі індуізму лічацца *Веды*. Для таго, каб дадзенае вераванне было залічана да індуізму, неабходна прызнаць гэтыя кнігі сакральнымі. Само сло-


ва «веда» азначае рэлігійныя веды. Гэты збор твораў, напісаны на санскрыце, быў адрэдагаваны каля 600 года да Н. Х. Ён складаецца з чатырох кнігаў: «Рыгведа» (збор 1028 гімнаў да багоў), «Самаведа» (збор абрадавых песняў), «Яджурведа» (збор ахвярных формулаў) і «Ахтарваведа» (збор магічных закляццяў). Каментарамі да Ведаў служаць *«Брахманы»* (абрадавыя тэксты) і *«Упанішады»* (філасофскія трактаты).

Касты

Яшчэ адзін важны элемент індуізму — сістэма кастаў. Каста — гэта замкнутая грамадская група, прыналежнасць да якой вызначаецца фактам нараджэння ў ёй. У індуізме гэты факт узмацняецца рэлігійнай пераканасцю ў тым, што людское жыццё складаецца з бясконцага шэрагу існаванняў. Паводле індуізму, чалавек нараджаецца ў той ці іншай касце ў выніку яго па-



Выява Крышны, які ўзнімае пагорак Гавардхана (барэльеф VII ст.).



Галоўны будынак аднаго з самых вялікіх індуісцкіх храмаў у свеце ў Ціруваннамалай.

пярэдняга жыцця, якое пастаянна змяняецца, бо душы ўвесь час вандруюць. Каб зноў адрадзіцца ў вышэйшай касце, трэба добра выконваць надзённыя абавязкі. У індускім грамадстве існуюць чатыры касты, у межах якіх функцыянуюць каля 2000 падкастаў. Вось гэтыя чатыры касты:

Бра́хманы: найвышэйшая каста, святары, прызначаныя Брахма́нам гаспадарамі свету, ім належыць складанне ахвяраў, якія падтрымліваюць існаванне свету.

Кшатры: ваяры, шляхта, сённяшнія чыноўнікі.

Вайшы: купцы, сяляне, пастухі, рамеснікі.

Шудры: каста слугаў і нявольнікаў.

Няхай Бог нам дапамагае, няхай нас корміць, каб мы маглі з усяе сілы працаваць разам. Каб нашыя пошукі былі плённыя, каб мы маглі любіць адзін аднаго і жыць у супакоі.

Супакой, супакой, супакой усім. Будзьце разам. У тым, што гаворыце, хай будзе гармонія, хай будзе сярод вас адно зразуменне. Еднасць знаходзім у малітве. Няхай будзе агульнаю мэта нашай супольнасці, агульныя рашэнні, агульныя пастановы. Няхай ажыўляюць нас тыя самыя пачуцці да бліжніх. Няхай яднаюцца сэрцы, няхай будуць агульнымі нашыя інтэнцыі. Будзьма дасканала з'яднаныя дзеля супакою.

Супакой, супакой, супакой усім. Божа, вядзі нас ад ілюзій да рэчаіснасці. Божа, вядзі нас з цемры да святла. Божа, вядзі нас ад смерці да бяссмерця.

Супакой, супакой, супакой усім. Молім аб супакоі ў небе; супакой у небе і на зямлі, супакой у глыбінях мора, супакой сярод раслінаў і траваў, супакой ва ўсім, што Божае, супакой кожнаму стварэнню.

Супакой, супакой, супакой усім. Пацвердзім нашу супольную веру пабудоваю справядлівасці і супакою, актыўнасцю ў гэтым усіх рэлігій свету.

Мы, сабраныя тут прадстаўнікі розных рэлігій, будзем прасіць Бога, каб праз наш агульны ўдзел Ён учыніў так, што запануе справядлівасць у адносінах чалавека да чалавека. Будзем таксама маліцца аб любові і супакоі паміж усімі народамі.

Гімн Веды

Няхай усемагутны Бог, Прыяцель усіх людзей, будзе для нас крыніцаю супакою. Няхай супакоем адорыць нас Боскі Суддзя. Даўцам нашага супакою няхай будзе Той, Хто ўсім кіруе. Пан усіх магуцяў і багацяў, уладар вялікіх быццяў, няхай будзе для нас крыніцаю супакою. Няхай усюдыісны Бог, які нікога не баіцца, адорвае нас супакоем.


Учыні, о Пане, Божа усемагутны, няхай супакой панує на зямлі, няхай сцішацца воды, няхай зёлкі даюць здароўе, дрэвы і расліны няхай усіх адорваюць супакоем. Супакой няхай нам усім звястуюць дабрачынныя існасці. Твой Ведыйскі закон няхай прывівае супакой ва ўсім свеце. Усе рэчы няхай стануць крыніцаю супакою для нас. Твой супакой няхай сыдзе на ўсіх, Твой супакой няхай прыйдзе да мяне.

Астатняе грамадства — гэта так званыя *парыі*, бескаставае насельніцтва, практычна пазбаўленае ўсялякіх правоў. Гэта даволі значная колькасць насельніцтва. Толькі члены трох вышэйшых кастаў могуць практыкаваць аскезу на чатырох этапах жыцця: вучобы, бацькі сям'і, вандроўнага аскета і ляснога аскета. Хоць заканадаўства Індыі ў 1950 годзе ліквідавала каставую сістэму, аднак у свядомасці вялікай часткі грамадства яна паранейшаму функцыянуе. Каля 70% жыхароў гэтай краіны лічаць сістэму абавязковаю, застаючыся тым самым вернымі рэлігійным традыцыям, неад'емным элементам якіх яны з'яўляюцца.

«Збаўленне»

Галоўнае пытанне рэлігіі — збаўленне. Аднак гэтае паняцце цяжка аднесці да індуізму, таму правільней будзе казаць пра «вызваленне» з вечнай трансміграцыі (вандроўкі душаў). З гэтым цесна звязана вучэнне аб рэінкарнацыі, альбо аб паўторным нараджэнні. Хто ў папярэднім уцелаўленні жыў добра, той можа адрадзіцца ў вышэйшай касце, а хто жыў дрэнна, народзіцца ў ніжэйшай касце альбо жывёлаю. З гэтымі вераваннямі звязаны прынцып вегетарыянства, які забараняе есці мяса, бо жывёла можа быць формаю рэінкарнацыі чалавека. Менавіта гэтая вандроўка душаў з'яўляецца прычынаю цярпення. Шлях да вызвалення з гэтага цярпення вядзе праз:

— **медытацыі**, падчас якіх індус адкрывае сваю ідэнтычнасць з Брахма́нам і «паглынаецца» ім;



«Поза лотаса» — галоўная асана ёгі.

— **аскезу**, дзе на першы план выходзіць *ёга* — сістэма, паводле якой чалавек імкнецца дасягнуць вызвалення ўласным намаганнем праз практыкаванні; так званая «каралеўская ёга» складаецца з васьмі ступеняў:

• *яма* — адмаўленне ад насілля, крадзежу, сексуальных кантактаў;

• *ніяма* — патрабаванне фізіялагічнай чыстасці цела, добрага настрою, прымання ўсіх жыццёвых цяжкасцяў;

• *асана* — панаванне над сваім целам; ёг здольны гадзінамі стаяць нерухома, напрыклад, на адной назе;

• *пранаяма* — кантроль над дыханнем, дзякуючы якому ёг можа доўгі час не дыхаць;

• *пратыяхара* — вызваленне ад пачуццёвых імпульсаў: вядомыя выступленні ёгаў з агнём альбо дэманстрацыя здольнасці «спаць» на цвіках;

• *дхарана* — канцэнтрацыя;

• *дхіяма* — медытацыя як самамэта;

• *самадхі* — ператварэнне ў тое, над чым медытуе.

Апошнія тры этапы незаўважныя для таго, хто назірае за ёгам. Гэтыя этапы праходзяць вельмі хутка, без выразнай размежаванасці. Ёг дасягае нірваны, альбо вызвалення, а яго цела вучні спальваюць на вогнішчы.

Трэці шлях — **любоў**, заснаваная на паяднанні з боствам.

Літаратура

Bogucka E., *Hinduizm*, „Misyjne drogi" 1985, 3, z. 2, s. 43–47.

Bukowski K., *Współczesne religie a chrześcijaństwo*, Kraków 1986.

Byrski K. M., *Mentalność indyjska a mentalność europejska*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1979, 2, cz. 2, s. 137–146.

Dajczer T., *Religie niechrześcijańskie a chrześcijaństwo*, „Collectanea Theologica" 1983, 53, s. 150–152.

Griffiths B., *Powrót do środka*, Warszawa 1985.

Kloster-Maier K., *Sadhana. Zarys duchowości hinduskiej*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1982, 4, s. 116–133.

Le Saux H., Monchanin J., *Benedyktyński aśram*, Kraków 1986.

Pawlik M., *Hinduizm — chrześcijaństwo. Akomodacja poglądów religijnych*, Warszawa 1986.

Pięć wielkich religii świata, red. E. Brunner-Traut, Warszawa 1986.

Будызм




Монскае кола дхармы — сімвал будыйскага закону (VII ст.).

Адной з найбольш распаўсюджаных рэлігійных сістэмаў у Азіі з'яўляецца будызм. Тут было свядома ўжыта азначэнне «рэлігійная сістэма», бо ў гэтым выпадку цяжка казаць пра рэлігію. Некаторыя групы будыстаў увогуле не залічваюць будызм да катэгорыі рэлігіі. Зрэшты, на гэта звяртае ўвагу таксама Папа Ян Павел II*. У гэтай кнізе мы разглядаем тэму будызму толькі таму, што ён усюды лічыцца рэлігіяй.

Буда

Заснавальнік будызму, Сіддхарта Гаутама (альбо Гатама), сын караля невялікай дзяржавы на індыйска-непальскай мяжы, нарадзіўся каля 560 года да Н. Х. Яго жыццё ахутана легендаю. На працягу дваццаці дзевяці гадоў юнак жыў пры бацькоўскім двары ў раскошы. Ён

* *Пераступіць парог надзеі*, с. 71 — 74.



Сутры Махаяны (Тыбет, VII ст.).

вельмі рана ажаніўся са стрыечнаю сястрою, якая нарадзіла яму сына.

Легенда кажа, што аднойчы, шпацыруючы па-за палацам, Гаутама ўбачыў спачатку старца, пасля хворага, затым аскета і нябожчыка. Гэтыя вобразы яго вельмі ўразілі, схілілі да развагі над жыццём і яго мізэрнасцю. У выніку роздуму Гаутама прыйшоў да высновы, што ўсё, што чалавек перажывае, — гэта цярпенне. Ён вырашыў пакінуць дом, сям'ю і пачаў весці жыццё пустэльніка. Згаданыя сустрэчы, як і звязанае з імі рашэнне весці жыццё пустэльніка, сталі пачаткам яго «вызвалення» са стану цярпення (аднак тут нельга гаварыць пра навяртанне). Такім чынам, ён стаў «абуджаным», альбо «Будам». Слова «будызм», якое адсюль паходзіць, на санскрыце азначае «той, хто спазнаў асвячэнне».



Статуя Буды (Тайланд).

Вось чатыры высакародныя праўды пра цярпенне, спазнаныя, а пасля сфармуляваныя Будам:

— «Праўда пра існаванне цярпення»: кожнае існаванне з увагі на сваю зменлівасць — гэта цярпенне.

— «Праўда пра ўзнікненне цярпення»: кожнае жаданне (таксама існавання альбо неіснавання) з'яўляецца крыніцаю цярпення.

— «Праўда пра пазбаўленне ад цярпення»: яна дасягаецца ўтаймаваннем усялякіх пажадлівасцяў і жаданняў (таксама і жадання жыць).

— «Праўда пра шлях, які вядзе да ліквідацыі цярпення». Гэта праўда інакш называецца «васьмярычным шляхам», альбо васьмю шляхетнымі парадамі: правільная вера, правільная пастанова, правільная мова, правільнае дзеянне, правільны стыль жыцця, правільнае памкненне, правільная засяроджанасць, правільная медытацыя. Гэты шлях вядзе кожнага да вызвалення ад усялякіх матэрыяльных повязяў, да згасання пачуццё-



Алтар у будысцкім храме.

васці, да дасягнення нічым не замутнёнага стану шчаслівага супакою, гэта значыць, да *нірваны*.

Вучэнне Буды хутка пашыралася. З першага слыннага «казання», якое пазней называлі «казаннем пра тое, як прывесці ў дзеянне кола Закону», узнікла першая супольнасць манахаў, а пасля знайшлося шмат свецкіх паслядоўнікаў. Паволі пачала збірацца таксама група жанчынаў. На працягу сарака гадоў Буда абвяшчаў сваё вучэнне, а апошнія гады правёў у кляштары ў Сравасці. Незадоўга да смерці ён разам з манахамі выправіўся ў напрамку Кушынагара. Ён памёр недалёка ад гэтых мясцінаў, над ракою Гіраньянваці, пасля абвяшчэння казання (каля 480 г. да Н. Х.). Пахавальная цырымонія працягвалася сем дзён. Цела, загорнутае ў палотны, пакропленае духмянымі алеямі, было спалена, а прах падзелены паміж дзевяццю каралеўствамі, у якіх Буда абвяшчаў сваё вучэнне. Урны з прахам у фор-



Мандала — сакральны сімвал, які выкарыстоўваецца пры медытацыях у будызме; інтэрпрэтуецца як мадэль сусвету.


ме купала, так званыя *ступы*, альбо *дагабы*, сталі элементам найважнейшых будыйскіх святыняў.

Будыйская дактрына

Буда з'яўляецца не толькі заснавальнікам новай рэлігіі, але найперш рэфарматарам брахманізму (пар. індуізм). Ён стварыў рэлігію, у якой няма багоў і складання ахвяраў, а таму непатрэбныя святары. Буда паказаў самастойны шлях да дасягнення дасканаласці і вызвалення. Такім чынам узнікла магчымасць для ўсіх людзей простым спосабам практыкаваць рэлігію. Буда не запісаў свайго вучэння. Гэта зрабілі ўжо яго вучні, якія сабралі вучэнне ў так званыя *пітакі*. Збор, які цалкам захаваўся да сённяшняга дня, — гэта напісаны на мове палі канон школы тхэравадзінаў, у які ўваходзяць:

Віная-пітака — статуты манаскага жыцця;

Сутта-пітака — кароткія прыпавесці;



Будысцкі манастыр у Дарджылінгу (Індыя).


Абідхарма-пітака — тэалагічныя трактаты.

Да істотных элементаў гэтай рэлігійнай сістэмы належаць: сама асоба Буды, яго вучэнне, альбо закон *дхарма*, і супольнасць манахаў *сангха*. Усё вучэнне зводзіцца да праблемы цярпення, яго прычынаў, а таксама поўнага вызвалення ад цярпення, альбо дасягнення стану *нірваны*. Рэкамендуюцца такія сродкі, як пазнанне свайго стану, медытацыя і асабістая дасканаласць.

Будыйскія школы

Будызм — гэта не маналітная сістэма. Адвольная інтэрпрэтацыя словаў Буды прывяла да ўзнікнення шматлікіх кірункаў. На практыцы жыццё звязана з адною са школаў.

Хінаяна, гэтак званая «малая калясніца», азначае эксклюзіўны шлях альбо малы метад, які лічыцца пер-



Рытуал збору будысцкімі манахамі ранішняй міласціны.

шапачатковаю і найбольш артадаксальнаю формаю будызму. Яна развівалася галоўным чынам у кляштарах, дзе былі найбольш зручныя ўмовы для выканання галоўных патрабаванняў школы, а менавіта для таго, каб кожны клапаціўся аб сваім вызваленні. Дактрына гэтай школы, угрунтаваная на ўжо згаданых *пітаках*, распаўсюджана галоўным чынам на поўдні Азіі (Бірма, Камбоджа, Лаос, Шры-Ланка, Тайланд).

Махаяна, гэтак званая «вялікая калясніца», дае магчымасць вызвалення ўсім пры дапамозе іншага чалавека. Характэрная рыса гэтай школы — адкрытасць на другога чалавека, спачуванне, жаданне дапамагчы. Гэтая школа таксама вылучаецца містычнымі адносінамі да рэчаіснасці, якія адмаўляюць выразны падзел паміж трансцэндэнтным і зямным. Школа называецца паўночнаю з прычыны свайго распаўсюджання

(Кітай, Карэя, Японія, Манголія, Непал, Тыбет, Паўночная Індыя).

Тантрызм — гэтак званая «дыяментавая каляснiца», з'яўляецца своеасаблівым паяднаннем прынцыпаў хінаяны і махаяны. Сродкі, што вядуць да мэты, гэта значыць да вызвалення, — магічныя формулы, якія часта паўтараюцца і называюцца *мантрамі*, а таксама метапсіхічныя практыкаванні пад кіраўніцтвам настаўніка, альбо *ламы*. Гэты кірунак, які часта называюць ламаізмам, сустракаецца ў Тыбеце і Манголіі.

Зэн — гэта спецыфічная практыка медытацыі, якая ўзнікла ў Кітаі. Складовыя часткі медытацыі — моцная вера, пачуццё моцнага сумніву, стан інтэнсіўнай дапытлівасці адносна самога сябе і моцная рашучасць, скіраваная на вырашэнне сумненняў. Паводле гэтай практыкі, жыццю чалавека спадарожнічаюць чатыры цярпенні: нараджэнне, старэнне, хвароба і смерць, а таму жыць — гэта значыць цярпець. Прапанаваная кантэмпляцыя ў позе «кветка лотасу» — гэта практыкаванне, якое дазваляе чалавеку прыняць існуючыя рэаліі і адкрыцца на жыццё ўсёю паўнатою свае чалавечнасці.

Будызм і хрысціянства

Асноўнаю праблемаю ва ўспрыманні будызму з'яўляецца пастаўленае раней пытанне: будызм — гэта рэлігія альбо толькі філасофія жыцця, школа аскезы? Сам Буда на гэтую тэму не выказваўся і пазбягаў таксама выказванняў на тэму Бога. Большасць будыстаў прызнае богам менавіта яго. У дыялогу з будыстамі падкрэс-

ліваюцца такія аспекты як этыка, пашана да жыцця, імкненне да міру.

Аднак існуе важная розніца паміж будызмам і хрысціянствам. Хрысціянства — гэта рэлігія, аб'яўленая Богам, а канчатковая мэта, якую яна паказвае, — гэта ўдзел у жыцці самога Бога. Такую канцэпцыю будызм адкідвае: там няма гаворкі пра асабовага Бога, які аб'яўляецца чалавеку, там няма веры, а нірвана — гэта не дар, а вынік суровай аскезы, там адсутнічае малітва, бо на справе Бог застаецца толькі ідэалам і тэорыяй. У хрысціянстве чалавек — гэта істота, створаная Богам па Яго вобразе (пар. Быц 1, 26), адораная несмяротнаю душою, чалавек з'яўляецца «панам стварэння», прызначаным для вечнага шчасця. У будызме асоба чалавека — гэта дух і матэрыя, якія пастаянна змяняюцца. Не існуе ані ўласнага «я», ані душы. Існуе толькі пачуццёвае ўспрыняцце, якое, гэтаксама як і акты волі і пазнання, з'яўляецца толькі ілюзіяй.

Урэшце, для хрысціяніна людское цярпенне — гэта вынік граху, але яно мае збаўчую каштоўнасць. У будызме ж цярпенне ўвогуле не мае сэнсу, а вызваленне заключаецца ў знішчэнні сябе.

Напрыканцы ўзнікае пытанне: чаму ў наш час гэтаю сістэмаю зацікавіліся ў Еўропе?

На жаль, многія людзі «Захаду» пошукамі ўсходніх медытатыўных практыкаў імкнуцца замяніць пустку, якая ўтварылася пасля страты сапраўднай веры. Чалавек пачатку XXI стагоддзя занадта ганарлівы, каб прыняць усё Евангелле, прыняць той факт, што збаўленне

Няхай усё, што жыве, праз намаганне, прыкладзенае дзеля таго, каб выйсці на шляхі святла, выйдзе на гэтыя шляхі.

Няхай кожнае быццё, дзе б яно ні было, якое цярпіць цялесна альбо духоўна, акунецца, дзякуючы маім заслугам, у акіян шчасця.

Паколькі дасюль працягваюцца цыклы іх існавання, няхай іх зямное шчасце ніколі не памяншаецца, няхай бесперапынна атуляюць іх хвалі шчасця Бадхісатвы.

Няхай тыя, што аслаблі з холаду, сагрэюцца; няхай тыя, каму дакучае сквар, спазнаюць прахалоду ў бясконцых водах, якія пастаянна сплываюць з вялікай хмары заслугаў Бадхісатвы.

Няхай ніякі звер не баіцца, што будзе з'едзены іншым; згаладнелыя духі няхай будуць шчаслівыя, як людзі з Паўночнага Кантынента. Сляпыя няхай убачаць формы; глухія няхай пачуюць гукі, а кожная цяжарная жанчына няхай так, як Мэйа Дэві, народзіць сваё дзіця без болю.

Голы няхай знойдзе адзенне, галодны — ежу, чалавек у роспачы няхай зноў адшукае надзею, поспех і пастаяннае шчасце.

Няхай усе цярпячыя і хворыя будуць аздароўленыя і вызваленыя ад цярпення, і няхай не будзе на свеце ўжо больш хваробаў.

Няхай баязлівы вызваліцца ад страху; вязні няхай атрымаюць свабоду, бяссільныя — сілу, і няхай усюды людскія думкі будуць прыязнымі.

Няхай вандроўнікі ўсюды, куды трапяць, знаходзяць шчасце, няхай без намаганняў выканаюць задуманае. Няхай тыя, што плывуць морам, дасягнуць свае мэты, а пасля, шчасліва вярнуўшыся дадому, няхай радуюцца са сваімі блізкімі.

Вандроўнікі, ахопленыя жахам, што заблудзілі, няхай сустрэнуць спадарожніка і без страху перад разбойнікамі паспяхова закончаць сваё падарожжа.

Няхай тых, хто апынецца на страшных бездарожжах пустыні, дзяцей, старых, пакінутых, перапалоханых і душэўна хворых атуляць сваёю апекаю нябесныя абаронцы.

Усе людзі няхай будуць вольныя ад прагі дабрабыту, няхай без спрэчак і ўзаемных крыўдаў заўсёды радуюцца так, як таго жадаюць.

Няхай кожнае ўцелаўлёнае стварэнне нястомна ўслухоўваецца ў гук Дхармы, які сплывае да яго ад птушак на дрэвах, ад промняў святла і з усяе прасторы.

Сілы нябесныя няхай спасылаюць дождж тады, калі ён патрэбны, каб шчодрыя былі ўраджаі. Няхай кіраўнікі заўсёды паводзяць сябе згодна з Дхармай, а ўсім людзям на зямлі спадарожнічае ўдача.

Няхай ніякае стварэнне ўжо больш не цярпіць, не робіць зла і не хварэе, і няхай ніколі больш не баіцца; няхай ужо ніхто ніколі не будзе прыніжаны і ўсе няхай будуць вольныя ад прыгнечанасці.

Няхай стварэнні ўжо ніколі не будуць падпарадкаваныя ўладзе ніжэйшых сілаў і ўсім заўсёды няхай усяго хапае. Няхай яны ў фізічнай форме, вышэйшай за багоў, змогуць тут жа асягнуць стан будызму.

І пакуль будзе існаваць прастора, пакуль будзе існаваць жыццё, датуль я буду змагацца з бедамі гэтага свету.

Няхай усе цярпенні жывых стварэнняў маюць свой дом толькі ўва мне, і дзякуючы сіле Бадхісатвы няхай усе спазнаюць шчасце.

было яму падаравана — **я** павінен гэта зрабіць! Ян Павел II каментуе гэта наступным чынам: «Гэта толькі новы метад практыкавання гнастыцызму, а значыць такой паставы духу, якая ў імя глыбокага пазнання Бога адкідае Яго Слова, замяняючы яго тым, што выдумаў сам чалавек»*. Чалавеку лягчэй прыняць экзатычныя звычаі і рытуалы, чым Евангелле, якое заклікае да навяртання.

Літаратура

Bogucka E., *Buddyzm*, „Misyjne drogi" 1984, 2, z. 4, s. 30–33.

Budda, Encyklopedia katolicka, t. 2, Lublin 1976, kol. 1155–1157.

Buddyzm, Encyklopedia katolicka, t. 2, Lublin 1976, kol. 1160–1171.

Bukowski K., *Współczesne religie a chrześcijaństwo*, Kraków 1986.

Pawlik M. Z., *Buddyzm w spotkaniu z Objawieniem Bożym*, Warszawa 1987.

Pawłowicz Z., *Chłowiek a religia*, Gdańsk 1986.

Zimoń H., *Buddyzm. Kalendarz Słowa Bożego*, Pieniężno 1987.

* *Пераступіць парог надзеі*, с. 74.

Шынтаізм



Рытуальныя вароты (торыі) шынтаісцкай святыні на востраве Іцукусіма.

Шынтаізм — гэта традыцыйная рэлігія Японіі, вельмі цесна звязаная і пераплеценая з гісторыяй «краіны квітнеючай вішні». Таму, вывучаючы гісторыю Японіі, мы адначасова вывучаем гісторыю гэтай рэлігіі. Хоць шынтаізм адносіцца да класічнага рэлігіязнаўства, аднак вельмі цяжка даць інтэрпрэтацыю гэтай рэлігіі. Часцей за ўсё яна ўспрымаецца як японская культура, стыль жыцця альбо нацыянальны дух. Само слова «шынто», альбо «сінто», азначае шлях, які вядзе да Бога, спосаб хаджэння такім шляхам, якім ходзяць багі.

Гісторыя

Першы перыяд развіцця гэтай рэлігіі — так званы першасны шынтаізм (прыблізна да 400 г. пасля Н. Х.). З яго вераваннямі можна пазнаёміцца на падставе раскопак, асабліва — знойдзеных фігурак, якія ўвасабляюць багіню пладавітасці, і фігурак жывёлаў. Гэтыя прад-



Ясукуні — шынтаісцкая святыня ў Токіо.

меты ўказваюць на месца, дзе былі могільнікі, бо нябожчыкам у труну клалі не толькі ежу, але і розныя прадметы, што сведчыць пра веру ў замагільнае жыццё. Іншы след культу — накладанне на галаву памерлым керамічнага посуду альбо пахаванне нябожчыкаў з падкурчанымі нагамі.

Каля I стагоддзя пасля Н. Х. распачалося ўзвядзенне святыняў, прысвечаных багіні Аматэрасу (багіні сонца) і богу Сусаноо (богу буры). Ад гэтых багоў бярэ пачатак цэлы пантэон японскіх бостваў, а ад Аматэрасу паходзіць імператар.

Пералом у японскай рэлігіі настаў у выніку кантактаў з Карэяй і Кітаем. У 402 годзе да Японіі дайшлі кітайскія кнігі «Дыялогі Канфуцыя» і «Тысяча павучанняў».



Свята мацуры ў горадзе Асака.

Уплыў кітайскай думкі быў вельмі вялікі, бо датычыў усіх сфераў жыцця. Кітайскія мудрацы прыўнеслі ў шынтаізм найперш новыя этычныя погляды, якія закраналі сувязі паміж уладарамі і падначаленымі, а таксама датычылі сямейнага жыцця. Гэтыя прынцыпы, угрунтаваныя на дуалістычнай даоскай школе «ін-ян», увялі новую мадэль японскага жыцця.

У 552 годзе Японія праз Карэю сутыкнулася з будызмам *махаяны*, які абвяшчаў збаўленне, а дакладней, вызваленне ўсіх, хто жыве ў супольнасці. Было пабудавана шмат будыйскіх святыняў. Гэта быў перыяд будаізацыі шынтаізму. З будызму таксама быў пераняты звычай крэмацыі астанкаў і ўведзена свята памерлых — *урабон*.

У перыяд Нара (710 — 794 гг.) настаў працэс яшчэ большага ўзаемапранікнення культураў і рэлігій. У храме «Вялікая святыня Усходу» быў змешчаны помнік Буду, узніклі шматлікія будыйскія школы.

У 712 годзе з'явілася святая кніга шынтаізму *«Кадзікі»* — «Запісы старадаўніх справаў».

З XII стагоддзя ў гэтай рэлігіі з'яўляецца новы кірунак, заснаваны на спрашчэнні рэлігійных практыкаў. Дастаткова было паўтараць: «Хвала табе, Будзе Амідзе». Таксама вельмі шырока распаўсюдзілася медытацыя *зэн*.

Пасля перыядаў шматлікіх цярпенняў, з XVIII стагоддзя, пачалося абвяшчэнне абавязковага вяртання да крыніцаў шынто. У гэты перыяд да ўлады прыходзяць сёгуны — военачальнікі. Умацавалася думка пра моцную, незалежную культуру, якой не патрэбныя іншыя рэлігіі. Трэба таксама адзначыць, што на стыку гэтых пераменаў узніклі шматлікія секты.

Перыяд, які адносіцца да новай гісторыі, — гэта перыяд прызнання шынтаізму дзяржаўнаю рэлігіяй. Месца сёгуна ўсё часцей займае імператар, які паходзіць ад бога. Культ становіцца неабходным для ад-



Шынтаісцкі святар каля святыні.

паведнага функцыянавання дзяржавы. Дзяржаўныя кіраўнікі прызначаюцца адначасова кіраўнікамі святыняў, а святы лічацца абавязковымі. Шынтаізм быў абавязковым прадметам ва ўсіх школах. Сітуацыя змянілася пасля трагічнай капітуляцыі Японіі ў 1945 годзе, калі імператар заявіў, што ён не з'яўляецца богам. Для японцаў гэта было сапраўдным шокам.

Святыя кнігі

Асноўная кніга шынтаізму — *Кадзікі*, якая адначасова з'яўляецца шэдэўрам японскай рэлігійнай літаратуры. Кніга складаецца з трох частак. У першай змешчаны тэаганічныя і космаганічныя міфы; другая і трэцяя падаюць гісторыю імператарскага дому.

Продкі сучасных японцаў, ад якіх паходзіць гэты народ, заснавалі сваю сталіцу ў прыгожай, атуленай з усіх бакоў гарамі, парослымі лесам, правінцыі Ямато (што значыць «вялікі супакой»). Яны імкнуліся рэалізаваць узнёслую ідэю паяднання свету як аднае сям'і. Караблі плавалі па ўсіх водах акіяна і спакойна кідалі якары ва ўсіх портах. Ва ўсіх дзяржавах панаваў спакой, які пільна ахоўваўся. Аднак пазней, асабліва на пачатку перыяду, які адносіцца да новай гісторыі, калі краіна адкрылася для свету, японскі народ вёў войны з іншымі краінамі. Натуральным наступствам гэтага сталі вялікія пакуты ўсяго народу.

Бачачы сітуацыю ў сённяшнім свеце, мы здзіўляемся і дрыжым ад страху, бо ўсведамляем, што прывід страшных бедаў, якія зусім нядаўна былі нашым лёсам, вырастае да памераў зямнога шара, што пагроза навісла сёння над усім чалавецтвам.

Папа Ян Павел II, бачачы пагрозлівую сітуацыю ў сучасным свеце, паклікаў на малітоўную сустрэчу ў Асізі прадстаўнікоў галоўных рэлігій свету, каб з гэтага святога месца ўзнесці малітву за мір.

Адказваючы на гэты заклік, як шынтаіст, які падзяляе гэты неспакой, я прыбыў сюды з Далёкага Усходу, з Японіі.

Найпершы абавязак веруючых людзей перад светам і чалавецтвам — гэта ўмацаванне іх салідарнасці праз яднанне ў малітве. Памылкаю, якую дапусціла чалавецтва на працягу свае доўгай гісторыі, былі спрэчкі і суперніцтва паміж вераваннямі. Цяпер мы, прадстаўнікі розных рэлігій свету, сабраліся ў гэтым святым месцы, каб быць разам і маліцца за мір.

Я прадстаўляю тут вызнаўцаў шынтаізму, традыцыйнай рэлігіі Японіі. Узносячы маю гарачую малітву за мір, я хацеў бы прамовіць словы, узятыя з оды, складзенай адным са старажытных імператараў, а таксама з оды, складзенай цяперашнім імператарам.

«Чаму, калі ўсе людзі, што жывуць на другім беразе акіяна, з'яўляюцца нашымі братамі, не сціхае неспакой? Чаму на акіяне, які нас абмывае, узнімаюцца віхуры і хвалі?»

«Насамрэч, я хачу толькі аднаго: каб вецер як найхутчэй развеяў усе хмары, якія навіслі над вяршынямі гораў».



Нарыто — рытуальныя шынтаісцкія малітвы (каля 1800 г.).

Іншыя кнігі — гэта 30 зборнікаў *Ніхонгі*, з якіх 2 датычаць багоў, а 28 — зямной дынастыі, і *Нарыто*, у якіх налічваецца 50 кнігаў, складзеных з закляццяў і рытуальных чытанняў.

Дыялог Касцёла з шынтаізмам

Шынтаізм — гэта закрытая нацыянальная рэлігія, цесна паяднаная з гісторыяй Японіі. Шынтаізм абвяшчае асаблівую абранасць гэтай краіны, што, на жаль, вельмі ўскладняе дыялог з ёю. Касцёл у мінулым неаднаразова спрабаваў наладзіць кантакт з гэтаю краінаю. Вялікім апосталам Японіі быў Францішак Ксавэрый, які прыбыў туды ў 1541 годзе. Пасля першага перыяду дынамічнага развіцця веры, у XVI і XVII стагоддзях, прайшла хваля страшных пераследаў хрысціянаў. Японія закрылася не толькі ад еўрапейскай культуры, але і ад

хрысціянства, якое з ёю атаясамлівалася. Толькі ў XX стагоддзі місіянеры змаглі зноў спаквaля прыбываць у гэтую краіну.

Уласна кажучы, шынтаізм — гэта рэлігія тугі па Богу, вельмі аддаленым і недаступным для чалавека. Яна таксама абуджае адчуванне адрознасці чалавека ад усяго свету. Аднак найбольш складаная праблема сапраўднага навяртання: ці можа японец хрысціянін не быць шынтаістам, калі пазіцыя вернасці гэтай «рэлігіі» была так моцна ўкаранёная ў гісторыі краіны?

Ян Павел II верыў, што сапраўдны дыялог з шынтаізмам магчымы. У часе наведвання Хірасімы ў 1981 годзе Папа казаў: «Нельга жадаць больш жывога дыялогу і больш плённага супрацоўніцтва паміж усімі тымі, хто верыць у духоўнае пакліканне чалавека і яго пошукі Абсалюту».

Літаратура

Bogucka E., *Sintoizm*, „Misyjne Drogi" 1985, 3, z. 4, s. 56–59.

Bukowski K., *Współczesne religie a chrześcijaństwo*, Kraków 1986.

Рэлігіі Кітая



Кітайскі дракон (лун) — сімвал мужчынскага пачатку (ян) і кітайскай нацыі ўвогуле.

Вялікія рэлігіі Кітая канфуцыянства і даасізм узніклі каля VI стагоддзя да Н. Х. і на сённяшні дзень складаюць рэлігійную, філасофскую і грамадскую сістэму гэтага вялікага народа. На самым пачатку трэба зазначыць, што гэта ў большай ступені філасофскія і грамадскія сістэмы, чым рэлігіі ў дакладным значэнні гэтага слова. Магчыма таму, нягледзячы на інтэнсіўную атэізацыю, прынцыпы канфуцыянскай этыкі не толькі прысутнічаюць у штодзённым жыцці краіны, але таксама ў пэўнай ступені ўплываюць на яе грамадскае жыццё. Гэта асабліва адбілася на канцэпцыі дзяржавы, якая, на думку Канфуцыя, існуе з устанаўлення Неба. Канфуцый упарадкаваў жыццё, беручы пад увагу рэлігійныя традыцыі і этычныя прынцыпы. Яго нельга лічыць заснавальнікам новай рэлігіі. Ён, хутчэй, быў рэлігійна-грамадскім рэфарматарам.

КАНФУЦЫЯНСТВА


Канфуцый

Канфуцый (Кун-дзы, Настаўнік Кун) нарадзіўся ў 551 годзе да Н. Х. у княстве Лу. Яго біяграфія ахутана легендаю. Пасля няўдалай чыноўніцкай кар'еры ён пакінуў княскі двор і стаў вандроўным настаўнікам. Канфуцый сабраў вакол сябе шмат вучняў. Вандруючы па Кітаі, ён шукаў уладара, які мог бы ўвесці ў жыццё яго вучэнне. Не знайшоўшы зразумення, Канфуцый вярнуўся на радзіму і прысвяціў сябе настаўніцкай і пісьменніцкай дзейнасці. Ён працаваў дзеля захавання традыцыі, імкнучыся паказаць ідэальную мадэль дзяржавы. Канфуцый памёр у 72 гады, а яго-ныя вучні ўшанавалі настаўніка трохгадоваю жалобаю сэрцаў, без ніякіх знешніх праяваў. Пасля яны ўзвялі на яго хвалу святыню і гэта дало пачатак культу Канфуцыя.



Канфуцый.

Вучэнне Канфуцыя было прынята Ханьскай дынастыяй (206 г. да Н. Х.) і стала афіцыйнаю рэлігіяй і філасофіяй ажно да ўпадку імперыі ў 1912 годзе. Яшчэ на пачатку XX стагоддзя Канфуцый быў зме-



Дамы нашчадкаў Канфуцыя ў яго родным горадзе Цюйфу.

шчаны імператарскім дэкрэтам у пантэоне кітайскіх бостваў.

Канфуцыянства захавалася да нашага часу як кітайская рэлігія. Дакладная статыстыка па колькасці яго вызнаўцаў сёння недаступная, аднак вядома, што нават камуністычныя ўлады выкарыстоўваюць канфуцыянства для ўкаранення сваёй ідэалогіі.

Святыя кнігі

Так званае *канфуцыянскае Пяцікніжжа* складаецца з наступных твораў:

— Кніга пераменаў *І-Дзын* (вяшчунская кніга);

— Кніга гістарычных дакументаў *Шу-Дзын* (распавядае пра гісторыю імператараў);

— Кніга вёснаў і восеняў *Чунь-Цю* (складаецца з гістарычнах дадзеных);



«Шэн-дзы ту» — ілюстраваная біяграфія Канфуцыя (Кітай, 1573 – 1619 гг.).

— Кніга песняў *Шы-Дзын* (збор народных і прыдворных песняў, а таксама культавых гімнаў);

— Кніга звычаяў, рытуалаў і этыкету *Лі-Дзы* (у ёй апісваюцца нормы грамадскага і рэлігійнага жыцця).

Апрача пералічаных твораў, існуе так званае *канфуцыянскае Чатырохкніжжа*, якое з'яўляецца своеасаблівым каментарам і інтэрпрэтацыяй Пяцікніжжа.

Дактрына

Як ужо адзначалася, Канфуцый не стварыў новай рэлігіі, ён быў толькі прапаведнікам і рэфарматарам традыцыйнай кітайскай рэлігіі, якая прызнавала існаванне Найвышэйшага Боства — Цянь, і шмат ніжэйшых бостваў. Аднак Канфуцыя цікавілі не метафізічныя

праблемы. Яго цікавіла найперш этыка. Ён лічыў вераванні сродкам для дасягнення маральнай дасканаласці. Канфуцый не разбураў існуючай традыцыі, таму прымаў складанне ахвяраў Найвышэйшаму Боству, якое ўзнагароджвае за дабро і карае за зло. Канфуцый прыклаў таксама намаганні для пашырэння культу продкаў і, дзякуючы гэтаму, змог цудоўна спалучыць часовае з мінулым. Аднак яго больш цікавіла зямное жыццё, таму нельга лічыць канфуцыянства рэлігіяй. Гэта сістэма, моцна ўкаранёная ў рэальным свеце, якая служыць упарадкаванню людскіх адносінаў.

У перыяд заняпаду ў Кітаі старажытных грамадскіх інстытутаў Канфуцый клапаціўся пра вяртанне ўлады



Рытуал у гонар дня нараджэння Канфуцыя.



Вучні канфуцыянскай школы Сонгюнгван (Карэя).

справядлівасці і любові. Этыка была для яго *дао* — шляхам чалавека.

Яе складалі чатыры дабрадзейнасці:

— «жэнь» — зычлівасць і дабрыня; гэта цнота чалавечнасці;


— «і» — высакароднасць; высакародны чалавек не шукае матэрыяльнай карысці;

— «лі» — цнота рытуалу і этыкету; вызначае стыль паводзінаў, складання ахвяраў, стварэння сужэнства, барацьбы, а таксама пяць тыпаў сувязяў, якія арганізуюць адносіны ў жыцці: падданага да ўладара, сына да бацькі, малодшага да старэйшага, жонкі да мужа, сябра да сябра;

— «шэ» — цнота мудрасці і ўменне адрозніваць дабро ад зла.



Вывучэнне канфуцыянскіх канонаў.



Канфуцыянскі храм у горадзе Урумчы (заходні Кітай).

Узнагародаю за практыкаванне цноты не з'яўляюцца ані дабрабыт, ані вечнае шчасце, а толькі задавальненне ад сумленна выкананага абавязку. Канфуцый стварыў трывалыя асновы дзяржаўнай сістэмы і грамадскага парадку, у якім кожны ведаў сваё месца ў грамадскай іерархіі. Народ успрымаўся як адна вялікая сям'я, людзі былі паслухмяныя волі ўладара, які лічыўся бацькам.

Канфуцыянства — гэта тыповая нацыянальная рэлігія. Практычна кожны кітаец лічыў сябе канфуцыянцам. Неабходна дадаць, што ў рэлігійным маштабе гэта сістэма часта выкарыстоўвае дактрыны іншых рэлігій, такіх як даасізм альбо будызм, таму пры вызначэнні поглядаў яна набывае сінкрэтычны характар.

ДААСІЗМ

Другая вялікая нацыянальная рэлігія Кітая — даасізм, цесна звязана з канфуцыянскімі адносінамі да жыцця. Лічыцца, што напачатку даасізм быў, хутчэй, філасофскаю сістэмаю. Заснавальнікамі гэтага кірунку былі Лао-дзы і Джуан-дзы.

У кітайскай філасофіі лічыцца, што напачатку існавала толькі адна энергія жыцця, гэтак званае «першапачатковае К'і», называнае таксама *дао*. Гэты тэрмін прыблізна азначае шлях, спосаб жыцця, парадак у прыродзе, яе рытм і законы. Гэта — аснова сусвету. Ключавым пазнавальным тэкстам з'яўляецца паэтычны твор *Дао-дэ-дзын*, у якім налічваецца больш за 5000 словаў.



Лао-дзы — заснавальнік даасізма ў Кітаі (Кітайская народная карціна XIX ст.).



Даоскі храм у горадзе Трат (Тайланд).

Добрыя і чыстыя элементы ўтвараюць нябёсы, а цёмныя — зямлю. Чалавек яднае ў сабе неба і зямлю. Першапачаткова чалавек жыў у гармоніі; цяпер яна разбураная. Кітайскія мысляры сыходзяцца ў меркаваннях пра цяперашні стан чалавецтва, але бачаць розныя яго прычыны і спосабы выйсця з яго. У адрозненне ад канфуцыянцаў, паслядоўнікі даасізму прапануюць больш радыкальныя сродкі. Вяртанне да шчасця магчымае праз адмаўленне ад ілюзорных каштоўнасцяў цывілізацыі. Вызваленне чалавека заснавана на паяднанні з *дао*, але каб дасягнуць гэтага, трэба імкнуцца да вакуума. Дао атаясамліваецца з небам і з'яўляецца іманентнаю асновою сусвету.



Дворык у даоскім храме.

Лао-дзы, які лічыцца творцам даасізму, рэкамендуе чалавеку «тры скарбы» ўнутранай дасканаласці:

1) прабачэнне — толькі міласэрнасць здольная да прабачэння ці гераізму;

2) сціпласць — сціплы чалавек можа атрымаць сапраўдную свабоду;

3) пакору — толькі пакорны чалавек здольны ўладарыць.

Гэта разам з тым шлях да дасягнення сапраўднай свабоды. Даасізм як рэлігійная сістэма быў вядомы ў Кітаі ўжо ў VI стагоддзі да Н. Х. Аднак сапраўднага развіцця ён дасягнуў пры Джуан-дзы, які жыў на пераломе IV і V стагоддзяў. Мысляр, які жыў на самоце, прый-

шоў да пераканання, што *дао* — гэта абсалют, прысутны ва ўсіх рэчах, які з ніводнаю з іх не ідэнтыфікуецца, які нельга перадаць словамі і які не паддаецца адрозненню паміж быццём асабовым і безасабовым. Мудрэц дасягае вяршыні сваіх разважанняў, паказваючы *дао* як быццё, якое прамаўляе да сэрца чалавека. Ён звяртае ўвагу на паяднанне з *дао*, праз якое чалавек становіцца «сынам Неба». Можна сказаць, што, паказваючы чалавеку шлях, мысляр прапануе яму своеасаблівую мадэль святасці, якая характарызуецца ўваходам у адвечныя асновы сусвету. Містык дааізму пазбаўлены ўсяго. Ён рэалізуе ў сабе пустку, якая насамрэч ёсць паўнатою. Усе справы свету, якія кіруюцца адвечным прынцыпам, падпарадкуюцца ёй, як і сам чалавек.



Традыцыйная кітайская гімнастыка тайдзы.

Аднак ёсць розніца паміж хрысціянскім і даоскім разуменнем адносінаў да Бога. У хрысціянстве гэтыя адносіны грунтуюцца на аб'яўленні Бога і веры ў Яго. У даасізме няма гаворкі ні пра аб'яўленне, ні пра веру. Даасізм прапануе быццам бы лягчэйшы шлях: бачыць і разумець істотнае, тое, што з'яўляецца прычынаю: *дао*. Некаторыя рэлігіязнаўцы лічаць, што гэта рэлігія з'яўляецца падрыхтоўкаю да прыняцця Хрыста кітайскім народам. Гэтую ісціну адзін з міфічных імператараў Яо выказаў так: «Калі Ты ёсць, Настаўнік, то добрую ўладу будзе мець каралеўства. А калі б мне было дадзена ім кіраваць, то павінен прызнацца, што марна займаю месца. А таму прашу, каб трон быў Табе аддадзены».

Літаратура

Bogucka E., *Konfucjanizm*, „Misyjne drogi" 1985, 3, s. 53–55.

Bukowski K., *Współczesne religie a chrześcijaństwo*, Kraków 1986.

Konior J., *Zagadnienie „grzechu" w kulturze chińskiej*, Kraków 2006.

Wolanin A., *Dialog chrześcijaństwa z innymi religiami*, Kraków 1993.


Плямённа-родавыя рэлігіі



На тэрыторыі Афрыкі маска — атрыбут многіх рэлігійных абрадаў.

Традыцыйныя плямённа-родавыя рэлігіі захаваліся ў наш час толькі на тэрыторыі Афрыкі і ў меншай ступені на астравах Акіяніі. Несумненна, раней гэтыя рэлігіі былі распаўсюджаныя таксама на іншых кантынентах, аднак з часам яны былі асіміляваныя хрысціянствам, ісламам і іншымі вялікімі рэлігіямі. Таму мы будзем апісваць элементы афрыканскіх традыцыйных вераванняў.

Нельга ўспрымаць афрыканскія рэлігіі як забабоны альбо прымхі, бо для афрыканцаў яны з'яўляюцца сапраўднаю формаю веры ў Бога. Раней вельмі часта гэтыя рэлігіі вызначаліся (дзякуючы эвалюцыйнай школе Э. Б. Тэйлара і Дж. Дж. Фрэзера) як анімізмы, гэта значыць рэлігіі, пазбаўленыя кантакту з Богам і пашаны да Яго; замест гэтага, на думку вучоных, быў уведзены свет духаў. Такая канцэпцыя, якая часта грунтуецца на сведчаннях выпадковых падарожнікаў, няправільная. Першасная форма афрыканскіх рэлігій была



Тамтам — музычны інструмент афрыканскіх шаманаў.

Для прадказання будучыні шаманы карыстаюцца спецыяльнымі палачкамі.



монатэістычнай. Адметнаю рысаю афрыканскага светапогляду з'яўляецца адсутнасць падзелу ўсяго існага на адушаўлёную і неадушаўлёную прыроду. Усюды прысутнічае Божы след і энергія.

Бог

У афрыканцаў вельмі моцная вера ў існаванне Бога, Творцу ўсяго існага. Аднак гэты Бог далёкі і для Яго было б прыніжэннем цікавіцца чалавекам. У Афрыцы няма святыняў, пастаўленых Богу, а Яго ўвасабленнем з'яўляюцца фігуркі шматлікіх бостваў. Бог, якога часта называюць Найвышэйшым Духам, Панам, вызначаецца вялікаю дабрынёю, а таму не трэба задобрываць Яго



Шаман (ён жа лекар) — неабходны персанаж кожнага племя.

ахвяраю. У Афрыцы не складаюць ахвяраў Найвышэйшай Істоце. Ахвяры складаюцца другарадным духам, якіх налічваецца цэлы пантэон: боства перуна, боства зямлі, боства жалеза, боства жывёлы.

Культ продкаў

У Афрыцы продкі карыстаюцца вялікаю пашанаю. Яны не абагаўляюцца, але атачаюцца пашанаю, бо заступаюцца за нашчадкаў перад боствамі, а іх парады захоўваюць ад небяспекі. Культ продкаў — гэта апасродкаваны культ Бога, заснаваны на заклінаннях і складанні ахвяраў. Продкі заўсёды знаходзяцца блізка да жывых, а таму існуе перакананне, што яны прамаўляюць да іх, таму трэба дзяліцца з продкамі найперш ежаю.

Духі

Духі, створаныя Богам, нябачныя, але матэрыяльныя. Яны — віноўнікі многіх здарэнняў, такіх як хвароба альбо смерць. Уласна кажучы, афрыканец жыве ў



Міфалогія дагонаў (Рэспубліка Малі) адна з самых развітых сярод афрыканскіх народаў. Іх уяўленні пра космас знаходзяць адлюстраванне ў масках і танцах.

свеце духаў. Іх дзеянне можа быць розным, таксама й злосным, таму, каб атрымаць добразычлівасць духаў, трэба прыносіць ім ахвяры.

Абрады

У традыцыйных афрыканскіх рэлігіях няма падзелу на рытуалы сакральныя і свецкія. Усё жыццё — гэта ўдзел у сакральным жыцці, прадыктаваным міфам. Гэта наследаванне жыцця Бога. Міф тлумачыць, чаму існуе дабро і зло, паходжанне цярпення і смерці, а ўвесь рытуал — гэта ілюстрацыя міфа. Афрыканцы лічаць, што дзякуючы абрадам захоўваецца гармонія ў свеце. Абрады дзеляцца на абрады ўтаямнічання і ачышчэння. Абрады ўтаямнічання — гэта ўводзіны ў новы перыяд жыцця: нараджэнне, юнацтва, шлюб, пахаванне. Абрады ачышчэння даюць магчымасць вярнуцца ў супольнасць тым, хто адышоў з яе з прычыны рытуальнай нячыстасці.



Эфіопія.
Племя Мурзі.

Збаўленне

Збаўленне ўяўляецца як пераход пасля смерці з зямлі на той свет, таму шмат увагі надаецца пахавальным урачыстасцям. Гэта адно з найважнейшых заданняў нашчадкаў. Рытуал шматступенны, што дае магчымасць развітацца з памерлым і пераняць яго функцыі ў той супольнасці, у якой ён жыў. Абавязковае складанне ахвяраў. Важна мець нашчадкаў, каб маглі адпаведна адбыцца пахавальныя ўрачыстасці. Памяць аб памерлым — гэта ўмова праведнага жыцця на зямлі.

Дыялог Касцёла з плямённа-родавымі рэлігіямі

Афрыка — гэта місійны кантынент. Місіянер, які сутыкаецца з вызнаўцамі мясцовых рэлігій, не павінен іх ігнараваць. Пра духоўнае багацце кантынента нагадвае Пасінадальная апостальская адгартацыя Яна Паўла II *Ecclesia in Africa:* «Афрыканцы маюць глыбокае рэлігійнае пачуццё, адчуванне *sacrum*, усведамленне існавання Бога Творцы і духоўнага свету. Народы Афрыкі так-

сама глыбока ўсведамляюць рэаліі граху ў яго індывідуальных і грамадскіх формах і таксама адчуваюць неабходнасць актаў ачышчэння і перапрашэння» (EA 42).

Яшчэ раней II Ватыканскі Сабор навучаў аб вартасцях гэтых рэлігій: «Ужо са старажытнасці і да цяперашняга часу ў многіх народаў існуе пэўнае адчуванне таямнічай сілы, якая прысутнічае ў хадзе справаў і ў падзеях чалавечага жыцця, а часам і прызнанне Найвышэйшага Боства ці нават Айца. Гэтае адчуванне і гэтае прызнанне напаўняе іх жыццё глыбокім рэлігійным зместам. <...> Каталіцкі Касцёл не адмаўляе нічога, што ў гэтых рэлігіях ёсць праўдзівага і святога» (NA 2). Хрысціянская пазіцыя — гэта пазіцыя павагі, пазнання і сустрэчы з вызнаўцамі рэлігій, пазіцыя, адпаведная прынцыпам місійнай дзейнасці — прынцыпам інкультурацыі.

Літаратура

Grodź S., *Chrystologia afrykańska w rodzinnym kontekście kulturowym*, Lublin 2005.

Wita G., *Istoty nadnaturalne ludu Aszanti w Ghanie*, Katowice 2007.

Новыя рэлігіі

Нам цяжка ўявіць, што рэлігіі таксама могуць змяняцца, што ўзнікаюць новыя рэлігіі. У розныя гістарычныя перыяды ствараліся рэлігійныя рухі, у якіх праяўляліся тэндэнцыі адновы рэлігійнага жыцця, незадаволенасць існуючымі структурамі і жаданне іх змяніць. Новыя рэлігійныя рухі ўзнікаюць і ў наш час (іх налічваецца некалькі тысяч).

Апошнія пяцьдзесят гадоў мінулага стагоддзя асаблівую ўвагу даследчыкаў прыцягвалі рэлігійныя і рэлігійна-грамадскія рухі, якія развіваюцца на «абмежках» рэлігіі (таксама хрысціянства) і традыцыйных культураў у нееўрапейскіх краінах. Гэта тыя месцы, дзе раней еўрапейская, а пазней паўночна-амерыканская экспансія прыводзіла да павольнага працэсу пераменаў. Згубныя вынікі гэтак званай «пратэкцыянісцкай місіі», якую праводзілі каралі Іспаніі і Партугаліі, а пасля эканамічны, цывілізацыйны і палітычны прыгнёт выклікалі знікненне мясцовай культуры, а новыя каштоўнасці і культуралагічныя формы часта былі незразумелыя і чужыя.



Прадстаўнікі новых рэлігій на вуліцах Ёханэсбурга (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка).

Прычыны ўзнікнення новых рэлігій

Першаю прычынаю была недасканаласць місійнай справы, недахоп адпаведнай евангелізацыі, а пасля — недахоп працы над фармацыяй свайго духавенства, недахоп павагі да мясцовай культуры. Яшчэ адным фактарам быў вобраз хрысціянства як рэлігіі «белых», часта ненавісных, каланізатараў. Здавалася, што Збаўца белых не можа адначасова быць іхным Збаўцам. Місіянеры часта абвяшчалі Евангелле ва ўласнай культуралагічнай форме, і гэта пазбаўляла магчымасці стварыць сапраўдны мясцовы Касцёл. Нацыянальна-вызваленчыя рухі, асабліва ў Афрыцы, былі адначасова бунтам супраць хрысціянства ў яго еўрапейскім выглядзе. Яшчэ адным фактарам было змяншэнне святарскіх і манаскіх пакліканняў у тых краінах, якія высылалі найбольш місіянераў. У пакінутых місійных цэнтрах і парафіях у пэўны час не хапіла святароў. Гэтую пустку пачалі запаўняць кіраўнікі рэлігійных рухаў, якія прапаноўвалі новы рух з хрысціянскімі асаблівасцямі, але сінкрэтыч-

ны, гэта значыць, з адвольным выкарыстаннем элементаў розных рэлігій. Аднак гэтыя мясцовыя рухі, звязаныя з дадзенымі культурамі, аказаліся ўсім зразумелыя. Як прыклад можна прывесці культ *карго* ў Новай Гвінеі, *кімбангізм* у Заіры, *умбанда* ў Бразіліі. Новыя рэлігіі ўспрымаюцца як надзея для чалавека, асабліва для каляровага, як шанец на лепшую будучыню. Яны часта вызначаюцца непрыязнасцю, а нярэдка і варожасцю да белых. Такая рэакцыя ўзнікае з-за недахопу пакоры і павагі да іх традыцыйнай культуры.

Характэрныя асаблівасці новых рэлігій

Першаю ўжо згаданаю асаблівасцю з'яўляецца **сінкрэтызм**, заснаваны на выбарачным выкарыстанні элементаў розных рэлігій. Таму часам цяжка апісаць такі рух, бо прынцыпы яго функцыянавання могуць быць адвольныя.

Наступная асаблівасць — **рэвівалізм**. Гэта спроба пошуку і вяртання страчаных, забытых рысаў сваёй культуры. З рэвівалізмам звязаны **натывізм** як ачышчэнне айчыннай культуры ад наслаенняў чужародных элементаў.

Наступныя асаблівасці — гэта спроба кампенсацыі за ранейшую сітуацыю. Сярод іх: **віталізм** — спадзяванне на нечаканае, надзвычайнае збаўленне, якое грунтуецца на духоўных сродках; **міленарызм** — чаканне зямнога вызвалення з дапамогаю звышнатуральных сродкаў, часта звязанае з ідэяй «тысячагадовага» перыяду справядлівасці, любові і спакою.



Культавы будынак новых рэлігій (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка).

Каб асягнуць гэтую мэту, абавязковае **месіянства**, гэта значыць, вера ў Месію, які прынясе поўнае вызваленне, найперш тут, на зямлі. Ім можа быць божая Істота, духі памерлых продкаў, дасканалы вызнаўца дадзенай рэлігіі альбо яе харызматычны кіраўнік. Нарэшце, **эсхаталагізм** — чаканне нявызначанай у часе катастрофы, якая стане канцом свету і пачаткам яго аднаўлення. У новым свеце ўжо не будзе «белых», яны будуць цалкам знішчаныя.

Пералічаныя асаблівасці — гэта, зразумела, сінтэтычная падача пэўных характэрных, натуральна дыферэнцыраваных асаблівасцяў, якія ў залежнасці ад рэлігіі бываюць рознай інтэнсіўнасці.

Геаграфія новых рэлігій

Новыя рэлігіі ўзніклі і надалей узнікаюць на ўсіх кантынентах. Цяжка вызначыць іх дакладную колькасць, аднак неабходна заўважыць, што яны не з'яўля-

юцца ў ісламскім свеце. Яны, хутчэй, узнікаюць на «абмежках» хрысціянства. Гэта можна растлумачыць жорсткім ісламскім законам *шарыяту*, які не дапускае адступленняў ад веры. Найбольш новых рэлігій узнікла ў Паўднёвай Амерыцы і ў Афрыцы. Сярод значных рэлігійных рухаў трэба назваць:

— Рэлігіі паўночнаамерыканскіх індзейцаў: «Танец духаў» (рэлігія ўзнікла ў XIX ст.); *пеятызм* (з 1918 г. прызнаны амерыканскім Касцёлам мясцовай рэлігіяй; *шэйкерызм* (прызнае месіяй індзейца Дж. Шлокума).

— У Паўднёвай Амерыцы: *вуду, сантэрыя, шанго, шутэрызм, умбанда*, якія спалучаюць вераванні нявольнікаў з Заходняй Афрыкі, індзейскія вераванні і элементы з хрысціянства.

— У Афрыцы: *кімбангізм, мабутызм, кітавала, кханізм* — гэта прыклады афрахрысціянскіх рухаў.

— У Азіі: на Філіпінах — *аглІпаізм*; у В'етнаме — *каадаізм*. Прычынаю ўзнікнення гэтых рэлігій з'явіўся недахоп каталіцкага духавенства. Шмат рэлігій узнікла ў Японіі на аснове шынтаізму і будызму: *тэнры-кіо, конко-кіо, сока-гаккай*, мэтаю якіх з'яўляецца ўмацаванне маральнасці і стварэнне шчасця на зямлі.

— У Акіяніі (Новая Гвінея) найбольш распаўсюджаныя культы *карго*, якія звязаныя з «цудоўнымі дарамі з неба», альбо грузамі, што скідваюцца ў недаступных частках астравоў з самалётаў.

У апошнія гады з'яўляюцца зусім невядомыя дасюль вераванні, якія звязаныя з космасам — культ *уфо*, і тэхнікай, асабліва камп'ютэрнай.

Касцёл і новыя рэлігіі

Новыя культы і рэлігійныя рухі цяжка акрэсліць. Ім самім быў патрэбны час для вызначэння. У 1962 годзе ў Міндоло (Замбія — *К. Л.*) адбылася сустрэча, якая дапамагла вызначыцца гэтым рэлігіям у адносінах да хрысціянства. У супольнай дэкларацыі было засведчана, што сярод новых рэлігій можна лічыць хрысціянскімі тыя, якія прызнаюць «Пана нашага Езуса Хрыста як Бога і Збаўцу адпаведна Святому Пісанню». У выніку прынятага крытэрыя толькі адна з новых рэлігій была прызнаная хрысціянскаю — *кімбангізм*.

Доўгі час Касцёл не выказваўся на тэму новых рэлігій. Афіцыйную пазіцыю ён заняў толькі ў 1986 годзе ў дакуменце «Секты альбо новыя рэлігійныя рухі. Пастырскія выклікі». Саборавыя дакументы нават не называюць новых рэлігій — у іх агульна гаворыцца пра веруючых людзей альбо пра людзей добрай волі (пар. LG 16, NA 2). Падчас шматлікіх апостальскіх падарожжаў Ян Павел II сустракаўся з кіраўнікамі новых рэлігій. Першая такая сустрэча адбылася ў Афрыцы ў 1980 годзе.

Згаданы тут дакумент, падрыхтаваны Сакратарыятам еднасці хрысціянаў, Сакратарыятам для нехрысціянаў, Сакратарыятам для няверуючых і Папскаю радаю па культуры, быў першаю спробаю ацаніць гэтую з'яву. Касцёл выказвае найперш занепакоенасць тым, што людзям замест праўды прапануюцца замяняльнікі: «Секты як быццам бы прапануюць людзям простыя, гатовыя адказы на складаныя пытанні і сітуацыі, спрошчаныя і няпоўныя версіі традыцыйных каштоўнасцяў і праўды; прагматычную тэалогію, тэалогію поспеху,

сінкрэтычную тэалогію, якая падаецца як „новае аб'яўленне", „новая праўда". І ўсё гэта прапануецца людзям, якія часта маюць цьмянае ўяўленне пра „старую праўду"» (SNR 2.1.2). Выклікаюць таксама занепакоенасць метады прапаганды, у якіх часта спалучаюцца сардэчнасць і вераломнасць, якія вельмі хутка перафармоўваюцца ў кантроль над розумамі (пар. SNR 2.2). Дакумент сярод тыповых асаблівасцяў новых рэлігійных рухаў называе пагарду да сучаснага грамадства, недахоп навуковых асноваў у разуменні Бібліі, антыгістарызм, наказ сляпога падпарадкавання ўнушэнням і інструкцыям заснавальніка. У дакуменце сцвярджаецца, што новы рэлігійны рух часта кампенсуе пачуццё культурнай ніжэйшасці, недахоп увагі да чалавека ў Касцёле, ягоную ананімнасць: «Секты як быццам бы ахвяруюць людзям сваю вялікую ўвагу да культурна-рэлігійнай спадчыны, спантаннасць, саўдзел, стыль малітвы і навучання, найбольш блізкія асаблівасцям культуры і памкненням народа» (пар. SNR 2.1.4).

Рэлігіі — гэта не застылыя нязменныя сістэмы, яны рэагуюць гэтаксама, як асобы. Калі сутыкаюцца дзве рэлігіі, то канфлікты непазбежныя. Ніхто не можа ў адзін момант пазбыцца тае веры, з якою ён жыў ад пакаленняў, нават калі новая рэлігія падаецца як больш высокая. Супраціў слабейшы тады, калі стары культ перажывае крызіс, але часам ён нечакана абуджаецца з летаргічнага сну. Гэта добра відаць асабліва ў Афрыцы — менавіта там на працягу гадоў аслаблі анімістычныя культы. Дактрынальныя прынцыпы вялікіх рэлігій у асноўным прымаюцца і новымі рэлігіямі (монатэізм, збаўленне), але

часцей за ўсё яны перамешваюцца з міфамі. Рытуал, як правіла, звяртаецца да яскравых традыцыйных звычаяў, таму рэлігіі могуць быць выратавальным колам для культуры і могуць азначаць афрыканізацыю хрысціянства альбо ўвогуле кантэкстуалізацыю. Гэтыя пытанні знайшлі сваё адлюстраванне ў адгартацыі Яна Паўла II *Ecclesia in Afrika* (1995 г.). У нашай рэчаіснасці яны таксама прамаўляюць да нас: магчыма, былі ўпушчаныя пэўныя каштоўнасці, такія як дыялог, увага да асобы і яе актывізацыя, роля супольнасцяў.

Літаратура

Atłas T., *Ruch charyzmatyczny w Republice Konga i jego wpływ na kształtowanie życia osobistego i społecznego*, Warszawa 2005.

Bogucka E., *Nowe religie*, „Misyjne drogi" 1983, 4, z. 3, s. 55–59.

Kowalak W., *Chrześcijańskie źródła religii synkretycznych*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 469, s. 421–432.

Kowalak W., *Kulty cargo na Nowej Gwinei*, Warszawa 1982.

Kowalak W., *Nowe religie w Afryce*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1986, 7, s. 243–264.

Kowalak W., *Ruchy charyzmatyczne a kultury afrykańskie*, „Zeszyty Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego" 1976, 19, nr 3, s. 3–21.

Kowalak W., *Umbandyzm. Nowa religia Brazylii*, [w:] *Z zagadnień etnologii i religioznawstwa*, red. H. Zimoń, Warszawa 1986, s. 9–47.

Malek R., *Tenri-kio: nowa religia Japonii*, „Zeszyty Misjologiczne Akademii Teologii Katolickiej" 1978, 3, s. 298–325.

Skrabania J., *Misjonarze Werbiści a Kościół narodowy na Filipinach w latach 1909–1951*, Warszawa 2003.

Нью-эйдж

XX стагоддзе лічыцца стагоддзем рэлігіі з-за вельмі вялікай зацікаўленасці рэлігіямі і з-за таго, што ў гэты час узнікла шмат новых рэлігійных рухаў. Усялякія ідэі, дзякуючы камунікацыі, міграцыі і турызму, разносяцца надзвычай хутка. Рэлігійныя ідэі таксама карыстаюцца гэтымі каналамі. Ужо Апосталы выкарыстоўвалі для евангелізацыі свету тагачасныя дасягненні цывілізацыі.

Развіццё рэлігійных рухаў прыспешвае заўважнае нашэсце рэлігій Усходу. Захапленне Усходам можна растлумачыць стомленасцю ад эпохі спажывальніцтва і геданізму ў Заходняй Еўропе, а таксама крахам марксісцкай ідэалогіі ва Усходняй Еўропе.

З пэўнага часу асаблівую ўвагу як Касцёла, так і шматлікіх арганізацый, у тым ліку і выхаваўчых, прыцягвае рух пад назваю *нью-эйдж**, які хутка развіўся, ахопліваючы розныя сферы жыцця.

---

* *New Age* (анг.) — «новая эра». *(Заўвага перакл.)*

Што такое нью-эйдж?

Ангельскамоўная назва адразу вядзе ў яшчэ далёкую неакрэсленую будучыню. Пасля перыяду насілля, якім лічыцца мінулы час, прыйшла ўзмоцненая зацікаўленасць рэлігіямі і вераваннямі, агульнаю асаблівасцю якіх з'яўляецца містыцызм. Каментуючы гэтую сітуацыю, Ян Павел II сцвярджае, што «ў зсекулярызаваных грамадствах людзі шукаюць духоўнага вымярэння жыцця як засцерагальнага сродку ад дэгуманізацыі» (RMs 38). Цяжка даць фармулёўку гэтаму руху, цяжка вызначыць час яго ўзнікнення і назваць заснавальніка. Даследаванні часцей за ўсё сведчаць пра «сетку» альбо «перапляценне» рэлігійных рухаў, акультызму, эмансіпацыі, экалагічных рухаў, якія павінны служыць стварэнню новай свядомасці ў час «паблажлівасці» — эпоху Вадалея.

Ужо ў старажытнасці звярталася ўвага на тое, што сузор'і ўплываюць на жыццё чалавека. Сузор'ям даваліся назвы жывёлаў альбо міфічных асобаў. Вялікае кола нябеснай сферы было падзелена на 12 частак; па гэтай сферы ва ўяўным руху перамяшчаецца Сонца. Людзьмі, якія нарадзіліся пад пэўным знакам задыяку, апякуецца адпаведнае сузор'е, якое, згодна са шматлікімі вераваннямі, вызначае будучыню людзей і ўплывае на іх жыццё. Многія пры дапамозе гараскопу плануюць свае справы. У астралогіі вядомы вялікі касмічны год, які доўжыцца 25 868 гадоў. Падзелены на 12 сфераў, ён дае даўжыню аднаго касмічнага месяца — каля

2155 гадоў, прычым рух адбываецца ў адваротным кірунку адносна гадавога цыклу, гэта значыць: Рыбы, Вадалей, Авен і г. д. Цяпер заканчваецца эпоха Рыбаў, якая лічыцца часам сляпой нянавісці, і перад светам вымалёўваецца эпоха Вадалея.

Тэрмін *New Age* з'явіўся ў літаратуры каля 1968 года. Амерыканская журналістка М. Фэргусон, адна з тэарэтыкаў гэтага руху, бачыць новы час спакойным, лагодным, напоўненым святлом і адчуваннем, пазначаным станам ілюмінацыі, нірваны ці экстазу. Дзеля набліжэння «новага веку» прыдатныя ўсе рэлігіі, вераванні і практыкі, незалежна ад таго, хто ўшаноўваецца: Езус, Буда, Асірыс, Марыя альбо нейкая багіня. Характэрнаю асаблівасцю гэтай новай ідэі з'яўляецца рэлігійны сінкрэтызм з моцным акцэнтам на гуманізацыю веры. Езус галоўным чынам паказваецца як «дасканалы Чалавек», а пра Яго боскасць нават не згадваецца. Пры гэтым ахвотна выкарыстоўваюцца вобразы «лагоднага» Езуса: Добры Пастыр, Езус, які навучае, любіць... І між тым не паказваюцца тыя вымаганні, якія ставіць Езус Хрыстус, Яго збаўчая Мука на Крыжы, а значыць усё тое, што вядзе да навяртання і перамены жыцця.

Другім вялікім тэарэтыкам руху нью-эйдж з'яўляецца Ф. Капра, які ў адным са сваіх твораў піша, што адзін з заснавальнікаў новай ідэалогіі — гэта айцец «культурнай рэвалюцыі» філосаф Г. Маркузе (яго тэорыі распаўсюджваліся між іншым у Камбоджы, дзе пад-

час рэвалюцыі былі знішчаны 3 мільёны людзей). Паводле яго, сёння ўжо нельга прапагандаваць састарэлыя тэзы пра эксплуатацыю рабочага класа буржуазіяй. Эксплуатацыя існуе надалей — у адносінах да жанчынаў альбо прыроды. Таму рэвалюцыю трэба праводзіць у іншай галіне, яна павінна весці да перамены ўсяе біясферы — аб'екту ўсеагульнай любові. Такім чынам, пры дапамозе новай рэлігіі грамадства павінна перафармавацца лагодным шляхам. Тады наступіць 1000-гадовае панаванне свабоды і братэрства. Тут не трэба спецыяльна прыгадваць, што падобнае ўжо абвяшчала французская рэвалюцыя, пазней Маркс і Энгельс, Ленін і Гітлер ды многія іншыя.

Характарыстыка нью-эйдж

Сярод шматлікіх кампанентаў, якія складаюць нью-эйдж, у даследаваннях найчасцей называюць халізм, лагодную перамену, экалогію, рэінкарнацыю, «сетку» і спецыфічна зразуметую «хрысталогію».

Халізм — гэта цэласнае бачанне навакольнай рэчаіснасці. Халістычны метад супрацьпастаўляецца распрацаванай Дэкартам і Ньютанам дуалістычнай канцэпцыі, якая выкарыстоўваецца ў розных галінах ведаў. Яна разрознівае суб'ект і аб'ект і на працягу вякоў з'яўлялася мастом паміж навукаю і рэлігіяй. Новая парадыгма ў разуменні свету мае на ўвазе уніфікацыю макра- і мікракосмасу. Гэты метад спрабуе выкарыстаць для такой мэты ўсе галіны ведаў: фізіку (Э. Янч) — «самаарганіза-

цыя сусвету»; біялогію (Р. Шэлдрэйк) — «морфагенетычныя палі»; псіхалогію (С. Гроф) — «трансперсанальная псіхалогія»; хімію (І. Прыгожын) — «рассеяныя структуры»; эканоміку (Э. Шумахер) — «малое — гэта прыгожа»; паліталогію (Р. Мюллер) — «глабальная духоўнасць». Сфармуляваныя ў такім ключы розныя тэорыі пазней знаходзяць свой водгук у штодзённым жыцці. Халістычнае бачанне надзвычай моцна точыць свядомасць з дапамогаю такіх паняццяў як экасістэма, адзінства і роўнасць, свет як сям'я, пры гэтым яно ідзе яшчэ далей — у кірунку адзінства ў касмічным вымярэнні.

Лагодная перамена павінна датычыць усяго жыцця і ўсіх, а яе мэта — злучыць людзей у адзін ланцуг. Своеасабліва зразуметае «навяртанне» звязана з крызісам канца шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя і крызісам каштоўнасцяў, які працягваецца надалей. У жыцці асобы гэта зводзіцца да вызвалення акумуляванай у чалавеку энергіі.

Экалогія. Новыя утопіі, да якіх належыць нью-эйдж, часта распаўсюджваюцца дзякуючы папулярным экалагічным рухам. У гэтых рухах зямля вырастае да ролі боства, а грэх вызначаецца адносінамі да прыроды. Духоўны кіраўнік «руху зялёных», Х. Шпрэнтак, падае новую дэфініцыю язычніцтва: гэта «рэлігіі гарадоў», звязаныя з інстытуцыйнымі Касцёламі, фінансамі і бізнесам. Экалагічныя рухі ў паяднанні з фемінізмам часцей за ўсё катэгарычна скіраваныя супраць Касцёла.

Рэінкарнацыя. Тут найбольш відавочны ўплыў рэлігіі Усходу. Яна пярэчыць праўдам веры пра ўваскрашэнне цела, а таксама пра смерць як дарогу да ўваскрашэння, а таму няма асаблівай адказнасці за ўчынкі, за жыццё. Замест гэтага прапануюцца вельмі цьмяныя рэінкарнацыйныя тэорыі, угрунтаваныя на ўсходняй ідэі трансміграцыі душаў і звязанай з гэтым вегетарыянскаю практыкаю. Вегетарыянская дыета вырастае да найвышэйшай рэлігійнай практыкі, зразумела, звязанай з экалогіяй.

Сетка. Усе згаданыя ўжо элементы павінны весці да паяднання ўсіх сфераў навукі, жыцця і напрыканцы ўсіх. Вялікае значэнне тут надаецца інфарматыцы і асабліва камп'ютэрызацыі. Важную ролю маюць альтэрнатыўныя формы адукацыі (пры падрыве аўтарытэту ранейшых формаў адукацыі, у тым ліку універсітэцкай) — разнастайныя *Business School*, школы моды, школы сакратарак, якія часта маюць азначэнні «еўрапейская», *world* і г. д. Пахіснуўся аўтарытэт дасягненняў медыцыны і ўзрасла папулярнасць рознага шарлатанства. У галіне мастацтва выразна праяўляецца развіццё фантастыкі, коміксаў, кіно *science fiction**; у музыцы — спеў высокімі тонамі, «лагодная» музыка; у жывапісе і модзе пераважаюць пастэльныя колеры з далікатным адценнем шэрага. У сферы рэлігіі — усходні містыцызм, развіццё разнастайных прыватных візіяў

* Навуковая фантастыка. *(Заўвага перакл.)*

і аб'яўленняў пры адначасовай маніякальнай непрыязнасці да навучання Касцёла.

Хрысталогія. Зразумела, з гэтаю мэтаю выбарачна выкарыстоўваецца вучэнне пра Хрыста. Асоба, якая ўсіх яднае, Езус — Настаўнік, Містык, Брат, дасканалы Чалавек. Пэўны ўплыў на фармаванне такога вобраза Касмічнага Езуса маюць працы езуіта Т. дэ Шардэна. Паказ жа такога вельмі невыразнага вобраза Хрыста супярэчыць Яго боству і ў звязку з тым — адкупленню, вучэнню пра грэх і пра Апошні суд.

Задачы Касцёла

Праблема нью-эйдж — сур'ёзная, і нельга яе недаацэньваць, тым больш, што рух нью-эйдж на практыцы часта здаецца заманлівым, асабліва для моладзі, уздзейнічаючы на яе праз пэўныя сегменты, напрыклад, музыку, мастацтва, стыль жыцця. Таму неабходныя паглыбленае навучанне пра Езуса Хрыста, вывучэнне Бібліі, каталіцкай літаратуры і зычлівая засцярога перад гэтым рухам. Існуе столькі цудоўных формаў дзейнасці ў Касцёле: парафіі, рухі, супольнасці. Вялікі тэолаг нашага часу кардынал Ганс Урс фон Бальтазар папярэджваў: «Яшчэ прыйдуць спакусы ад Злога. Гэта будзе спакуса фальшывага вучэння і містыкі Усходу. Чалавек, захліснуты тэхнікаю, скажа: навошта мне Бог?» Такія перасцярогі можна знайсці і ў цытаванай ужо Дэкларацыі *Dominus Iesus*, а таксама ў працах многіх тэолагаў (напрыклад, у Г. Вальдэнфэльса).

Неабходна — і гэта трэба яшчэ раз падкрэсліць — паглыбляць сваю веру і нанава адкрываць Езуса Хрыста. Пра гэта часта нагадваў Ян Павел II. Гэта — праграма «новай евангелізацыі». Евангелізацыйная місійная дзейнасць надае нашай веры і нашаму жыццю новы энтузіязм і новае абгрунтаванне. «Вера ўзмацняецца тады, калі яна перадаецца!» (RMs 2).

Збаўленне па-за Касцёлам у дакументах II Ватыканскага Сабору

«Шмат разоў і па-рознаму прамаўляў калісьці Бог да айцоў нашых праз прарокаў, у гэтыя апошнія дні прамовіў да нас праз Сына, якога ўстанавіў спадкаемцам усяго, праз якога і стварыў сусвет. Ён, будучы адлюстраваннем Ягонай славы і вобразам Ягонай сутнасці і падтрымліваючы ўсё словам моцы сваёй, здзейсніў ачышчэнне ад грахоў, сеў праваруч Велічы на вышынях і стаў настолькі вышэйшым за анёлаў, наколькі больш слаўнае, чым яны, атрымаў у спадчыну імя» (Гбр 1, 1 — 4).

Ці існуе магчымасць збаўлення па-за Касцёлам? Гэтая тэма ўжо часта разглядалася. Калі гаворка заходзіць пра народ Божы, узнікае шмат пытанняў, якія між іншым датычаць людзей, што не належаць да Касцёла праз хрост. Хрост яднае ўсіх хрысціянаў, вера яднае нас таксама з вызнаўцамі іншых рэлігій, а Божая любоў распаўсюджваецца на кожнага чалавека. Бог выбраў сабе адзін народ, вылучыў яго сярод іншых і на працягу вякоў фармаваў яго. Нават у няволі выбраны народ жыў адасоблена. Кожная спроба сыходу з гэтага

шляху асуджалася прарокамі. Для выбранага народу агідныя ідалапаклонства і звязаная з ім амаральнасць. Аднак Стары Запавет паказвае нам, што не народы былі асуджаныя, а іх рэлігіі.

Гэтаксама адбываецца і ў Новым Запавеце. Св. Павел лічыць, што ідалапаклонства і амаральнасць звязаныя з паганскімі рэлігіямі (пар. Рым 1, 18 – 23; 6, 20 – 23; Эф 4, 17 – 19; Клс 3, 5 – 10).

У Дагматычнай канстытуцыі пра Касцёл Сабор ізноў закрануў праблему статусу людзей па-за народам. «Нарэшце тыя, хто яшчэ не прыняў Евангелля, па-рознаму звязаныя з Божым народам» (LG 16). Слова «звязаныя» трэба разумець такім чынам: Бог любіць чалавека, аднак Божы заклік не закранае яшчэ зацікаўленага і ставіць яго пакуль па-за народам. Калісьці ён можа далучыцца да яго, але цяпер яшчэ знаходзіцца па-за ім. Г. Р. Шлеттэ сцвярджае, што розныя канкрэтныя рэлігіі з'яўляюцца рознымі канкрэтнымі шляхамі збаўлення, праз якія Бог можа аб'явіць сваю святасць, але адзінаю і сапраўднаю рэлігіяй Бога ёсць хрысціянства. Гэтаксама Ж. Дзюпуа разважаў, у якой ступені іншыя рэлігіі ўжо з'яўляюцца тым шляхам, што вядзе да адзінага Бога. Таксама, як і Г. Вальдэнфэльс і К. Ранер. Супаставіць з хрысціянствам і прывесці да Езуса Хрыста — вось заданне місіі. Народ Божы, які праходзіць праз гісторыю, вядзе за сабой усіх. Кожны па-свойму ўдзельнічае ў падрыхтоўцы Божага Валадарства.

Касцёл быў пастаўлены перад складанаю праблемаю бязвер'я і атэізму (пар. GS 19 – 21). Сабор тлума-

чыць: «...многія нашы сучаснікі не заўважаюць гэтай глыбокай і жыццёвай сувязі з Богам альбо адкрыта адкідаюць яе» (GS 19). Сабор не асуджае чалавека і дапускае існаванне бязвер'я і атэізму, у якім чалавек невінаваты. Нават атэісты, паколькі ўдзельнічаюць у адзіным пакліканні чалавека, якім з'яўляецца паяднанне з Богам, таксама суадносяцца з народам (пар. GS 19). Сабор сцвярджае: «Касцёл цалкам адкідае атэізм, аднак шчыра вызнае, што ўсе людзі, веруючыя і няверуючыя, павінны рабіць належны ўклад у будаўніцтва гэтага свету, у якім разам жывуць; а гэта не можа адбывацца без шчырага і мудрага дыялогу» (GS 21). Нават атэізм можа стаць спосабам для ачышчэння народу і больш праўдзівага абвяшчэння Евангелля. Праз кантакт з няверуючымі людзьмі вера народу можа паглыбіцца (пар. GS 21). Народ Божы такім чынам вучыцца дыялогу і дае сведчанне свае прыналежнасці да Бога. Адначасова ён застаецца народам, адзіным у гісторыі.

Сабор, тлумачачы вучэнне пра Касцёл, кажа пра колы суадносінаў (пар. LG 14 – 16). Ва ўсёй паўнаце да Касцёла належаць тыя, хто захоўвае еднасць веры, святых сакрамэнтаў, прызнае Папу і жыве ў супольнасці (пар. LG 14). Аднак Сабор сцвярджае, што «да гэтай каталіцкай еднасці Божага народу, якая з'яўляецца знакам будучага ўсеагульнага спакою і спрыяе яму, пакліканы ўсе людзі. Па-рознаму належаць да яе альбо падпарадкаваны ёй як каталіцкія вернікі, так і іншыя, веруючыя ў Хрыста, і, нарэшце, наогул усе людзі, пакліканыя ласкай Божай да збаўлення» (LG 13). Такім чы-

нам, Касцёл нікога не выключае і ні ад кога не адмаўляецца. Другое кола ўтвараюць усе хрысціяне (пар. LG 15). Для місійнай дзейнасці экуменічны рух мае вялікае значэнне, «бо падзел паміж хрысціянамі прыносіць шкоду святой справе абвяшчэння Евангелля ўсялякаму стварэнню і многім закрывае шлях да веры. Таму з прычыны неабходнасці місійнай дзейнасці ўсе ахрышчаныя пакліканы да з'яднання ў адной аўчарні» (AG 6). Паміж місійнаю і экуменічнаю дзейнасцю існуе цесная сувязь. Таямніца адзінства Касцёла адлюстроўвае адзінства Святой Тройцы (пар. UR 2). Паколькі Хрыстус з'яўляецца галавою адзінства (пар. LG 13; UR 2), як і галавою місійнай дзейнасці (пар. LG 6, 7, 14), то хрысталагічны прынцып, які пранізвае экуменізм і місійную дзейнасць і ўгрунтаваны на збаўчай функцыі Хрыста, наказвае хрысціянам быць узаемапаяднанымі. Сабор жа абавязаў каталікаў да місійнага супрацоўніцтва з іншымі хрысціянамі (пар. AG 41). Экуменізм — гэта абавязак місіі і ўмова поспеху (пар. UR 1).

Урэшце, гаворка ідзе таксама пра тых, хто яшчэ не прыняў Евангелля. У Дагматычнай канстытуцыі пра Касцёл Сабор называе габрэяў, мусульманаў, верующых у Бога і людзей добрай волі (пар. LG 16). Апрача таго, у Дэкларацыі пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій ідзе гаворка пра індуізм і будызм (пар. NA 2).

Місійная дзейнасць Касцёла вядзецца на тэрыторыях, дзе ўжо жывуць веруючыя людзі, вызнаўцы старых і новых рэлігій. На практыцы місіянер уваходзіць у свет ужо існуючых рэлігій: традыцыйных (класічных),

плямённых і новых. Першая група найбольш шматліка бытуе ў Азіі, якая слушна лічыцца калыскаю рэлігій. Найбольшымі па колькасці вернікаў рэлігіямі з'яўляюцца іслам, індуізм, будызм, шынтаізм, даасізм, канфуцыянства і юдаізм. Плямённыя рэлігіі існуюць галоўным чынам у Афрыцы. Тым часам новыя, а іх налічваецца больш за дзесяць тысяч, ёсць на ўсіх кантынентах. Новыя рэлігіі часта вызначаюцца як сінкрэтычныя. Касцёл не можа абмінуць факту існавання нехрысціянскіх рэлігій. У часе саборавых пасяджэнняў ад Касцёла чакалася самавызначэнне адносна новых рэлігій. Вынікам гэтага з'яўляецца Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій. Гэтая Дэкларацыя належыць да найважнейшых саборавых дакументаў. Апрача таго, тры іншыя дакументы таксама прысвячаюць сваю ўвагу нехрысціянскім рэлігіям, а менавіта: Дагматычная канстытуцыя пра Касцёл, Дэкрэт пра місійную дзейнасць Касцёла, Дэкларацыя пра рэлігійную свабоду. У сямі іншых дакументах ёсць выразныя згадкі па гэтай тэматыцы. Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій была прынята на IV сесіі Сабору. Па колькасці старонак гэта найменшы дакумент, які, аднак, меў найбольш паправак і найбольш рэдагаваўся. Гісторыя ўзнікнення дакумента ў дастатковай ступені сведчыць пра тыя перамены, якія адбыліся ў Касцёле. Новы погляд на нехрысціянскія рэлігіі — гэта ў пэўным сэнсе камень сутыкнення ў гісторыі Касцёла. Кардынал Франц Кёніг асабліва моцна падкрэсліваў адносіны Касцёла да габрэяў.

Дасаборавыя дакументы Касцёла не заўсёды належным чынам ацэньвалі значэнне новых рэлігій. Іх часта лічылі сферaю дзеяння шатана, падазравалася злая воля іх вызнаўцаў. З даўніх часоў місіянераў хвалявала думка пра тое, ці могуць быць збаўленыя людзі, якія жывуць паводле іншых рэлігій. Прынцыповыя змены ў навучанні Касцёла адбыліся пад уплывам рэлігіязнаўчых навук, асабліва гісторыі рэлігіі. Гэтыя навукі, якія спачатку былі скіраваныя супраць Касцёла, прайшлі эвалюцыю, каб у наш час стаць спосабам пазнання нехрысціянскіх рэлігій, а таксама збліжэння і дыялогу. Гэтаксама можна заўважыць у вызнаўцаў нехрысціянскіх рэлігій зацікаўленасць хрысціянствам.

Сабор адзначыў, што ў чалавеку існуе голад на праўду. Незнаёмасць з хрысціянствам — гэта не толькі вынік злой волі (пар. LG 16). Ёсць вельмі шмат людзей, не ахопленых місійнаю дзейнасцю: «...два мільярды людзей, лічба якіх расце з кожным днём, людзей, якія ствараюць вялікія і ўстойлівыя супольнасці, з'яднаныя трывалымі культурнымі сувязямі, старажытнымі рэлігійнымі традыцыямі і моцнымі грамадскімі сувязямі, яшчэ не чулі альбо пачулі евангельскую навіну зусім нядаўна» (AG 10). Бог праз Езуса жадае, каб усе людзі былі збаўленыя і дайшлі да спазнання праўды (пар. 1 Цім 2, 4). Хрысціянская рэлігія адносна некаторых нехрысціянскіх рэлігій — гэта «запознены прышэлец». Універсальны характар хрысціянства абавязвае нас шырэй зірнуць на праблему збаўлення ў гэтых рэлігіях. Выраз *extra Ecclesiam nulla salus*, які так часта паў-

таралі і, на жаль, якім злоўжывалі, напачатку існаваў як перасцярога для тых, хто губляе еднасць з Касцёлам. Сабор нагадвае: тыя, што не па сваёй віне не пазналі яшчэ Бога і не належаць да Касцёла, але шукаюць Яго шчырым сэрцам, **могуць** атрымаць збаўленне (пар. LG 16). Бог не выключае нікога (пар. Дз 10, 35; LG 9). Такі пазітыўны погляд на тых, хто верыць, але верыць інакш, адкрывае новыя магчымасці для місійнай працы. Асноваю такога шырокага ўспрыняцця Дэкларацыі пра місійную дзейнасць Касцёла была ідэя Касцёла — народу Божага — і новае зразуменне місійнай дзейнасці, якая сыходзіць з яго прыроды (пар. AG 2). Касцёл — гэта зародак і пачатак (пар. LG 5, 9). Ён прыводзіць да збаўлення ўсё чалавецтва. Грунтуючыся на такім бачанні, айцы Сабору канстатавалі, што ў нехрысціянскіх рэлігіях існуюць «добрыя і праўдзівыя» элементы (OT 16), «каштоўныя рэлігійныя і чалавечыя элементы» (GS 92), «зерне» кантэмпляцыі (AG 18), элементы «праўды і ласкі» (AG 9), «зерне слова» (AG 11, 15), што гэтыя рэлігіі «адлюстроўваюць промень той Праўды, якая асвячае ўсіх людзей» (NA 2).

Больш за тое, у сучасным свеце існуе неабходнасць еднасці і ўзаемаразумення. Фактарам, які яднае чалавецтва, павінна стаць рэлігія (пар. DH 15; NA 5). Касцёл пакліканы да місіі паяднання. Навізна дэкларацыі — у выхадзе насустрач іншым рэлігіям. Сабор называе такія рэлігіі як індуізм (пар. NA 2), будызм (пар. NA 2), іслам (пар. NA 3; LG 16) і юдаізм (пар. NA 4). Вялікія рэлігіі канцэнтруюць згаданыя вышэй каштоўнасці,

а таму заслугоўваюць увагі і пашаны. Касцёл прапануе гэтым рэлігіям братэрскі дыялог і жадае яго (пар. NA 2; AG 3, 4, 11). Вызнаўцаў гэтых рэлігій ён называе верующымі, а іх супольнасці лічыць шляхамі да ласкі. Касцёл не выключае магчымасці збаўлення для многіх людзей.

На гэтай падставе II Ватыканскі Сабор вызначыў прынцыпы ўключэння хрысціянаў у дыялог. Аснова для такога дыялогу — сведчанне штодзённага жыцця хрысціянаў, угрунтаванае на любові і павазе (пар. AG 11; AA 14, 29). «Дыялог — гэта найперш стыль дзейнасці, пазіцыя і дух, які асвячае паводзіны. Прадугледжвае ўвагу, пашану і прыязнасць у адносінах да другога чалавека, а таксама прызнанне яго асабістай ідэнтычнасці, яго спосабаў самавыяўлення, яго каштоўнасцяў»*.

Сярод плямённых народаў, раскіданых па розных кантынентах, сустракаюцца разнастайныя формы развіцця матэрыяльнай культуры: ад культураў збіральніцка-паляўнічых да больш развітых культураў гадоўлі жывёлы і земляробства. Гэтаму дыяпазону адпавядае разнастайнасць вераванняў. Там няма занатаванай рэлігійнай думкі, а акты культу выяўляюцца сімваламі. Сістэматызацыя пэўнай рэлігіі здзяйсняецца дзякуючы этналагічнаму аналізу. Бог у гэтых рэлігіях далёкі, Ён не ўмешваецца ў справы чалавека, а той, у сваю чаргу, не пачувае сябе гаспадаром зямлі, а толькі атрымлі-

* *Postawa Kościoła wobec wyznawców innych religii. Dokument Sekretariatu dla Niechrześcijan poświęcony zagadnieniu dialogu i misji*, CT 1985, 55, fasc. IV, s.143.

вае Божыя дары. У плямённых рэлігіях няма мяжы паміж рэлігійным і свецкім жыццём: рэлігія пранізвае ўсё жыццё. Рэлігіям плямёнаў, з хрысціянскага пункту погляду, неабходна ачышчэнне з боку розуму (жыццё ў страху, чары, мясцовая мараль) і з боку ласкі (пазнанне Бога, які ёсць Любоў).

Сярод іншых Сабор называе рэлігію Індыі — індуізм (пар. NA 2). У індуізме мы сутыкаемся з напластаваннем сімвалаў, дактрынаў, філасофій, метадаў і шляхоў, што вядуць да Бога. І агульная аснова — гэта прызнанне *Ведаў* сакральнымі кнігамі. Індуізм у прынцыпе пазбаўлены догматаў, якія «датычаць» Бога, аднак існуюць пэўныя непахісныя ісціны, напрыклад, перасяленне душаў. Мэта, якую ставіць перад сабою індуізм, — гэта вызваленне з бясконцага ланцуга перасялення. Для дасягнення гэтай мэты ён прапануе тры шляхі, пра якія гаворыцца ў Дэкларацыі: «...у індуізме людзі даследуюць боскую таямніцу і выяўляюць яе ў незлічонай колькасці міфаў і ў глыбокіх філасофскіх разважаннях. Яны шукаюць вызвалення ад клопатаў нашага стану альбо праз розныя формы аскетычнага жыцця, альбо праз глыбокую медытацыю, альбо звяртаючыся да Бога з любоўю і даверам» (NA 2).

Першы шлях — гэта аскеза, вядомая пад назваю ёгі. Класічная васьмічленная ёга імкнецца да поўнага вызвалення ад матэрыяльнага свету праз асабістую аскезу, пачуццёвую стрыманасць, кантроль над дыханнем, канцэнтрацыю і медытацыю. Прызнаючы гераічныя высілкі ёгаў, неабходна заўважыць, што поўная ізаля-

цыя ад людзей і свету, да якой імкнуцца ёгі, супярэчыць хрысціянскай канцэпцыі Касцёла як супольнасці. Шлях больш глыбокай медытацыі — гэта спосаб прывесці душу да зліцця з Богам праз разважанне над сакральнымі тэкстамі і аналіз свайго стану пад кіраўніцтвам гуру. Асаблівая ўвага звяртаецца на эмацыйнае пазнанне Бога. Прыкладамі хрысціянска-індускага збліжэння можа быць усё большая колькасць хрысціянскіх ашрамаў і каталіцкіх інстытутаў, якія дзейнічаюць у Індыі.

Паміж будызмам і хрысціянствам існуюць прынцыповыя адрозненні. Хрысціянін ведае, што цярпенне мае сэнс, яно ачышчае і збаўляе чалавека. Грунтуючыся на веры, ён ведае, што ўсе падзеі падпарадкоўваюцца не безаблічным касмічным праўдам, а Божай мудрасці і Провіду. Ад будызму можна вучыцца адстароненасці ад часовых зямных каштоўнасцяў. Для хрысціяніна гэта заўсёды будзе толькі сродкам для паяднання з Хрыстом, а не самамэтаю.

У разглядаемым дакуменце вядзецца гаворка таксама пра іслам: «Касцёл з павагай ставіцца да мусульманаў, якія пакланяюцца адзінаму Богу, жывому і самаіснаму, міласэрнаму і ўсемагутнаму, Стварыцелю неба і зямлі, які размаўляў з людзьмі. Яны імкнуцца ўсёй душой падпарадкоўвацца Яго пастановам, нават патаемным, як падпарадкаваўся Богу Абрагам, да якога ахвотна звяртаецца ісламская вера. Хоць яны не прызнаюць Езуса Богам, аднак ушаноўваюць Яго як прарока, ушаноўваюць таксама Яго Маці, Дзеву Марыю, а часам нават з пабожнасцю Яе заклікаюць. Акрамя гэтага, яны

чакаюць Суднага дня, калі Бог будзе справядліва ўзнагароджваць усіх уваскрослых людзей. Таму яны цэняць маральнае жыццё і пакланяюцца Богу асабліва праз малітву, міласціну і пост» (NA 3). У дакуменце падкрэсліваецца тое, што яднае хрысціянаў з магаметанамі, не замоўчваюцца адрозненні, якія датычаць Езуса Хрыста і Найсвяцейшай Тройцы. У ім згадваюцца пяць «стаўпоў» ісламу: вызнаванне веры, рытуальная малітва (пяць разоў на працягу дня), строгі пост у Рамадане, міласціна і паломніцтва ў Мекку. Дэкларацыя заклікае хрысціянаў і вызнаўцаў ісламу забыць мінулае і супольна абараняць і развіваць грамадскую справядлівасць, маральнае багацце, спакой і свабоду (пар. NA 3).

Урэшце, Сабор гаворыць пра цесную повязь з габрэямі. Іх рэлігія была падрыхтоўкаю да прыходу Месіі. Касцёл жадае «ажывіць і аб'яднаць узаемапазнанне», выпраўляе існуючыя меркаванні пра адрынутасць габрэяў альбо пра тую віну, якую яны нясуць за смерць Езуса (пар. NA 4).

Дэкларацыя звяртаецца да вернікаў Касцёла: «Таму Касцёл заклікае сваіх дзяцей, каб праз дыялог і супрацоўніцтва з паслядоўнікамі іншых рэлігій яны разважліва і з любоўю, даючы сведчанне веры і хрысціянскага жыцця, прызнавалі, захоўвалі і падтрымлівалі тыя духоўныя і маральныя даброты, а таксама сацыяльна-культурныя каштоўнасці, якія ў іх знаходзяцца» (NA 2).

Замест ранейшай варожасці і частай прадузятасці Касцёл прапануе братэрскі дыялог і супрацоўніцтва. Шлях да такога новага погляду падрыхтавала Дагматыч-

ная канстытуцыя пра Касцёл *Lumen gentium*. Не было б таксама такога ўспрыняцця саборавага вучэння, калі б не такія дакументы як Дэкрэт пра місійную дзейнасць Касцёла, Дэкларацыя пра рэлігійную свабоду альбо Дэкрэт пра сродкі масавай камунікацыі. Названыя дакументы аказалі ўплыў на атмасферу выпрацоўкі пастановаў, гэтаксама як і на далейшае іх ажыццяўленне.

Вялікую ролю ў сучасным свеце выконваюць сродкі масавай камунікацыі: прэса, радыё, кіно, тэлебачанне. Яны сталі неад'емнымі часткамі жыцця і актыўна фармуюць яго. Сабор прысвяціў гэтым пытанням спецыяльны дэкрэт пра сродкі масавай камунікацыі, роля якога ў місійнай справе цэніцца ўсё больш. Сродкі масавай камунікацыі ствараюць сваю атмасферу ў сённяшнім свеце, маюць вялікі ўплыў на фармаванне грамадскай думкі, з'яўляюцца надзеяй Касцёла ў евангелізацыі свету. Дзякуючы ім можа наступіць узаемапазнанне. «Каталіцкі Касцёл быў устаноўлены Хрыстом Панам, каб усім людзям несці збаўленне. Таму, усведамляючы неабходнасць прапаведавання Евангелля, ён лічыць сваім абавязкам абвяшчаць збаўчую навіну таксама пры дапамозе сродкаў масавай камунікацыі» (IM 3). У Пастырскай інструкцыі да Дэкрэта чытаем: «Сродкі масавай камунікацыі шмат робяць для адкрыцця ўсім хрысціянскага вучэння».

У духу саборавага аднаўлення 18 мая 1964 года Паўлам VI быў створаны Сакратарыят для нехрысціянаў, што сведчыць пра саборавую атмасферу адзінства і паразумення. Новае значэнне атрымаў хрысціянска-

ісламскі дыялог. Тэкст дэкларацыі на тэму ісламу здзівіў як католікаў, так і магаметанаў. Гэтае пытанне доўга рыхтавалася найперш місіянерамі, асабліва «белымі айцамі». Падчас Сабору існавалі жывыя кантакты Касцёла з ісламам, што аблегчыла айцам Сабору знаёмства з ісламам.

Вялікаю падзеяй стала лекцыя арцыбіскупа Вены кардынала Франца Кёніга ва універсітэце Аль Азхар у Каіры ў 1965 годзе. Нельга таксама не сказаць пра беспрэцэдэнтную падзею, якою стала пілігрымка Паўла VI у Святую Зямлю ў 1964 годзе. Сардэчны прыём Папу падрыхтавалі менавіта магаметане.

Дыялог, распачаты Саборам, працягваецца. Існуе ўжо багатая бібліяграфія гэтага дыялогу, якая дае магчымасць добра падрыхтавацца да ўзаемных сустрэчаў. Гэты дыялог таксама ахоплівае неназваныя афрыканскія рэлігіі. Узніклі шматлікія навуковыя інстытуты. Аднак прызнанне багацця і каштоўнасці розных рэлігій не можа весці да нейкага рэлігійнага сінкрэтызму. Каштоўнасць хрысціянства застаецца бясспрэчнаю (пар. NA 4). Усе каштоўнасці, якія існуюць у свеце, паходзяць ад Бога і кіруюцца да Яго (пар. NA 1). Абапіраючыся на думку св. Паўла, Касцёл бачыць сэнс у тым, каб весці дыялог і місіі сярод нехрысціянаў. Абвяшчэнне Евангелля любові — гэта шлях да адзінства людзей, якіх усё яшчэ шмат што падзяляе. Калі мы прымаем універсальны характар ласкі, то нельга супрацьпастаўляць хрысціянства нехрысціянскім рэлігіям. Нельга таксама паказваць (як гэта робіць К. Барт) нехрысціянскія рэлігіі

як намаганні, што ідуць знізу, з мэтаю атрымання ўлады над Богам. Бог хоча збавіць кожнага чалавека, Ён праводзіць яго рознымі шляхамі і выкарыстоўвае шматлікія спосабы. Самы кароткі і найбольш пэўны шлях той, які вядзе праз Касцёл, таму Касцёл выходзіць насустрач рэлігіям (пар. NA 2). У гэтым дыялогу абавязковае ачышчэнне і пазбаўленне ад таго, што перашкаджае дайсці да Хрыста.

У кожнай рэлігіі ёсць людзі, нейкім чынам паяднаныя з Хрыстом, калі яны нават і не ўсведамляюць гэтага (пар. LG 16). Карл Ранэр называе іх «ананімнымі хрысціянамі». Хоць кожная рэлігія пэўным чынам яднае чалавека з Богам, нельга ўспрымаць гэтае вызначэнне К. Ранэра павярхоўна і вырываць яго з кантэксту. Хрысціянства цэніць вартасці гэтых рэлігій, але не можа прыняць іх цалкам. Абодва гэтыя аспекты сумяшчае эсхаталагічная перспектыва (пар. Іс 2 – 3; Міх 4, 1 – 2; Мц 8, 11 – 12). Таксама ў гэтым кантэксце паўстае абавязак місійнай дзейнасці Касцёла, якая, на думку Дж. Джэрэміяса, з'яўляецца «часткаю канчатковага спаўнення, дадзеным Богам фактычным доказам інтранізацыі Сына Чалавечага, эсхаталогіяй, якая ўжо знаходзіцца ў працэсе ажыццяўлення»*.

---

* Пар. B. Wodecki, *Idea misyjna w Piśmie św. Nowego Testamentu*, „Ateneum Kapłańskie" 1969, 360, s. 26 – 27.

Дыялог і місіі

Місіі *ad gentes* праводзяцца на тэрыторыях і сярод народаў, якія вызнаюць Бога і часта нават маюць глыбокую веру. Місіянер сутыкаецца з веруючымі людзьмі, таму місійная дзейнасць — гэта форма дыялогу. Існуе вялікая неабходнасць весці дыялог як унутры Касцёла, так і экуменічны і міжрэлігійны. Дастаткова прыгадаць тэму II Экуменічнай канферэнцыі, якая праходзіла ў аўстрыйскім Грацы ў 1997 годзе: «Паяднанне — Божы дар і крыніца новага жыцця». Становіцца ўсё больш зразумелым, што ў эпоху паяднання свету хрысціянства не можа быць тым адзіным «месцам», дзе яшчэ існуюць муры. Паяднанне — гэта найбольш адпаведны шлях будавання еднасці, асабліва, калі мы хочам звяртацца да тых, што «яшчэ не вераць у Хрыста» (AG 6).

Абвяшчаць Евангелле ці весці дыялог?

«Нястомнае місійнае прапаведаванне Касцёла знаходзіцца сёння пад пагрозаю рэлятывісцкіх тэорый, якія намагаюцца апраўдаць рэлігійны плюралізм не толькі *de facto*, але таксама *de iure* (альбо як прынцып).

У выніку прызнаюцца састарэлымі, напрыклад, такія праўды, як праўда пра канчатковы і цалкавіты характар аб'яўлення Езуса Хрыста, пра прыроду хрысціянскай веры ў дачыненні да вераванняў іншых рэлігій, пра натхнёны характар кніг Святога Пісання, пра асобавае паяднанне паміж адвечным Словам і Езусам з Назарэта, пра еднасць збаўчага плану ўцелаўлёнага Слова і Духа Святога, пра адзінасць і збаўчую паўсюднасць таямніцы Езуса Хрыста, пра паўсюднае збаўчае пасрэдніцтва Касцёла, пра непадзельнасць, нягледзячы на адрозненні, Валадарства Божага, Валадарства Хрыста і Касцёла, пра існаванне ў Каталіцкім Касцёле адзінага Хрыстовага Касцёла» (DI 4).

Недахоп адзінства — гэта перашкода...

Напрыканцы XX стагоддзя як хрысціяне мы складалі толькі 33% чалавецтва ў свеце. Непакоіць той факт, што колькасць людзей, якія не ведаюць Евангелля, увесь час павялічваецца. II Ватыканскі Сабор бачыць прычыну такога стану ў недахопе дыялогу: «Адсутнасць еднасці выразна супярэчыць волі Хрыста, з'яўляецца спакусай для свету і пры гэтым прычыняе шкоду найсвяцейшай справе абвяшчэння Евангелля ўсялякаму стварэнню» (UR 1). Як жа мы можам з упэўненасцю звяртацца да тых, хто яшчэ не ведае Хрыста? У архісвятарскай малітве выразна падкрэсліваецца сувязь адзінства з сапраўдным сведчаннем: «Каб усе былі адно, як Ты,

Ойча, ува Мне, і Я ў Табе, каб і яны былі ў Нас, каб паверыў свет, што Ты паслаў Мяне» (Ян 17, 21).

«Каб былі адно» і «каб свет паверыў»: падкрэсленыя два сегменты фразы паказваюць сувязь адзінства з місіяй. Місія як абвяшчэнне і ўвасабленне Любові, якою з'яўляецца сам Бог, магчымая толькі ў атмасферы адзінства. Зразумела, місіі праводзіліся і праводзяцца цяпер таксама падзеленымі хрысціянамі, рознымі хрысціянскімі Касцёламі, якія часта жывуць ізалявана. Аднак узнікае пытанне: які плён такой дзейнасці? Перадача Евангелля і місія Касцёла ў пэўным сэнсе збедненыя.

Ужо на экуменічнай канферэнцыі ў Эдынбургу (1910 г.), якая адначасова была місійнаю канферэнцыяй, была звернута ўвага на сувязь паміж гэтымі двума вымярэннямі ў жыцці Касцёла. Тая падзея стала важным момантам у новым поглядзе на Касцёл.

Новае вымярэнне місійнай справы

Місія *ad gentes* сёння часта развіваецца ў супрацоўніцтве з іншымі хрысціянскімі Касцёламі. Трэба таксама адзначыць экуменічны радавод місіялогіі. Ё. Шмідлін (†1944 г.), бацька каталіцкай місіялогіі, абапіраўся на працы Г. Варнэка: «Сучасная каталіцкая місіялагічная навука ўзнікла, грунтуючыся на пратэстанцкай місіялогіі. О. П. Шарль SJ, адзін з галоўных натхняльнікаў сучаснага місійнага рэнесансу ў Каталіцкім Касцёле, ніколі не хаваў, што ў галіне місійнай

тэалогіі абавязаны многім даследаванням і працам адлучаных братоў».

Грунтуючыся на супольным досведзе ў тэалагічнай сферы, можна і трэба шукаць новае вымярэнне рэалізацыі місійнай справы. Місійная справа — гэта абвяшчэнне свету, што Бог першы палюбіў чалавека, што Ён адкупіў яго праз Езуса Хрыста. Гэта форма служэння паяднанню, бо першая евангелізацыя скіравана на прыняцце хросту, на паяднанне, і яна вымагае дыялогу. Папа Ян Павел II гаворыць таксама пра «дзейнасць для еднасці хрысціянаў, каб місійная актыўнасць магла стаць больш эфектыўнаю. Разам з тым мы не павінны забываць, — піша Папа, — што гэтыя намаганні, скіраваныя на карысць адзінства, самі па сабе ўжо з'яўляюцца знакам паяднання, якое Бог здзяйсняе сярод нас» (RMs 50).

Такім чынам, у місійнай дзейнасці трэба шукаць самыя розныя магчымасці такога супрацоўніцтва, каб свет мог прыняць Езуса Хрыста. Інтэграцыя Міжнароднай місійнай рады з Сусветнаю радаю Касцёлаў на з'ездзе ў Нью Дэлі (1961 г.) стала момантам яшчэ большага зразумення сувязі прыроды місіі са справаю адзінства. На канферэнцыі ў Сант'яго дэ Кампастэла (1993 г.) быў падкрэслены аспект гэтай супольнасці — «*koinonia* ў веры, жыцці і сведчанні». Маюць сваё значэнне таксама супольныя навуковыя працы экуменічнага маштабу, якія праводзяцца *International Association for Mission Studies* (IAMS), што збірае місіёлагаў розных веравы-

знанняў і хрысціянскіх намінацый, а таксама іншыя ініцыятывы, праяўленыя Папам Янам Паўлам II і цяпер Бэнэдыктам XVI.

Існуе шмат магчымасцяў супрацоўніцтва ў місіянерскай практыцы: клопат пра спакой і годнасць асобы, асабліва пра людзей адрынутых і інвалідаў, дзяцей і жанчынаў; праца на карысць развіцця ў сферы адукацыі, аховы здароўя, гуманітарнай дапамогі. Аднак існуе небяспека звядзення тэалагічных прынцыпаў місійнай справы да сацыялагічна-лінейнага вымярэння з выкарыстаннем паняццяў гуманізацыі альбо трансфармацыі як мэты місійнай дзейнасці. Такі кірунак можа выклікаць замяшанне ў тых, хто сумленна шукае Праўды сярод падзелаў паміж хрысціянамі і ў свеце, без таго ўжо разарваным іншымі падзеламі.

І ўсё ж супрацоўніцтва магчымае, хоць існуюць яшчэ падзелы. Хрысціяне ўжо могуць даваць супольнае сведчанне ў свеце, які прагне паслання любові, пра збаўленне ў Езусе Хрысце. Місійная справа і экуменічны рух, паводле вучэння Каталіцкага Касцёла, маюць тую самую аснову — Адзінага ў Тройцы Бога (пар. AG 2) і той самы хрост (пар. UR 2). Мы ўжо як хрысціяне адказныя за справу Езуса Хрыста ў свеце. Нам не павінны быць абыякавы той факт, што яшчэ столькі людзей не спазнала сапраўднай **Любові**. Абавязак усіх хрысціянаў найперш шукаць шляхоў адзінства сярод усіх ахрышчаных, каб дыялог з усімі людзьмі рыхтаваў шлях да Хрыста. Указальнікам няхай будуць сло-

вы св. Паўла, якія з'яўляюцца мостам і пачаткам пасаборавага дыялогу: «Жывучы сапраўды ў любові, учынім, каб усё ўзрастала да Таго, хто ёсць Галавою — да Хрыста» (Клс 4, 15).

Літаратура

Górski J., *Odpowiedzi na 101 pytań o misje*, Kraków 2005.

Хрысціянска-ісламскі дыялог

Лекцыя Папы Бэнэдыкта XVI ва універсітэце ў Рэгенсбургу выклікала жывую дыскусію, якая датычыла як праблемаў, так і стану, а таксама перспектываў дыялогу паміж дзвюма вялікімі монатэістычнымі рэлігіямі*. Праз шмат гадоў дыялогу на «пастырскім» узроўні ўзнікла неабходнасць па-новаму зірнуць на тэалагічныя пытанні. Такія думкі з'явіліся не толькі сярод хрысціянаў, але таксама сярод магаметанаў. Уплыў на пошукі новых сустрэчаў мелі памятныя падзеі 2001 года і пазнейшыя ў розных частках свету. Адсюль сыходзіць жывая зацікаўленасць станам і перспектывамі дыялогу паміж дзвюма рэлігіямі.

Рэлігія «суседства»

Самі вызнаўцы ісламу лічаць, што яны маюць агульнае з габрэямі і хрысціянамі паходжанне веры. Ужо сама кваліфікацыя ісламу як монатэістычнай рэлігіі

* Пар. Benedykt XVI, *Wiara, rozum i uniwersytet*. Wykład na Uniwersytecie w Regensburgu, tekst polski.

сведчыць, што хрысціяне і мусульмане блізкія паміж сабою. Св. Ян Дамаскін (650 – 754 гг.), які добра ведаў арабскую культуру і рэлігію, лічыў мусульманаў хрысціянскаю сектаю. Ад самага пачатку існавання іслам шукае сярод «людзей Кнігі», г. зн. хрысціянаў і габрэяў, патэнцыяльных вызнаўцаў сваёй рэлігіі*. Паказальны ў гэтым сэнсе тэкст Карана:

«Мы табе таксама спаслалі Кнігу з праўдаю, пацвярджаючы сапраўднасць Кнігі, якая была перад ёю, і ахоўваючы яе. <...> Таму імкніцеся старанна здзяйсняць добрыя справы. Да Бога вернецеся ўсе разам. Ён абвесціць вам тое, у чым вы адрозніваліся» (К 5:48)**.

У папярэднім тэксце знаходзім выразнае ўказанне на значэнне Торы для вызнаўцаў юдаізму (К 5:44) і Евангелля для хрысціянаў (К 5:46). Майсей даў габрэям Тору, Езус хрысціянам даў Евангелле, але вяршыняю аб'яўленняў з'яўляецца Каран.

Трэба таксама адзначыць, што ў традыцыйнай канцэпцыі ісламскай супольнасці да «людзей Кнігі» толькі талерантна адносяцца, часта не даючы магчымасці практыкаваць сваю рэлігію. Маецца на ўвазе абмежаванне ў адносінах да хрысціянаў у многіх ісламскіх краінах. Гэта праблема неаднаразова закраналася Янам Паўлам II, напрыклад, у сувязі з перадачай мусульманам мячэці ў Рыме.

---

* Пар. O. N. Mohammed, *Muslim-Christians Relations*, New York 1999, s. 55 – 57.

** Пар. *Koran*, tł. J. Bielawski, Warszawa 1986.

Калі сыходзіць з гістарычнай перспектывы, то іслам выкарыстоўваў недахопы хрысціянскага жыцця. Нашэсце ісламу ў Паўночнай Афрыцы (VII – VIII стст.) выклікала паглынанне Каталіцкага Касцёла на гэтай тэрыторыі. Уласна кажучы, хрысціяне асаблівым чынам падрыхтаваныя ўжо прыняць новую рэлігію. Відавочна, што хрысціянскія элементы, якія ёсць у Каране, падказваюць вызнаўцам ісламу кірунак іх дзеянняў.

Гістарычная памяць

Ва ўзаемаадносінах вялікае значэнне мае гістарычная памяць. Складаныя гістарычныя падзеі, якія тут згадваюцца, — гэта не толькі метад, што ўскладняе паразуменне, але й адметная рыса Усходу, дзе гістарычная памяць значна глыбейшая. Гэтага нельга ігнараваць, распачынаючы дыялог. Недахоп узаемапавагі да розных светапоглядаў вёў да стварэння негатыўных вобразаў і ўзаемнай непрыязнасці, якая ішла ўслед за гэтым*. Перажыванне нават даўніх падзеяў падказвае, што нельга ігнараваць гісторыі ўзаемных сустрэчаў, якія часам з'яўляюцца ўспамінам такіх далёкіх падзеяў, як Крыжовыя паходы.

Усе мы — «дзеці Абрагама»

Як габрэі, хрысціяне, так і мусульмане бачаць сябе дзецьмі Абрагама. Вызнаўцы ісламу выводзяць свой

* Пар. O. N. Mohammed, *тамсама*, s. 45.



Каран (Кашмір, XVIII ст.)

генезіс ад Ізмаіла, сына Абрагама з рабыняю Агар. Бог не забраў свайго благаслаўлення для Ізмаіла:

«Што з табою, Агар? Не бойся, бо пачуў Бог голас хлопца адтуль, дзе ён быў. Устань, падымі хлопца і вазьмі яго за руку, бо Я выведу з яго вялікі народ» (Быц 21, 17 — 19).

Праўда пра паходжанне больш шырокай групы веруючых у Бога ад гэтай «веры Абрагама» была развітая св. Паўлам. Зразумела, што Апостал не ўказваў *expresis verbis* на іслам, якога яшчэ не было, але ягонае даследаванне можа быць асновай для пошукаў больш глыбокіх падставаў дыялогу:

«Зразумейце, што тыя, хто верыць, гэта сыны Абрагама. І Пісанне, якое прадбачыла, што Бог праз веру апраўдае язычнікаў, ужо Абрагаму абвясціла добрую

навіну: У табе благаслаўлёныя будуць усе народы. Таму тыя, хто верыць, будуць благаслаўлёныя разам з верным Абрагамам» (Гал 3, 7 – 9).

Да гэтай асаблівай сувязі звяртаецца і II Ватыканскі Сабор у Дэкларацыі пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій: «Касцёл з павагай ставіцца да мусульманаў, якія пакланяюцца адзінаму Богу, жывому і самаіснаму, міласэрнаму і ўсемагутнаму, Стварыцелю неба і зямлі, які размаўляў з людзьмі. Яны імкнуцца ўсёй душой падпарадкоўвацца Яго пастановам, нават патаемным, як падпарадкаваўся Богу Абрагам, да якога ахвотна звяртаецца ісламская вера» (NA 3).

У гэтым фрагменце, у якім апісваюцца якасці Бога, мы бачым выразны зварот да зместу Карана. Далей называецца асоба Езуса, якога мусульмане хоць і не прызнаюць Богам, «аднак ушаноўваюць Яго як прарока, ушаноўваюць таксама Яго Маці, Дзеву Марыю, а часам нават з пабожнасцю Яе заклікаюць» (NA 3). Пазней Ян Павел II у гэтай плоскасці бачыў магчымасці паразумення і дыялогу. Абрагам не замяняе Езуса, але вера ў Езуса робіць нас дзецьмі Абрагама. Далей каталіцкая тэалогія, развіваючы гэтую думку, вучыць, што як і хрысціяне, так і мусульмане з'яўляюцца дзецьмі Абрагама, згодна са сваёю вераю*.

---

* Пар. O. N. Mohammed, *тамсама*, s. 78.

Езус

Тым, што ў дактрынальнай плоскасці істотна адрозніваe іслам і хрысціянства, з'яўляецца Асоба Езуса Хрыста, Сына Божага і Збаўцы свету. Догмат хрысціянскай веры, выказанай у *Credo*, выразна сфармуляваны: «Бог сапраўдны з Бога сапраўднага, народжаны, а не створаны, адзінасутны Айцу». Гэтую праўду выпрацавалі Нікейскі (325 г.) і Халкедонскі (451 г.) Саборы, а нанава яна была згадана ў Дэкларацыі *Dominus Iesus* (н. 6 і 10). Асоба Езуса Хрыста ў цэнтры веры — істотная і вырашальная для сувязі з іншымі рэлігіямі. Гэтая тэма ў наш час закраналася такімі вялікімі тэолагамі як К. Ранэр, Ё. Ратцынгер, В. Каспер, Ф. Кёніг, Ж. Дзюпуа, Г. Вальдэнфэльс.

Іслам прызнае Езуса толькі як чалавека, прарока, прычым па іерархіі ніжэйшага за Магамета. Такі падыход скажае ўсю непаўторную ролю Езуса Хрыста ў гісторыі, асабліва Яго збаўчую Муку і Адкупленне, здзейсненае на крыжы. Таму так ахвотна выкарыстоўваюцца апокрыфы, асабліва Евангелле ад Тамаша, скіраваныя да хрысціянаў, якія добра не ведаюць Святога Пісання.

Дыялог

У сувязі з акрэсленым асноўным адрозненнем у падыходзе да Асобы Езуса Хрыста паўстае пытанне пра магчымасць дыялогу. Дыялог прадугледжвае пашану да партнёра, выслухоўванне яго аргументаў і супольныя пошукі праўды. Такі цяжкі дыялог у саборавым духу вёў

Ян Павел II. Ён пастаянна звяртаўся да вучэння II Ватыканскага Сабору, які радыкальна змяніў пазіцыю Касцёла адносна іншых рэлігій*. Папа ў самых розных выпадках нястомна працягваў складаны дыялог і верыў, што гэты шлях правільны. Тут неабходна прыгадаць яго пілігрымкі, у якіх ён з'яўляўся сярод мусульманаў: у Пакістане (1981 г.), Марока (1985 г.), Сенегале (1992 г.), Сірыі (2000 г.), а таксама шматлікія выступленні і звароты да мусульманаў, скіраваныя з Рыма.

«Дакумент, які Сабор прысвяціў нехрысціянскім рэлігіям, найперш поўны глыбокай павагі да іх вялікіх духоўных каштоўнасцяў, зразумела, найперш да таго, што духоўнае і што ў чалавечым жыцці выяўляецца праз рэлігію і, у сваю чаргу, праз маральнасць, уплываючы на ўсю культуру. Айцы Касцёла слушна бачылі ў розных рэлігіях як бы адлюстраванне аднае праўды *Semina Verbi*, як сведчанне таго, што хоць і на розных шляхах, але ж як бы ў адным кірунку пасоўваецца гэта найглыбейшае памкненне людскога духу, якое праяўляецца ў пошуках Бога і разам з тым у пошуках — праз імкненне да Бога — поўнага вымярэння чалавечнасці, поўнага сэнсу людскога жыцця» (RH 11).

«Мусульмане праслаўляюць адзінага Бога, указваюць на сваю сувязь з Абрагамам, аддаюць пашану Хрысту і ўшаноўваюць Марыю, атуляюць павагаю ма-

* Пар. *John Paul II and Interreligions Dialogue*, ed. B. L. Sherwin, H. Kasimow, New York 1999.

ральнае жыццё, малітву і пост. Каталіцкі Касцёл прызнае праўду і дабро, якія ёсць у гэтых рэлігіях, і бачыць у іх адлюстраванне праўды Хрыста, якога лічыць „дарогаю, праўдаю і жыццём" (Ян 14, 6). Ён жадае таксама зрабіць усё магчымае, каб развіваць супрацоўніцтва з іншымі веруючымі з мэтаю аховы ўсяго, што ёсць добрага ў іх рэлігіях і культурах»*.

Метадалогія дыялогу

Працытаваны Бэнэдыктам XVI тэкст размовы з XIV стагоддзя паміж візантыйскім імператарам Мануэлем II Палеалогам і адукаваным персам выклікае думку пра магчымасць абмену меркаваннямі ў сферы навукі. Тое, што было магчымым у Сярэднявеччы, цяпер недапушчальнае? Атмасфера, якая ўзнікла пасля лекцыі, ужо раней была заўважана Г. Вальдэнфэльсам: «Хрысціяне занадта доўга адчувалі падтрымку атачэння, і гэта спрыяла таму, што яны не адчувалі неабходнасці імкнуцца да ведаў і рэлігійных практыкаў. Вынікам гэтага ў сферы рэлігіі стала сумесь страху і цікаўнасці, як і адпрэчванне крытыкі і абыякавасці. Усё гэта звычайна прыкрываецца заклікам да талерантнасці. Шок, выкліканы страшнымі тэрарыстычнымі атакамі, учыненымі 11 верасня 2001 года ў Нью-Ёрку і Вашынгтоне, адкрыў вочы грамадствам Захаду на прысутнасць ісламу. Разам з тым афіцыйная рэакцыя на гэтую па-

* Jan Paweł II, *Orędzie do narodów Azji* (1981).



Святы Айцец Бэнэдыкт XVI з Вялікім муфціем Стамбула Мустафой Кагрысі падчас наведвання мячэці Султанахмет, так званай «Блакітнай мячэці», — галоўнай мусульманскай святыні Турцыі. 30 лістапада 2006 г.

дзею, таксама ў Германіі, аказалася нервоваю і баязліваю, замест таго, каб успрыняць гэтую рэчаіснасць з веданнем справы і зразуменнем»*.

Дыялог не павінен пазбягаць праўды, гэта значыць, што ён павінен закранаць і складаныя праблемы. Такое заданне паставіў II Ватыканскі Сабор, даючы ў Касцёле магутны ход дыялогу. Дыялог — гэта каштоўнасць сама па сабе. Хоць ён і адрозніваецца ад евангелізацыйнай місіі Касцёла, аднак праз сам факт сустрэчы з'яў-

* H. Waldenfels, *Chrystus a religie*, Kraków 2004, s. 5.

ляецца падрыхтоўкаю да адкрыцця на Божыя планы ўсіх бакоў дыялогу. Я. Урбан вызначае аспекты сапраўднага дыялогу і некаторыя з іх варта працытаваць: «адносіны да іншага чалавека з пункту погляду іншай рэлігіі; уменне зірнуць на сябе самога; уменне заўважыць тое, чаго чакае свет»*. Дыялог, пры ўсёй павазе да суразмоўцы, партнёра дыялогу, павінен даць магчымасць выказаць свае аргументы. Палітыка, далучаная да сферы рэлігійнага дыялогу, часта пазбаўляе магчымасці весці дыялог у тэалагічнай плоскасці. Пілігрымка Бэнэдыкта XVI у Турцыю, якая стала своеасаблівым працягам распачатага раней дыялогу, выразна паказала, аднак , такія магчымасці. Папа, хоць яго раней і моцна крытыкавалі, змог сустрэцца з мусульманамі і ў мячэці ўшанаваць разам з імі адзінага Бога.

* J. Urban, *Dialog międzyreligijny w posoborowych dokumentach Kościoła*, Opole 1999, s. 87.

Выбар тэкстаў II Ватыканскага Сабору пра рэлігіі

Дагматычная канстытуцыя пра Касцёл *Lumen gentium*

LG 16: «Нарэшце тыя, хто яшчэ не прыняў Евангелля, па-рознаму звязаны з Божым народам. У першую чаргу гэта той народ, які першы атрымаў запавет і абяцанне і з якога паводле цела нарадзіўся Хрыстус (пар. Рым 9, 4 – 5), народ, умілаваны дзеля айцоў з прычыны выбрання, таму што Бог не шкадуе аб дарах і пакліканні (пар. Рым. 11, 28 – 29). Але план збаўлення ахоплівае таксама тых, хто прызнае Стварыцеля, і сярод іх у першую чаргу мусульманаў, якія, вызнаючы сваю прыхільнасць да веры Абрагама, пакланяюцца разам з намі адзінаму і міласэрнаму Богу, які будзе судзіць людзей у апошні дзень. Недалёка Бог і ад тых, хто шукае невядомага Бога навобмацак і сярод цялесных выяваў, паколькі Ён усім дае жыццё, дыханне і ўсё (пар. Дз 17, 25 – 28), таму што Збаўца хацеў, каб усе людзі былі збаўлены (пар. Цім 2, 4)».

Дэкрэт пра місійную дзейнасць Касцёла *Ad gentes*

AG 3: «Гэты паўсюдны Божы план збаўлення чалавецтва здзяйсняецца не толькі таямніча, у чалавечым розуме альбо праз ініцыятывы, нават рэлігійныя, пры дапамозе якіх людзі па-рознаму шукаюць Бога, „можа, намацаюць і знойдуць Яго, бо Ён недалёка ад кожнага з нас" (Дз 17, 27). Згаданыя ініцыятывы патрабуюць асвячэння і аздараўлення, хоць паводле ласкавага прысуду добрага Бога можна часам лічыць іх выхаваўчымі шляхамі да сапраўднага Бога альбо евангельскай падрыхтоўкай».

AG 9: «Тое, што з праўды і ласкі народы ўжо мелі дзякуючы як бы ўкрытай прысутнасці Бога, яна вызваляе ад шкодных уплываў і вяртае свайму Стварыцелю, Хрысту, які руйнуе ўладу сатаны і стрымлівае зло розных злачынстваў».

AG 10: «Бо два мільярды людзей, лічба якіх расце з кожным днём, людзей, якія ствараюць вялікія і ўстойлівыя супольнасці, з'яднаныя трывалымі культурнымі сувязямі, старажытнымі рэлігійнымі традыцыямі і моцнымі грамадскімі сувязямі, яшчэ не чулі альбо пачулі евангельскую навіну зусім нядаўна. Некаторыя з іх вызнаюць адну з вялікіх рэлігій, для іншых чужым з'яўляецца само паняцце Бога, хтосьці выразна аспрэчвае Яго існаванне...».

AG 34: «Правільная і ўпарадкаваная місійная дзейнасць патрабуе, каб евангельскія працаўнікі былі навукова падрыхтаванымі да сваіх заданняў, асабліва да дыялогу з нехрысціянскімі рэлігіямі і культурамі».

Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій *Nostra aetate*

NA 2: «Ужо са старажытнасці і да цяперашняга часу ў многіх народаў існуе пэўнае адчуванне таямнічай сілы, якая прысутнічае ў хадзе спраў і ў падзеях чалавечага жыцця, а часам і прызнанне Найвышэйшага Боства ці нават Айца. Гэтае адчуванне і гэтае прызнанне напаўняе іх жыццё глыбокім рэлігійным зместам. Рэлігіі, якія звязаны з прагрэсам культуры, імкнуцца адказаць на гэтыя ж пытанні пры дапамозе больш далікатных паняццяў і больш распрацаванай мовай. Так, у індуізме людзі даследуюць боскую таямніцу і прадстаўляюць яе ў незлічонай колькасці міфаў і ў глыбокіх філасофскіх разважаннях. Яны шукаюць вызвалення ад клопатаў нашага стану альбо праз розныя формы аскетычнага жыцця, альбо праз глыбокую медытацыю, альбо звяртаючыся да Бога з любоўю і даверам. Будызм, у розных сваіх формах, прызнае радыкальную недастатковасць гэтага зменлівага свету і навучае таму шляху, на якім людзі з пабожнай і даверлівай душой могуць дасягнуць стану дасканалай свабоды альбо найвышэйшага прасвятлення ўласнымі сіламі ці пры дапамозе звыш. Падобна і іншыя рэлігіі, якія сустракаюцца ў свеце, імкнуцца рознымі спосабамі задаволіць неспакойнае сэрца чала-

века, прапануючы шляхі; г. зн. вучэнні і правілы жыцця, а таксама сакральныя абрады.

Каталіцкі Касцёл не адмаўляе нічога, што ў гэтых рэлігіях ёсць праўдзівага і святога. Ён са шчырай павагай разглядае той спосаб дзеянняў і жыцця, тыя прадпісанні і вучэнні, якія, хоць і значна адрозніваюцца ад таго, што развівае і чаму навучае Касцёл, усё ж часам адлюстроўваюць промень той Праўды, якая асвячае ўсіх людзей. Сапраўды, Касцёл абвяшчае і заўсёды павінен абвяшчаць Хрыста — „дарогу, праўду і жыццё" (Ян 14, 6), у якім людзі знаходзяць паўнату рэлігійнага жыцця і праз якога Бог прымірыў усё з сабою.

Таму Касцёл заклікае сваіх дзяцей, каб праз дыялог і супрацоўніцтва з паслядоўнікамі іншых рэлігій яны разважліва і з любоўю, даючы сведчанне веры і хрысціянскага жыцця, прызнавалі, захоўвалі і падтрымлівалі тыя духоўныя і маральныя даброты, а таксама сацыяльна-культурныя каштоўнасці, якія ў іх знаходзяцца».

NA 3: «Касцёл з павагай ставіцца да мусульманаў, якія пакланяюцца адзінаму Богу, жывому і самаіснаму, міласэрнаму і ўсемагутнаму, Стварыцелю неба і зямлі, які размаўляў з людзьмі. Яны імкнуцца ўсёй душой падпарадкоўвацца Яго пастановам, нават патаемным, як падпарадкоўваўся Богу Абрагам, да якога ахвотна звяртаецца ісламская вера. Хоць яны не прызнаюць Езуса Богам, аднак ушаноўваюць Яго як прарока, ушаноўваюць таксама Яго Маці, Дзеву Марыю, а часам нават з пабожнасцю Яе заклікаюць. Акрамя гэтага, яны чака-

юць Суднага дня, калі Бог будзе справядліва ўзнагароджваць усіх уваскрослых людзей. Таму яны цэняць маральнае жыццё і пакланяюцца Богу асабліва праз малітву, міласціну і пост.

Паколькі на працягу стагоддзяў паміж хрысціянамі і мусульманамі ўзнікала нямала спрэчак і варожасці, Святы Сабор заклікае ўсіх забыць мінулае і шчыра імкнуцца да ўзаемаразумення, а таксама разам захоўваць і падтрымліваць на карысць усяго чалавецтва сацыяльную справядлівасць, маральныя каштоўнасці, спакой і свабоду».

Дагматычная канстытуцыя пра Божае Аб'яўленне *Dei verbum*

DV 25: «Акрамя таго, неабходна падрыхтаваць забяспечаныя адпаведнымі каментарыямі выданні Святога Пісання, дастасаваныя для ўжытку нехрысціянаў і іх умоваў, а пра іх распаўсюджанне няхай мудра клапоцяцца пастыры і хрысціяне кожнага стану».

Выбраная літаратура па рэлігіязнаўстве

Адзіночанка В. А. *Рэлігіязнаўства*: Вучэб. дапаможнік / В. А. Адзіночанка. Мінск: Універсітэцкае, 2001.

Верашчагіна А. У., Гурко А. В. *Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць* / А. У. Верашчагіна, А. В. Гурко. Мінск: Тэхналогія, 2000.

Индуизм / Авторы-сост. А. А. Грицанов, Т. Г. Румянцева. Минск: Книжный Дом, 2006.

Иоанн Павел II. *Верую в Духа Святого Господа Животворящего* (катехетические беседы) / Иоанн Павел II; пер. В. Данилова. Москва: Католический колледж им. св. Фомы Аквинского, 1998.

Иоанн Павел II. *Верую в Церковь Единую, Святую, Вселенскую и Апостольскую*: в 2 т. / Иоанн Павел II; пер. Е. В. Афанасьевой, С. Э. Карпенка. Москва: Католический колледж им. св. Фомы Аквинского, 2000.

Иоанн Павел II. *Мысли о земном* / Иоанн Павел II; пер. А. Кононова, В. Бурякова. Москва: Новости, 1992.

Иоанн Павел II. *Сочинения*: в 2 т. / Иоанн Павел II; пер. Е. Твердисловой, И. Баранова, А. Махова. Москва: Издательство францисканцев, 2003.

Иудаизм / Авторы-сост. В. А. Барановский, Ю. Н. Иванов. Минск: Книжный Дом, 2006.

Кимелев Ю. А. *Философия религии: Систематический очерк* / Ю. А. Кимелев. Москва: Nota Bene, 1998.

Луис Б. *Ислам и Запад* / Бернард Луис; пер. С. Кулланды. Москва Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 2003.

Павловский Я. *О Католической Церкви и других вероисповеданиях* / Янис Павловский. 2-е изд. Гродно: Гродн. Римкатол. епархия, 2002.

Протестантство / Авторы-сост. А. А. Грицанов, В. Н. Семенова. Минск: Книжный Дом, 2006.

Ратцингер Й. (Бенедикт XVI). *Вера — Истина — Толерантность: Христианство и мировые религии* / Йозеф Ратцингер (Бенедикт XVI); пер. Е. Верещагина. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 2007.

Ратцингер Й. (Бенедикт XVI). *Многообразие религий и единый завет* / Йозеф Ратцингер (Бенедикт XVI); пер. А. Петровой. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 2007.

Религиоведение: Энциклопедический словарь / Под ред. А. П. Забияко, А. Н. Красникова, Е. С. Элбакян. Москва: Академический проект, 2006.

Смерть и жизнь после смерти в мировых религиях / Сост. Джекоб Ньюзнер; пер. Г. Ястребова. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 2007.

Суттнер Э. *Христианство Востока и Запада: В поисках зримого проявления единства* / Эрнст Суттнер; пер. О. Величко. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 1999.

Традиционные вероисповедания и новые религиозные движения в Беларуси: Пособие для рук. учреждений образования, педагогов, воспитателей / сост. А. И. Осипов; под ред. А. И. Осипова. Минск: Беларусь, 2000.

Уко Х. *Иудеи и христиане: Общие корни и новые горизонты* / Ханс Уко; пер. Ю. Табака. Москва: Путь, 2000.

Учение о спасении в разных христианских конфессиях / Сост. А. Бодров. 2-е изд. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 2007.

Христиане и мусульмане: Проблемы диалога / Сост. А. Журавский. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 2000.

Христианство / Автор-сост. А. А. Грицанов. Минск: Книжный Дом, 2006.

Щедровицкий Д. В. *Сияющий Коран: Взгляд библеиста* / Д. В. Щедровицкий. Москва: Оклик, 2005.

Эко У., Мартини К. М. *Диалог о вере и неверии* / Умберто Эко, Карло Мария Мартини; пер. Н. Холмогоровой. Москва: Библейско-богословский институт им. св. апостола Андрея, 1997.

Язычество / Авторы-сост. А. А. Грицанов, А. В. Филиппович. Минск: Книжный Дом, 2006.

Ян Павел II. *Памяць і самасвядомасць: Размовы на пераломе тысячагоддзяў* / Ян Павел II; пер. К. Лялько. Мінск: Про Хрысто, 2006.

Ян Павел II. *Пераступіць парог надзеі: Ян Павел II адказвае на пытанні Вітторыё Мэссоры* / Ян Павел II; пер. К. Лялько. Рым – Люблін – Мінск, 1997.

Atłas T., *Ruch charyzmatyczny w Republice Konga i jego wpływ na kształtowanie życia osobistego i społecznego*, Warszawa 2005.

Auschwitz. Konflikty i dialog, red. M. Głownia, S. Wilkanowicz, Kraków 1998.

Bartnik Cz., *Społeczny wymiar religii*, „Ateneum Kapłańskie" 1978, 468, s. 291–302.

Biuletyn misjologiczno-religioznawczy, „Collectanea Theologica" od t. 38, 1968 do dzisiaj.

Bogucka E., *Buddyzm*, „Misyjne drogi" 1984, 2, z. 4, s. 30–33.

Bogucka E., *Hinduizm*, „Misyjne drogi" 1985, 3, z. 2, s. 42–47.

Bogucka E., *Islam*, „Misyjne drogi" 1985, 3, z. 1, s. 14–19.

Bogucka E., *Konfucjanizm*, „Misyjne drogi" 1985, 3, z. 3, s. 53–55.

Bogucka E., *Nowe religie*, „Misyjne drogi" 1983, 4, z. 3, s. 55–59.

Bogucka E., *Sintoizm*, „Misyjne Drogi" 1985, 3, z. 4, s. 56–59.

Bogucka E., *Tradycyjne religie plemienne*, „Misyjne drogi" 1986, 4, z. 1, s. 56–59.

Bronk A., *Język etnologii na przykładzie teorii religii W. Schmidta. Analiza metodologiczna*, Lublin 1974.

Bukowski K., *Religie ludów niepiśmiennych*, „Niedziela" 1988, nr 8, s. 4–5.

Bukowski K., *Współczesne religie a chrześcijaństwo*, cz. 1, Kraków 1986.

Chodzidło T., *Religie ludów pierwotnych*, „Znak" 1958, 10, z. 50–51, s. 939–954.

Chodzidło T., *Sektetariat dla Niechrześcijan*, „Ateneum Kapłańskie" 1969, 360, s. 131–139.

Chrostowski W., *Religie świata biblijnego*, „Przegląd katolicki" 1986, s. 44, 45, 47.

Copleston F. C., *Filozofie i kultury*, Warszawa 1986.

Czajkowski M., *Judaizm*, „Misyjne drogi" 1986, 4, z. 2, s. 48–53.

Dajczer T., *Inicjacje i ich wymiar kosmiczny u ludów Kalifornii*, Warszawa 1984.

Dajczer T., *Oryginalność chrześcijaństwa na tle innych religii*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 469, s. 363–378.

Dąbrowski E., *Religie Wschodu*, Poznań 1962.

Dialog międzyreligijny, red. H. Zimoń, Lublin 2004.

Dola K., *Chrześcijaństwo a inne religie*, „Gość Niedzielny" 1987, nr 30.

Dupre L., *Głębsze życie*, Kraków 1994.

Dupre L., *Inny wymiar*, Kraków 1991.

Działalność Instytutu Anthropos w dziedzinie lingwistyki, etnologii i religioznawstwa, red. H. Zimoń, Pieniężno 1980.

Eliade M., *Historia wierzeń i idei religijnych*, t. 1, Warszawa 1988.

Eliade M., *Joga. Nieśmiertelność i wolność*, Warszawa 1984.

Eliade M., *Sacrum, mit, historia*, Warszawa 1970.

Eliade M., *Traktat o historii religii*, Warszawa 1960.

Frankl V. E., *Homo patiens*, Warszawa 1984.

Gielata B., *Wartość zbawcza religii niechrześcijańskich*, „Ateneum Kapłańskie" 1969, 360, s. 68–76.

Gładkowski K., *Religioznawstwo w szkole*, „Niedziela" 1986, nr 15, s. 7–8.

Górski J., *Cierpienie a religie niechrześcijańske*, „Apostolstwo chorych" 1987, nr 1, s. 13–14.

Górski J., *Program nauczania religioznawstwa w szkole średniej*, „Okólnik duszpasterski" Katowice 1986, 6, s. 4–5.

Górski J., *Zasady inkulturacji w odniesieniu do mistyki chrześcijańskiej*, [w:] *Mistyka chrześcijańska. Materiały z sympozjum*, red. J. Machniak, Kraków 1995, s. 65–69.

Grabowski L., *Wielki Nieznany. Zarys religioznawstwa*, Płock 1983.

Griffits B., *Powrót do środka*, Warszawa 1985.

Griffits B., *Złota nić*, Kraków 1974.

Jan Paweł II, *Przekroczyć próg nadziei*, Lublin 1994.

Jerzmański H., *Kami-sama znaczy Bóg*, Warszawa 1986.

Judaizm, „Communio" 1995, 4.

Kamykowski Ł., *Cały Izrael*, Kraków 1996.

Kamykowski Ł., *Kościół wobec wielości religii*, „Tarnowskie Studia Teologiczne" 1994, t. XIII, s. 315–325.

Kapuścik F. Z., *Religie Afryki Zachodniej wobec współczesnych przemian*, Warszawa 1979.

Kłoczowski A., *Komu potrzebna religia, a komu religioznawstwo?*, „Niedziela" 1986, nr 50, s. 1, 4, 5.

Knaps S., *Pochodzenie religii*, „Przegląd Katolicki" 1986, nr 41, 42, 43.

Konior J., *Zagadnienie „grzechu" w kulturze chińskiej*, Kraków 2006.

Kopeć E., *Co to jest religia?*, „Zeszyty Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego" 1985, 1, s. 73–85.

Kościelniak K., *XX wieków chrześcijaństwa w kulturze arabskiej*, Kraków 2000.

Kowalak W., *Chrześcijańskie źródła religii synkretycznych*, „Ateneum Kapłańskie", 1987, 469, s. 421–432.

Kowalak W., *Kulty cargo na Nowej Gwinei*, Warszawa 1982.

Kowalak W., *Obrzędy kultowe afrykańskich religii synkretycznych*, [w:] *W służbie Słowa Bożego*, red. R. Malek, W. Wesoły, Płock 1978.

Kowalczuk S., *Marksizm o religii*, „Przegląd Katolicki" 1986, nr 43, s. 1–2.

Kowalczuk S., *Negacja religii — korzenie współczesnego ateizmu*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 468, s. 261–277.

Lanczkowski G., *Wprowadzenie do religioznawstwa*, Warszawa 1986.

Leeuw G. Van der, *Fenomenologia religii*, Warszawa 1978.

Leksikon religii, Warszawa 1994.

Lotz J. B., *Wprowadzenie w medytację*, Kraków 1983.

Łukaszuk R., *Religie niechrześcijańskie w ocenie teologii współczesnej*, „Ateneum Kapłańskie" 1969, 364, s. 247–259.

Malherbe M., *Religie ludzkości*, Kraków 1997.

Mbiti J. S., *Afrykańskie religie i filozofia*, Warszawa 1980.

Nagy S., *Dialog religii*, „Ateneum Kapłańskie" 1969, 364, s. 227–287.

Nossol A., *Religia a wiara*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 486, s. 253–260.

Olszewski D., *Szkice z dzieów kultury religijnej*, Katowice 1986.

Panikkar R., *Religie świata w dialogu*, Warszawa 1986.

Pawlik M. Z., *Buddyzm w spotkaniu z Objawieniem Bożym*, Warszawa 1987.

Pawlik M. Z., *Hinduizm — chrześcijaństwo. Akomodacja poglądów religijnych*, Warszawa 1986.

Pawlik M. Z., *O współczesnym zainteresowaniu hinduizmem — dyskusyjnie*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 468, s. 433–442.

Pawłowicz Z., *Człowiek a religia*, Gdańsk 1986.

Pawłowicz Z., *Kościół i sekty w Polsce*, Gdańsk 1996.

Pawłowicz Z., *Modlitwa i mistyka islamu a chrześcijaństwo*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 469, s. 407–420.

Pięć wielkich religii świata, red. E. Brunner-Traut, Warszawa 1986.

Religie w świecie współczesnym. Zarys problematyki religiologicznej, red. H. Zimoń, Lublin 2001.

Rogowski R., *Fascynacja religijnością Wschodu*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 469, s. 379–392.

Rusecki M., *Chrześcijańska interpretacja genezy religii*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 468, s. 234–252.

Rusecki M., *Filizofia a teologia religii*, „Gość Niedzielny" 1986, nr 47, s. 3, 4.

Rusecki M., *Naturalistyczne i ewolucjonistyczne teorie genezy religii*, „Ateneum Kapłańskie" 1987, 468, s. 214–233.

Rusecki M., *Religioznawstwo a religiologia*, „Gość Niedzielny" 1986, nr 45, s. 1, 4.

Sakowicz E., *Dialog Kościoła z religiami pozachrześcijańskimi w nauczaniu Jana Pawła II*, „Homo Dei" 1988, 1, s. 38–42.

Sakowicz E., *Religioznawstwo. Przewodnik tematyczny*, Lublin 2005.

Saux H. Le, Monchanin J., *Benedyktyński aśram*, Kraków 1986.

Sekty albo nowe ruchy religijne — Wyzwanie duszpasterskie, „L'Osservatore Romano" (wyd. polskie) 1986, nr 5.

Seweryniak H., *Misyjne wyznanie wiary, a nie dyskredytacja innych religii*, „Światło Narodów" 2000, 4, s. 5–16.

Siwek P., *Wieczory paryskie*, Londyn 1965.

Skowronek A., *Muzułmanie i chrześcijanie — partnerzy dialogu*, „Studia Theologica Varsaviensia" 1987, 25, nr. 2, s. 47–64.

Skrabania J., *Misjonarze Werbiści a Kościół narodowy na Filipinach w latach 1909–1951*, Warszawa 2003.



ISBN 978-985-6825-20-3

Кс. Ян Гурскі — СУСТРЭЧА З РЭЛІГІЯМІ